Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

# ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 30 (4525) 14 жніўня 2009 г.

## У нумары:

*«Слова doc»*

**СПБ падвёў вынікі рэспубліканскага конкурсу сярод маладых творцаў.**

Стар. 2

*Пошукі сапраўдных слоў*

**Агляд ліпеньскіх нумароў часопісаў «Полымя», «Нёман», «Маладосць».**

Стар. 7

*Набокаў застаўся беларусам*

**Ураджэнец мястэчка Любча, знаны дзеяч заходняй культуры лічыў Беларусь далёкай і недасягальнай.**

Стар. 11

*Дзе дзённікі Максіма Танка?*

**Некалькі версій адносна адкрытага на сёння пытання.**

Стар. 13

*На беражку памяці*

**Ці захаваем Цверскае лецішча беларускага жывапісца В. К. Бялыніцкага-Бірулі?**

Стар. 14

**ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.**

**Для індывідуальных падпісчыкаў:**
1 месяц — 7760 руб.
Падпісны індэкс — 63856

**Ведамасная падпіска:**
1 месяц — 10060 руб.
Падпісны індэкс — 638562

**Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў:** на 1 месяц — 5200 руб. Падпісны індэкс — 63815

**Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі:**
1 месяц — 7870 руб. Падпісны індэкс — 63880

*Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!*

**Здаецца, усе беларускія народныя казкі, дзе дабро, вытрымаўшы пакуты і выпрабаванні, перамагае зло, заканчваліся агульнавядомай прыказкай: "І я там быў, мёд-піва піў...". Дзеткі, змалку адораныя багатай фантазіяй, уяўлялі кубёлачкі мёду, доўгую бурштынавую стужачку цягучай вадкасці, якая няспешна ільецца з лыжачкі. А з маленства закладзены ў падсвядомасць казачны фінал аздабляў гэты сімвал дастатку і дабрабыту ўспамінам пра цудадзейнае выратаванне, Спас.**

# І пральецца сок расы нябеснай...

Сёння першы Спас, мядовы. Каторы ўжо год ён адзначаецца ў беларускай сталіцы супольна — дзякуючы акцыям, якія праводзяць розныя ўстановы. На вялікіх пляцоўках Мінска — перад Палацам спорту і Палацам мастацтва, ды шмат дзе яшчэ перад святам была наладжана дэгустацыя мёду новага ўраджаю. Ліпавага, грэчкавага, лугавога... Сталіца і гарады Беларусі як быццам ператварыліся гэтым часам у імправізаваную пасеку з сапраўднымі вуллямі.

— *Але менавіта да пчаляра з імем пойдзе пакупнік па бурштынавую смакату, як спрадвеку было прынята ў нашым краі,* — зазначае старшыня Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Беларускія пчаляры" Міхась Халадзінскі. Ён жа цяпер — старшыня Саюза грамадскіх аб'яднанняў беларускіх пчаляроў. Рупліўцы мядовай справы аб'ядналіся год таму, утварыўшы саюз на аснове чатырох з пяці дзеючых у краіне арганізацый — гэта Салігорскі "Бортнік", РГА "Беларускія пчаляры", РГА "Нектар" і Дубровенскае таварыства пчаляроў-аматараў. Аб'ядналіся, каб умацаваць пазіцыі пчаляроў дзеля развіцця галіны. Па ацэнках спецыялістаў, яе ўзровень у нашай краіне адстае ад больш паспяховых суседзяў. Прыкладам, колькасць пчоласем'яў на 1кв. км. плошчы ў Літве і Польшчы — каля двух-трох. Там пчолкі жывуць шчыльней. У нас у Беларусі, паводле звестак Міхася Халадзінскага, прыкладна адна сямейка шчыруе на квадратным кіламетры. Прычым, як патлумачыў Міхась Міхайлавіч, на пчаляра пчолка працуе ўсяго толькі 20 працэнтаў свайго "рабочага часу". Гэта тая частка карыснага прадукта, які пасля гаспадару ўдаецца сабраць з вулля: мёд, перга, праполіс. Больш за ўсё "залічваецца" пчале яе праца па апыленні пасеваў, кветак, садоў (астатнія 80 працэнтаў). "*У нас цяпер больш як 400 тысяч гектараў пасеваў рапсу. Для яго апылення неабходна б мець 800 тысяч пчоласем'яў. І калі на ўзроўні дзяржавы ставіцца задача павялічыць пасевы рапса, неабходна звярнуцца і да праблем пчаляроў*", — тлумачыць старшыня беларускага саюза.

Усе таварыствы беларускіх пчаляроў маюць невялікія ўзносы — акумулююць фінансавыя сродкі, якія дапамагаюць праводзіць тыя альбо іншыя мерапрыемствы, а тым, хто ў аб'яднаным саюзе — яшчэ і выходзіць на міжнародную сцяжыну. Добрыя стасункі ўсталяваліся цяпер з такім жа саюзам у Польшчы. "*Ездзім па свеце, цікавімся новымі тэхналогіямі,* — распавядае Міхась Халадзінскі. — *Закупляем тое, што ў Беларусі не вырабляюць. У асноўным — пчаляркі інвентар. Купляем медагонкі, сучасныя вуллі. Наш Негарэльскі завод выпускае іх, але ў невялікай колькасці і несучасныя.*" А Польшча, да прыкладу, перайшла на выкарыстанне палістырольных вулляў. Яны лёгкія і мабільныя. Так званае "качэўе вулляў" — справа ў сучасным свеце прыбытковая. У сёлетняе дажджлівае надвор'е ў выйгрышы апынуліся тыя пчаляры, якія змаглі перавезіць свае вуллі бліжэй да меданосаў. Стацыянарныя пасекі сталіся неэфектыўнымі. На жаль, ці на шчасце — мы свой мёд не вывозім, яго вязуць нам, у тым ліку і на выстаўкі. Хаця, па маіх асабістых назіраннях, купляюць больш мёд усё-такі свой, айчынны. Асабліва шматлюдна ля пчаляроў у вышытых беларускіх кашулях.

Дзе ж цяпер можна прачытаць пра старадаўні беларускі занятак, бортніцтва? Выбар літаратуры, на жаль, невялікі. Праўда, саюз заснаваў часопіс "Беларускі пчаляр", ён зарэгістраваны ў Міністэрстве інфармацыі Беларусі і пачне выходзіць з наступнага года.

Сёлета выйшла кніга "Асновы пчалярства", яна створана ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце пад рэдакцыяй В. М. Капліча. У кнізе змешчана гісторыя развіцця бортніцтва ад пачатку да нашых дзён. У Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны выйшлі рэкамендацыі беларускім пчалярам. Чатыры гады таму грамадскаму аб'яднанню ўдалося на вучэбнай базе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання заснаваць народны універсітэт, дзе б маглі вучыцца пчаляры-аматары. За гэты час праз універсітэт прайшлі не менш як 60 пчаляроў. Існуюць адпаведныя курсы на базе Гродзенскага аграрнага універсітэта, заснаваныя сумесна з РУП "Беларускае пчалярства", якія наведваюць тыя, хто працуе ў штаце пасек СПК альбо ў лясгасах.

Вось такі сучасны стан нашага старадаўняга занятку — бортніцтва. Яно дорыць нам не толькі смачны пачастунак, а яшчэ і здароўе. "Мёд ёсць сок расы нябеснай", — паэтычна напісана ў адным са старажытных рукапісных лячэбнікаў. Сапраўды, яго гаючыя ўласцівасці добра вядомыя кожнаму.

А ў царкве гэты дзень мае яшчэ назву свята вынясення слаўных дрэў Жыватворнага Крыжа Гасподняга. Здаўна ў Канстанцінопалі ўсталяваўся такі звычай — у летнюю жнівеньскую спёку выносіць з храма крыж на дарогі і вуліцы дзеля асвячэння месцаў і прадухілення хваробаў.

Цяпер у гэты дзень крыж выносяць з алтара ў цэнтр храма, яго можна пацалаваць з надзеяю на ацаленне. У гэты дзень асвячаюць ваду і мёд новага збору. Лічыцца, што як і крыж, асвечаны мёд таксама даруе ацаленне ўсім, кто яго ўжывае.

**Ірына ТУЛУПАВА**
***Фота Кастуся Дробава***

## Пункцірам

● У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрыты тэставы доступ да базы даных "Беларусь у асобах і падзеях". Універсальная беларусазнаўчая база даных уключае звесткі пра людзей, жыццё і дзейнасць якіх былі звязаны з нашай краінай, пра найбольш важныя падзеі, перыядычныя выданні, арганізацыі і ўстановы, населеныя пункты Беларусі. Тэставая інфармацыя дапоўнена ілюстрацыйным матэрыялам. Доступ да базы даных "Беларусь у асобах і падзеях" магчымы толькі з будынка Нацыянальнай бібліятэкі.

● Каля Ваўкавыска закончыліся археалагічныя раскопкі. Экспедыцыю кафедры археалогіі і этналогіі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы ўзначальваў дацэнт Генадзь Семянчук. На паўднёвы захад ад ваўкавыскага замчышча былі знойдзены рэшткі хрысціянскіх могілак XIII — XV стагоддзяў. У 1950-х побач з гэтым месцам археолагі раскапалі падмуркі і рэшткі сценаў хрысціянскага храма, які датаваўся канцом XII — пачаткам XIII стагоддзя. Гэта дае падставы казаць пра тое, што знойдзены могільнік функцыянаваў разам з храмам да канца XV стагоддзя, калі завяршыўся працэс пераносу горада на бераг ракі Ваўкавыя.

● У гарадскім пасёлку Любча Навагрудскага раёна з 17 па 30 жніўня пройдзе валанцёрскі асветніцка-рэстаўрацыйны летнік. Акрамя рэстаўрацыі Любчынскага замка валанцёры змогуць павандраваць па наваколлі і атрымаць веды па захаванні гістарычна-культурнай спадчыны. Праграма летніка прадугледжвае правядзенне заняткаў па захаванні помнікаў археалогіі, архітэктуры, горадабудаўніцтва і культурных ландшафтаў. Заняткі будуць праводзіцца дасведчанымі архітэктарамі-рэстаўратарамі. Запрашаюцца ўсе жадаючыя.

● Расійскі сцэнарыст і кінарэжысёр Аляксандр Міндадзе сумесна з Нацыянальнай кінастудыяй "Беларусьфільм" рыхтуецца да здымкаў фільма, прысвечанага 25-й гадавіне Чарнобыльскай трагедыі. Пра гэта паведамляе БелТА. Галоўны герой фільма — малады сакратар гаркама партыі. Ён становіцца сведкам катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Перад ім паўстае маральны выбар: ратаваць людзей і горад альбо выконваць загад партыі і не сеяць паніку. Прэм'ера кінакарціны запланавана на 2011 год.

● Дэтэктывы пісьменніцы Вольгі Тарасевіч будуць экранізаваны ў Беларусі. Працай над стварэннем фільмаў будзе займацца Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія. Для экранізацыі выбраны кнігі "Без чайных церемоний", "Ожерелье Атона", "Проклятье Эдварда Мунка", "Смертельный аромат № 5", "Плачущий ангел Шагала". Ужо зацверджаны сцэнарыі пяці двухсерыйных фільмаў. Здымкі пачнуцца сёлета. Прэм'ера першых серый запланавана на пачатак наступнага года.

● 22-23 жніўня ў Чарнігаве (Украіна) пройдзе рок-фестываль Be-Free. Фэст быў створаны тры гады таму. Яго мэта — сабраць аматараў рок-музыкі з памежных з Украінай краін: Беларусі, Расіі, Польшчы. Такі крок павінен спрыяць наладжванню прыватных сувязяў паміж жыхарамі гэтых краін. А музыка выступае толькі пасрэднікам паміж людзьмі. Удзел у фестывалі возьмуць беларускія гурты Relikt, B:N, ZATOCZKA, Partyzone, Pomidor/OFF, Znich, Ляпис Трубецкой, Glofira, Tarpach, Hair Peace Salon, LitvinTroll, Imprudence, ULIS, а таксама Vladivostok (Францыя), Zero-85 (Польшча), Воплі Відаплясава (Украіна).

**Падрыхтаваў Павел РАДЫНА**

## Падзея

# «Слова doc»

**Такая афіцыйная назва конкурсу сярод маладых творцаў, які праводзіўся сёлета ўпершыню. Яго заснавальнікам выступае Саюз пісьменнікаў Беларусі. Узроставы цэнз удзельнікаў — да 30 гадоў. Конкурс быў аб'яўлены пры канцы мінулага года, а нядаўна — падведзены яго вынікі.**

"Слова doc" — зразумела, што гэта ў першую чаргу звязана з выкарыстаннем магчымасцей Інтэрнэта, — патлумачыў старшыня журы, першы сакратар СПБ Віктар ПРАЎДЗІН. — І, сапраўды, усё зроблена так, каб нам маглі дасылаць допісы вельмі проста, націснуўшы некалькі клавіш, з любога куточка Беларусі".

На конкурс было даслана 180 прац, 50 з іх вылучаны на атрыманне тых ці іншых узнагарод. Узровень майстэрства маладых вызначаўся па пяці асноўных намінацыях: "малая проза" (пераважна апавяданні), "вялікая проза"(аповесці, раманы), "паэзія", "дзіцячая літаратура" і "драматургія". "Гэта кірункі, якія найбольш прывабліваюць і маладых, і сталых літаратараў, якія без свайго ўдзелу ў літаратурным працэсе не бачаць свайго месца ў жыцці", — падкрэсліў Віктар Аляксандравіч.

У намінацыі "малая проза" першае месца прысуджана Андрэю Башлакову за цыкл навел. Другую прэмію ў гэтай намінацыі атрымае Марыя Сямашка за аповесць "Паліна". Трэцяя прэмія — у Юрыя Рачынскага за апавяданне "Бессмертие". У намінацыі "малая проза" таксама адзначаны творы Паўла Анціпава, Дар'і Вашкевіч, Ксеніі Вяцкай, Вольгі Волкавай, Кірылы Дубоўскага, Кірыл Дунца, Яўгена Малевіча, Юліі Ражэх — яны будуць адзначаны дыпломамі.

У намінацыі "вялікая проза" члены журы да агульнай высновы не прыйшлі, кандыдаты на 1 і 3 месцы не вызначаліся, а 2 месца атрымала Таццяна Зайчанка за аповесць "Алмаз", Антон Гансалес узнагароджаны дыпломам. Найбольш прадстаўнічая намінацыя — "паэзія". Дыплом I ступені і першая прэмія аддадзены Марыі Маліноўскай. Дыпломам II ступені адзначана Ганна Гарбунова. Трэцяе месца — у Ірыны Повх. Адзначаны таксама вершы Алены Андрэйчанкі, Ірыны Карэлінай, Алы Зайцавай, Веранікі Кашкан, Вольгі Сяліцкай, Марыі Захаранкі, Таццяны Луцэвіч, Надзеі Грыцкевіч, Яніны Мароз, Антона Мяхоўскага, Таццяны Ярашэвіч, Лявона Волка.

У намінацыі "дзіцячая літаратура" ўладальнікам дыплома I ступені і прэміі стаў Павел Капанскі. Дыплома II ступені — Таццяна Дзямідовіч, III ступені — Любоў Радкевіч. Адзначаны Надзея Васіленка, Вольга Пацэйковіч, Кацярына Дударчык, Кацярына Мядзведзева, Алена Казімірская, Віялета Ларычава.

У намінацыі "драматургія" першае месца атрымала Таццяна Балыка. Яе імя ў літаратуры не новае, яна — член СПБ, але па ўзросце якраз падыходзіць. Членам журы вельмі спадабалася творчасць і Наталлі Трызны.

Сярод канкурсантаў працэнтаў 60-70 піша на дзвюх мовах — і рускай, і беларускай. "Мне хацелася б, каб пісалі болей па-беларуску, — падкрэсліў Віктар Праўдзін. — Але, напэўна, як чалавек адчувае сябе, у якіх варунках дзейнічае, так думае і піша, і можа лепш адлюстраваць свае пачуцці, выпісаць сюжэт. Тым больш, мы маем шмат прыкладаў, калі пачынаючы пісаць на адной мове, пераходзяць на родную. Янка Купала пачынаў пісаць папольску, па-руску, а потым прыйшоў да беларускай..."

Пераможцам будзе прадстаўлена магчымасць надрукавацца, усе яны занесены ў базавы рэестр СПБ.

Да ведама: на сённяшні дзень у СПБ запланаваны да выдання два альманахі "Беларусь маладая": паэтычны і альманах прозы. Працуюць над імі Міхась Башлакоў і Алесь Бадак — як старшыня савета па працы з маладымі.

Узнагароды ж пераможцам будуць уручацца ў канцы верасня альбо пачатку кастрычніка.

**Ірына ТУЛУПАВА**

***На здымку: старшыня журы В. Праўдзін.***

## Памяць

**65-годдзю вызвалення Магілёўскай вобласці ад нямецка-фашысцкіх акупантаў прысвечана навуковапапулярнае выданне "Вызваленне: ад Хоцімска да Магілёва і Бабруйска. (Верасень 1943 года — чэрвень 1944 года)", якое ўбачыла свет у 2009 годзе ў Магілёўскай абласной друкарні імя Спірыдона Собаля.**

# Па вызваленай тэрыторыі

У кнізе ў храналагічнай паслядоўнасці даступна і дакладна вядзецца аповед аб тых трагічных днях, калі воіны Чырвонай Арміі вызвалялі адзін за другім гарады і раёны Магілёўшчыны. Аўтар кнігі — Мікалай Барысенка, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, краязнаўца, вядомы шырокаму колу чытачоў па дакументальных кнігах "Старонкі вызвалення Магілёва: год 1944-ы" (2004), "Дняпроўскі рубеж: трагічнае лета 1944-га года" (2005), "Магілёўшчына — мой любы Прыдняпроўскі край",(2004;2007) ды іншыя.

Якая выкарыстоўвалася тэхніка, колькі байцоў было ў тым або іншым вайсковым злучэнні, дзе знаходзіліся ў самыя адказныя моманты камандзіры, якія меры прымалі ў такіх складаных сітуацыях? На гэтыя і шматлікія іншыя пытанні ўжо з першых старонак чытач знойдзе вычарпальны адказ, а аўтар павядзе нас далей па вызваленай тэрыторыі, называючы гарады і вёскі, час і страты, паказваючы зверствы фашыстаў і радасць людзей, якія сустракалі вызваліцеляў.

З раздзелаў кнігі чытач даведаецца пра дзевяцімесячнае стаянне фронту на рацэ Проня, пра баявое хрышчэнне Войска Польскага пад вёскай Леніна Горацкага раёна, подзвігі вызваліцеляў у баях за Лудчыцкую вышыню на Быхаўшчыне. У храналагічным парадку аўтар працягвае расказваць пра Магілёўскую наступальную аперацыю, падчас якой былі вызвалены Чавусы, Горкі, Шклоў, Магілёў, Быхаў, Круглае, Бялынічы.

Завяршаецца выданне змястоўным матэрыялам аб дзейнасці Магілёўскай абласной арганізацыі ветэранаў вайны і працы, якая была створана ў сакавіку 1987 года. Ветэраны Магілёўшчыны сапраўды робяць вельмі многае для патрыятычнага выхавання моладзі, увекавечвання памяці загінуўшых абаронцаў Радзімы.

**Мікола ХОБАТАЎ**

# Чарговы прыпынак

## Традыцыі

**Ужо традыцыйнымі для сяброў абласнога народнага клуба самадзейных паэтаў і кампазітараў "Жывіца", што працуе пры абласным цэнтры народнай творчасці, сталі паездкі з канцэртамі ў раёны Міншчыны. Геаграфія падарожжаў немалая. Гэта Узда, Мар'іна Горка, Заслаўе, Вілейка, Стоўбцы, Нясвіж, Клецк.**

Сёлета сябры клуба былі гасцінна прыняты на Валожыншчыне, пазнаёміліся з яе багатай гісторыяй, з творчасцю прадстаўнікоў літаратурна-мастацкага аб'яднання "Рунь", кіраўніком якога з'яўляецца член Саюза пісьменнікаў Беларусі Валянціна Гіруць-Русакевіч. Наведалі магілу пачынальніка беларускай драматургіі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, які пахаваны ў вёсцы Тупальшчына Валожынскага раёна; месца былой сядзібы славутага творцы ў вёсцы Малая Люцінка.

У раённым цэнтры культуры і адпачынку адбыўся канцэрт клуба "Жывіца", які складаўся з некалькіх тэматычных частак. Распачала канцэрт барысаўчанка Валянціна Белаброўская сваёй песняй "Прывітальная". Прыхільна сустрэлі гледачы творы аб Радзіме Настассі Азаркі (Нясвіж), Аляксандра Кулака (Валожын), Сяргея Верамеева і Уладзіміра Цынуніна (Вілейка), Тамары Кашчавай (Дзяржынск). Шырока, праз творчасць Алены Радкевіч (Пухавічы), Галіны Нічыпаровіч (Клецк), Соф'і Любанец (Нясвіж), Дзмітрыя Краскоўскага (Валожын), была прадстаўлена тэма Вялікай Айчыннай вайны. І, безумоўна, не абышлося без шчырых песень і вершаў аб каханні, добрага гумару. Праводзіла канцэрт пастаянная вядучая клуба "Жывіца" Алена Радкевіч.

**Валянціна ШЧАРБАКОВА**

# Шведская проза па-беларуску

## Прэзентацыі

**У Палацы мастацтва адбылася прэзентацыя зборніка "Сучаснае шведскае апавяданне". Кніга выйшла ў выдавецтве "Таліяфры" накладам трыста асобнікаў.**

У зборнік увайшло чатырнаццаць апавяданняў і навел дванаццаці сучасных шведскіх пісьменнікаў. Прадмову "Мастацтва навелістыкі ў Швецыі: гісторыя і сучаснасць" падрыхтаваў кандыдат філалагічных навук Даніэль Мёлер (Універсітэт Лунда, Швецыя). У канцы зборніка дадзены кароткія біяграфічныя звесткі пра аўтараў, прозу якіх пераклалі студэнты Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта. Рэдагаваў зборнік Валянцін Акудовіч. Гэта першае выданне падобнага кшталту.

Укладальнік зборніка Вольга Цвірка прызналася: "Такіх спецыялістаў, хто валодаў бы шведскай і беларускай мовай і ў дадатак быў яшчэ і літаратарам, практычна няма. Таму гэта больш аматарскі праект. Што тычыцца тэкстаў, то мы атрымалі іх спіс ад радыё "Культура Швецыі", і далі магчымасць перакладчыкам самім выбіраць творы».

Перад прысутнымі выступіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь Стэфан Эрыксан, які вылучаецца з усяго акрэдытаванага дыпламатычнага корпуса выдатным веданнем беларускай мовы, а таксама дырэктар Цэнтра шведскіх даследаванняў Мортэн Франкбю. Далі слова і самім перакладчыкам — яны прачыталі невялікія ўрыўкі з надрукаваных навел.

**Анатоль КУДЛАСЕВІЧ**

## Лучнасць

# Сядзіба натхнення

**Мерапрыемствы, прымеркаваныя да 165-годдзя з дня нараджэння мастака Ілы Рэпіна, прайшлі на яго сядзібе ў Здраўнёва.**

Сядзібу майстар набыў у 1892 годзе і шмат чаго зрабіў па яе перапланіроўцы. Менавіта па эскізах мастака пабудавалі сядзібны дом. Сама назва Здраўнёва вельмі падабалася яго знанаму гаспадару. Не раз ён гаварыў: "Тут здаровае паветра, нібы само здароўе". Маляўнічыя мясціны на правым беразе Заходняй Дзвіны, дзе размяшчалася сядзіба, вабілі сваёй прыгажосцю. Тут Майстра знаходзіў натхненне, напісаў больш як 60 карцін і малюнкаў.

Непадалёк ад сядзібы на могілках прыходскай царквы ў в. Слабада пахаваны бацька І. Рэпіна.

З нагоды ўрачыстасцей гасцямі філіяла Віцебскага краязнаўчага музея — мастацкага музея сталіся аматары творчасці І. Рэпіна, мастакі, аматары гісторыі, краязнаўцы. Гэтымі днямі ў рэпінскай сядзібе пачала працаваць летняя школа юных мастакоў.

Сярод найбольш каштоўных экспанатаў, якія захоўваюцца ў фондах абласнога краязнаўчага музея, — рэпінскія акварэлі, малюнкі, абразы, напісаныя для Слабадской царквы, а таксама фотаздымкі, пісьмы, кнігі.

Але галоўнае — музею падаравалі дзве копіі карцін мастака, якія знаходзіліся ў Траццякоўскай галерэі ў Маскве. Яшчэ шэсць лічбавых копій музею перадалі ад Расійскай Федэрацыі і Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў-удзельніц СНД крыху раней.

**Ярына РЫТАМІНСКАЯ**

## З нагоды

**Мінскае выдавецтва "Рыфтур" настойліва і грунтоўна займаецца стварэннем гісторыка-краязнаўчага партрэта Айчыны. І робіць гэта найперш — праз выпуск турыстычных даведнікаў. Невялікія па памеры, яны звычайна багата ілюстраваныя, дастаткова грунтоўна насычаныя фактаграфічным матэрыялам.**

# Ляхавічы і ваколіцы

З краязнаўчых навінак, якія дапамагаюць ажыццявіць сапраўднае турыстычнае падарожжа, — даведнік "Ляхавіцкі раён. Сцежкамі роднага краю". Аўтар — краязнаўца С. Чарановіч. Ёсць, праўда, пазнака: "Тэкст падрыхтаваны пры ўдзеле Л.В. Беразоўскага". Мастацкае афармленне, фотаздымкі належаць таксама С. Чарановічу. 38 старонак невялікай фарматам брашуры ўмяшчаюць 69 ілюстрацый . Як правіла — фотаздымкаў. Дзе ж тады тэкст? Але вёрстка, дызайн выдання дазваляюць і гэтую лаканічную плошчу выкарыстоўваць ашчадна. Тэкст уяўляе сабою сімпатычны гістарычна-краязнаўчы нарыс, у якім распавядаецца пра Ляхавічы, пачынаючы ад першых звестак пра паселішча ў гістарычных крыніцах і да XVII стагоддзя, а таксама пра найболей цікавыя паселішчы Ляхавіччыны: Флер'янова, Падлессе, Грушаўку, Савейкі, Начу, Начу Свянціцкую, Мядзведзічы, Рэпіхава... Асобны аповед — "Лінія абароны на рацэ Шчара".

Сярод іншых артыкулаў вылучаецца расповед пра Грушаўку. Гэта сапраўды легендарнае паселішча, якое знаходзіцца за 1,5 км ад Ляхавіч. Шырокую вядомасць вёска атрымала дзякуючы Тадэвушу Рэйтану. Вось што піша С. Чарановіч: "Шырокую вядомасць Т. Рэйтан набыў за сваю дзейнасць у якасці пасла на сейм 1753 года, што праходзіў у Варшаве. Сейм збіралі з мэтай узаконіць першы падзел Рэчы Паспалітай.

Т. Рэйтан выступае супраць прыняцця падобнага рашэння, звяртаецца да дэпутатаў з прамовай, накіраванай супраць здраднікаў Айчыны. Яго заклік не знайшоў падтрымкі дэпутатаў сейма, большая частка якіх была падкуплена пасламі тых дзяржаў, якія ажыццяўлялі падзел Рэчы Паспалітай. Аднак рашучы пратэст Т. Рэйтана, яго шчырая, самаахвярная пазіцыя, выклікалі павагу нават сярод яго праціўнікаў.

Вялікае фізічнае і нервовае напружанне не прайшло без следу. Падзел дзяржавы ўспрымаўся Рэйтанам як асабістая драма. Вярнуўшыся ў Грушаўку, Тадэвуш цяжка захварэў. 8 жніўня 1780 года яго не стала...".

Звычайна атрымліваецца, што праз смугу сівых стагоддзяў даходзяць да нас гераічныя жыццяпісы военачальнікаў, славутых магнатаў, уладароў, якія далёка не заўсёды спрыялі прагрэсу і развіццю. А вось грамадзянская мужнасць, палітычная сумленнасць як характарыстыкі годнасці часцей знікаюць некуды бясследна, не становяцца прадметам пільнай увагі наступнікаў. Шчаслівае выключэнне — у апошнія гады часцей сталі ўзгадваць Т. Рэйтана. С. Чарановіч узнаўляе яго далёкае ад нас жыццё на фоне расповеда пра Грушаўку. Краязнаўчы нарыс месцамі ўяўляе сабою эмацыйнае, адухоўленае эсэ. Моўныя фарбы, дакладныя параўнанні і вобразы дазваляюць чытачу патрапіць у атмасферу тае гістарычнай, радзімазнаўчай асалоды, якая ахутвае нас у сядзібе Рэйтанаў. Родавая капліца, мураванка, у якой жыў пасол на сейм 1753 года, старая алея з лістоўніц... "Здаецца, у алеі ёсць таямнічы, містычны сэнс. У міфалогіі многіх народаў хваёвыя пароды лічацца як бы лесвіцай, па якой душа нябожчыка падымаецца на нябёсы. Алея каля капліцы сімвалізуе сабой лесвіцу, па якой вядзе шлях ад зямнога быцця чалавека да новага, нябеснага жыцця...."

Нарыс "Ляхавіцкі раён. Сцежкамі роднага краю" вылучаецца сярод літаратуры падобнага кшталту. Прыцягальным падаецца і тое, што кніжачка выдадзена на беларускай мове. Часцей усё ж турыстычная літаратура друкуецца па-руску. Шкада, што наклад у нарыса С. Чарановіча — усяго толькі 700 асобнікаў. Відавочна, што кніга ўся ці амаль уся застанецца ў Ляхавіцкім райвыканкаме, які і з'яўляецца фундатарам праекта. Мо нават і ў кніжны гандаль не патрапіць.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА**

# Энергія «Унутранага руху»

## Выставы

**Днямі ў музеі Максіма Багдановіча адкрылася персанальная выстава маладога мастака Захара Кудзіна, якая мае назву "Унутраны рух". На адкрыцці экспазіцыі прысутнічалі родныя і сябры Захара, яго настаўнікі і тыя, каму цікава пазнаёміцца з творчасцю маладога перспектыўнага мастака. Аўтар прадставіў работы, над якімі працаваў апошнія два гады. Гэтыя творы з'яўляюцца вынікам эмацыйнага пераасэнсавання свету праз мастацкую мову абстрактнага экспрэсіянізму. Стварэнне кожнай новай карціны для мастака — гэта вынік пастаяннага творчага працэсу і сузірання навакольнага свету. Сам аўтар прадставіў свае творы так:**

— Унутраны рух — гэта эмоцыя. Увогуле эмоцыя можа быць любой, толькі не роўнай нулю. Гэтай здольнасцю рэагаваць на штосьці і патрабаваць у сваю чаргу рэакцыі надзелены кожны чалавек. Эмоцыі могуць адлюстроўвацца ў фарбах, гуках, колерах, руху. З дапамогай гэтых сродкаў яны набываюць форму.

На пытанне, што натхняе мастака на стварэнне карцін, Захар адказаў лаканічна: "Уражанні пражытых дзён мазкамі кладуцца на палатно. Так атрымліваецца новы твор.".

Творчы метад Захара Кудзіна — гэта дынамічная медытацыя, перформанс, часцей спантанны і інстынктыўны. У творах, прадстаўленых на выставе, на першы план выходзяць колер і рытм.

Трэба адзначыць, што ні адна карціна, з прадстаўленых на выставе, не мае назвы. Мастак тлумачыць гэта тым, што не хоча навязваць гледачам сваё бачанне. Ён заклікае кожнага наведвальніка экспазіцыі паглядзець на твор і ўбачыць на палатне тое, што падкажа фантазія, асабісты светапогляд, унутраныя адчуванні і эмоцыі.

Госці пацікавіліся, ці мае малады творца асобную майстэрню і як яна выглядае. Захар адказаў: "Асобнага памяшкання пакуль што не маю. Над карцінамі працую ў сваім пакоі, які і ператварыў у своеасаблівую майстэрню".

Першымі, хто пабачыў карціны Захара Кудзіна ў экспазіцыйнай зале, былі, канечне ж, супрацоўнікі музея. Дырэктар музея Максіма Багдановіча Таццяна Шэляговіч падчас адкрыцця выставы расказала пра свае добрыя ўражанні, якія склаліся ад прагляду карцін маладога мастака.

Сваімі меркаваннямі падзялілася і супрацоўніца музея Ірына Шорац, якая выступіла з прадмовай да адкрыцця выставы:

— Для мастакоў і мастацтвазнаўцаў тэхніка абстрактнага экспрэсіянізму добра знаёмая. Карціны мастакі ствараюць хутка, малююць на вялікіх палотнах з выкарыстаннем негеаметрычных штрыхоў, вялікімі пэндзлямі. І ўсё гэта робіцца для поўнага выяўлення эмоцыі. Для абывацеляў ці аматараў гэты від мастацтва можа вымярацца словамі: падабаецца ці не падабаецца. Дарэчы, у абстрактным экспрэсіянізме ёсць свае правілы і межы, але яны не перашкаджаюць раскрывацца эмоцыям аўтара, а наадварот, адлюстроўваюць псіхалагічны стан мастака. У гэтым і заключаецца сэнс выявы. Гэта адчуваеш, калі разглядаеш работы Захара.

Выстава чакае наведвальнікаў кожны дзень да 20 жніўня ўключна, акрамя нядзелі, з 10 да 17 гадзін па адрасе: г. Мінск, вул. М. Багдановіча, 7а.

Захар Кудзін нарадзіўся ў сталіцы, скончыў Мінскае дзяржаўнае мастацкае вучылішча імя А.К. Глебава. "Унутраны рух" — гэта ўжо другая персанальная выстава дваццацітрохгадовага мастака. Першая праходзіла ў Пасольстве Чэхіі. Захар браў удзел у выставах з 2005 года. Сярод іх пленэры, прысвечаныя Язэпу Драздовічу і Уладзіміру Караткевічу, выстава "Сакавіцкія каты", Рэспубліканская выстава "Партрэт у графіцы, жывапісе і скульптуры" ды іншых.

**Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ**

***На здымку: Захар Кудзін.***

***Фота аўтара***

# У сучаснай плыні

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося ўрачыстае адкрыццё выстаўкі італьянскай графікі. Гэтую падзею можна смела назваць значнай і асаблівай, таму што ўпершыню ў Беларусі акрамя твораў ужо знаёмых італьянскіх мастакоў прадстаўлены творы Джорджыо дэ Кірыка, Энрыка Мастраякі, Рыкарда Бенвенуці.

На выстаўцы можна ўбачыць і тэматычныя, і абстрактныя кампазіцыі, і чароўныя жаночыя партрэты, і старажытных рыцараў, і міфалагічных герояў.

"Я думаю, што мы з вамі заслугоўваем, каб нас акружала сапраўдная, высокая культура, каб мы з дзяцінства ведалі, што гэта частка нас — той жа Сальвадор Далі ці Джорджыо дэ Кірыка — як і нашыя знакамітыя мастакі, — падзяліўся сваім меркаваннем мастак, куратар выставак і мастацкіх праектаў, загадчык аддзела галерэйна-выставачнай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Фёдар Ястраб. — Мы павінны ведаць і другіх мастакоў графікі. Мы ніколькі не прыніжаем наша мастацтва. Мы толькі хочам, каб наша мастацтва не дзесьці з боку было, а каб яно было побач з еўрапейскім мастацтвам, каб яно перапляталася з ім, каб яно было

арганічнай часткай мастацкіх працэсаў, якія ідуць у свеце..."

У сваім выступленні народны мастак Беларусі і СССР Георгій Паплаўскі адзначыў: "Падсвядомая творчасць вельмі своеасаблівая і не заўсёды зразумелая, калі чалавек упершыню сустракаецца з падобным. Лічу, што для нашай моладзі і нашага гледача карысна сутыкацца з гэтым падсвядомым поглядам на свет".

**Ілона КУПРЭЙЧЫК**

***На здымку: Фёдар Ястраб.***

***Фота аўтара***

# Бачыць прыгажосць

У цэнтральнай раённай бібліятэцы старажытнага Навагрудка адбылася персанальная выстава мясцовага мастака — жывапісца з вёскі Купіск Віктара Залаціліна.

На адкрыцці выставы прысутнічалі студэнты і школьнікі, педагогі, супрацоўнікі раённага аддзела культуры і работнікі культустаноў горада, мясцовыя мастакі ды аматары жывапісу.

У прэзентацыі прынялі ўдзел старшыня Навагрудскага райвыканкама А. Кулак, старшыня райсавета С. Чубрык, дырэктар Дома-музея Адама Міцкевіча М. Гайба і інш.

Першая выстава майстра адбылася таксама ў Навагрудку, у Доме-музеі Адама Міцкевіча. Творцу запрашалі да сябе галерэя "Славутыя майстры" (г. Мінск), галерэя Тызенгауза (г. Гродна).

Летась працы мастака выстаўляліся ў галерэі Белдзяржуніверсітэта фізічнай культуры. Выстава мела назву "Ад родных вытокаў" і дэманстравала краявіды Куписка Прынямоння.

Карціны Віктара Залаціліна знаходзяцца ў прыватных калекцыях у Мінску, Кіеве, Маскве, Рызе,Таліне, Фінляндыі, ЗША, Германіі, Кітая.

**Яўген ЛАПЦЕЎ**

## З-пад пяра

*Творчае аб'яднанне "Алімп"* пры Слуцкай раённай бібліятэцы бесперапынна дзейнічае 26 гадоў. Для многіх соцень чалавек яно стала выратаваннем ад адзіноты, узбагаціла духоўна. Зорка гасцёўні загарэлася на культурным небасхіле дзякуючы былому дырэктару цэнтральнай гарадской бібліятэкі Тамары Шахновіч, а пра тое, каб гасцям было цікава, клапацілася шмат гадоў былая загадчыца аддзела абслугоўвання Мая Казека. Музычным аздабленнем вечароў, сустрэч у "Алімпе" займаліся Вольга Андрушчанкава, Таццяна Любімава, Наталля Пяцко, а таксама салістка Ірына Грынюк і выканаўцы старадаўніх рускіх рамансаў Алена і Уладзімір Кожухі.

На "Алімпе" прайшлі сустрэчы з паэтам Андрэем Скарынкіным, кінасцэнарыстам Алегам Буркіным, літаратурным аб'яднаннем "Случ", адбылася прэзентацыя кнігі Яўгена Гучка "Формула травы" і многія іншыя. Пастаянныя наведвальнікі гасцёўні — мастак Уладзімір Садзін і педагог мастацкай школы, краязнаўца Ігар Ціткоўскі.

Нядаўна пад назвай "Я сэрцам пішу сваю кожную песню" адбыўся музычны вечар з эстраднымі спевакамі Аксанай і Аляксандрай Казлоўскімі.

**Галіна ПЕНЯЗЬ**

*Міжнародная Ліга Інстытута СНД* упершыню правяла ў Маскве І Міжнародныя гульні інтэгрыраванага КВЗ (інвалідаў з неінвалідамі) "Свет без межаў!", прызнаныя унікальным сацыяльна значным праектам, на рэалізацыю якога быў выдзелены грант Прэзідэнта РФ.

Ва унікальных гульнях бралі ўдзел лепшыя ў свеце каманды інтэгрыраванага КВЗ: "Батлейка" (Мінск, у склад каманды ўваходзілі адмысловы тэатр "Мімоза" пад кіраўніцтвам Вольгі Прохаравай і акцёры Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача), "Усе разам" (Магнітагорск, РФ), "Панацэя" (Перм, РФ), "Шанс" (Адэса, Украіна).

У склад каманд уваходзілі неінваліды і інваліды 1-й — 3-й груп па зроку, з парушэннем апорна-рухальнага апарата, ампутацыяй канечнасцей, дзіцячым цэрэбральным паралічом, з агульнымі і ўнутранымі захворваннямі...

З шасці прызавых месцаў беларуская каманда "Батлейка" атрымала чацвёртае, а пераможцамі сталі "Усе разам" (Магнітагорск). Аднак усе каманды былі ўзнагароджаны кубкамі, каштоўнымі прызамі і памятнымі падарункамі.

**Віктар ЗАЯЦ**

*У галерэі "Панарама"* Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылося адкрыццё вернісажа фотапраекта "Лучик солнца". Задача дадзенага праекта — звярнуць увагу на дзяцей, якія пазбаўленыя бацькоўскай увагі і ўзятыя на выхаванне ў дзіцячыя дамы. Гэтыя дзеці ніколі не адрозніваюцца ад тых, хто выхоўваецца ў сем'ях: такія ж разумныя, таленавітыя і перспектыўныя. Грамадства павінна падтрымаць іх. Бо дзеці — будучыня планеты.

Першая частка праекта ў Мінску стартавала ў Дзіцячым доме № 5 Фрунзенскага раёна, другая — у Дзіцячым гарадку Ленінскага раёна. Дзятву парадавалі сваімі выступленнямі тэатр і клоуны. Вядомыя беларускія мастакі Віталь Брусінскі, Сяргей Кажамякін і Віктар Суглоб падрыхтавалі серыю, больш як 50, фотаработ пра выхаванцаў дзіцячых дамоў.

**В. К.**

# Музычная культура Беларусі

**У Нясвіжы, цэнтры старажытнай і сучаснай айчыннай культуры, ужо чатырнаццаць гадоў праводзіцца мастацка-асветніцкая акцыя, якую ладзіць Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны Міхаіла Фінберга пры падтрымцы дзяржавы і мясцовых органаў улады. Як зазначыў маэстра, гэтае свята традыцыйна яднае не толькі ўласна мастацкія праекты (а яны ахопліваюць канцэртныя праграмы з твораў старадаўняй і сучаснай музыкі, выстаўкі і тэатральныя паказы), але і навуковыя чытанні. Арганічнае злучэнне навуковай думкі і мастацкай практыкі на глебе "Муз Нясвіжа" цалкам заканамерна, бо з самага пачатку, з першых фестываляў іх падмуркам заўсёды была і сёння застаецца менавіта навука, якая адкрывае новыя музычныя помнікі, распрацоўвае канцэпцыйныя абгрунтаванні праграм, улучае іх у айчынную і агульнаеўрапейскую музычную прастору, стварае найбольш перспектыўныя кірункі і планы будучых імпрэз.**

Сёлетняя навуковая канферэнцыя мела назву "Музычная культура Беларусі на скрыжаванні еўрапейскіх шляхоў". Праблематыка дакладаў, як і раней, вельмі шырокая. Яна адлюстроўвае дасягненні ў галіне беларускага музыказнаўства ў яго этнамузыкалагічнай і гісторыка-тэарэтычнай галіне. Як прыклад, можна ўзгадаць працы "Беларуская оперная Скарыніяна: духоўныя інтэнцыі" кандыдата мастацтвазнаўства, прафесара кафедры гісторыі музыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Радаславы Аладавай, "Музыка ў кампазіцыях "Тэлесябрыны" сярэдзіны 90-х гг. XX ст." кандыдата філасофскіх навук, дацэнта Даната Яканюка, "Аляксей Туранкоў: піянер станаўлення беларускай музычнай культуры" доктара мастацтвазнаўства, прафесара кафедры тэорыі музыкі БДАМ Раісы Сергіенкі...

Доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык кафедры беларускай музыкі БДАМ Вольга Дадзіёмава прадставіла даклад пра "Беларускія рэаліі ў айчынным музычным мастацтве XIX ст.". Вольга Уладзіміраўна адзначыла, што назва гэтай працы можа падацца не зусім навукова карэктнай, паколькі мастацтва кожнай краіны апрыёры павінна ўтрымліваць і адлюстроўваць мясцовы, у тым ліку нацыянальны кампанент ва ўсёй яго размаітасці. Аднак назапашаны беларускай навукай музычна-гістарычны матэрыял пераконвае, што ў айчынным музычным мастацтве пісьмовай традыцыі ўласна беларускі пачатак з яго стрыжнявым элементам — фальклорам — да XX ст. не быў вызначальным і ўсебакова рэалізаваным у акадэмічнай кампазітарскай творчасці. Зрэшты, вядома, што не толькі фальклорызм (у многамерным разуменні гэтага паняцця, прапанаваным В. Анганевіч) выступае індыкатарам сталасці нацыянальнага мыслення ў кампазітарскай творчасці. Як і ў іншых мастацкіх сферах, і гэта перакануча даказана беларускім літаратуразнаўствам, этна-пэўныя феномены ў музычным мастацтве пісьмовай традыцыі могуць ахопліваць невычэрпна багатае кола з'яў. Менавіта таму прапануецца трактаваць іх максімальна шырока — як гісторыка-культурныя рэаліі, непасрэдна і апасродкавана звязаныя з беларускімі матывамі, вобразамі, сюжэтамі і сімваламі. Падобны падыход закліканы больш дыялектычна ўявіць супярэчлівы, драматычны, але лёсавызначальны для музычнай практыкі і яе навуковага асваення працэс станаўлення беларускай нацыянальнай кампазітарскай школы.

Як вядома, у Беларусі (у адрозненне ад іншых славянскіх краін) гэтая школа склалася толькі ў XX ст. Папярэднія ж перыяды вызначаліся вельмі неадназначным стаўленнем да беларускага кампанента і нават пэўнай занядбанасцю яго фальклорнага і моўнага элемента: да XX ст. у творах айчынных кампазітараў не толькі амаль не выкарыстоўваліся беларуская мова і фальклорныя цытаты, але і самі аўтары не называлі сябе беларускімі і не імкнуліся, у адрозненне ад сваіх рускіх ці польскіх калег, да стварэння нацыянальнага, уласнага беларускага музычнага мастацтва. Прычыны гэтага, несумненна, у тыпалагічных асаблівасцях культуры Беларусі як культуры еўрапейскага сумежжа, якая доўгія стагоддзі развівалася ў спецыфічных сацыяльна-гістарычных абставінах — пры адсутнасці ўласнай дзяржаўнасці і ўлучанасці беларускіх земляў у межы шырокіх геапалітычных утварэнняў (Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі), дзе беларускі этнас (нават тады, калі ён быў у краіне пануючым) не вызначаўся як маналітная супольнасць. Можна нагадаць, што ў самыя адказныя для музычнага мастацтва перыяды, а менавіта ў XVII — XIX стст., у Беларусі пасля далучэння ВКЛ да Кароны Польскай, беларуская мова страчвае свой былы дзяржаўны статус.

Вольга Дадзіёмава падкрэсліла, што наколькі моцным быў уціск на яе, можна меркаваць нават па адным факце: выцісканне беларускай мовы са справаводства і пісьмовых крыніц адбываецца хутка пасля таго, як у XVI ст. на ёй былі выдадзены такія шэдэўры, як Скарынаўская біблія і першая, самая прагрэсіўная еўрапейская канстытуцыя Новага часу. І хоць мова, гэтаксама як і фальклор, не з'яўляецца адзіна вызначальным фактарам і паказчыкам станаўлення нацыянальнага мыслення (бо ва ўсёй Еўропе яшчэ з часоў Сярэднявечча эліта далёка не паўсюдна карысталася роднай мовай), аднак татальнае яе ігнараванне ў пісьмовых крыніцах — з'ява даволі паказальная. Можна таксама ўзгадаць, што ў XVII ст. змяняецца і лакальная тапаніміка: беларускія землі называюцца не толькі Літвой, але і Польшчай, а пазней, у XIX ст., Паўночна-Заходнім краем.

Акрэсленыя акалічнасці дапаўняліся і ўзмацняліся канфесійнай раз'яднанасцю грамадства ў гэтым унікальным, самым заходнім арэале ўсходнеславянскага праваслаўя і ўсходнім арэале каталіцызму, у сферы суіснавання ўсіх хрысціянскіх і галоўных нехрысціянскіх рэлігій, дзе выразны сацыяльны падзел грамадства замацоўваўся не толькі па маёмаснай і саслоўнай, але канфесійнай ды моўнай прыкмеце. У адпаведнасці з ёй вышэйшыя слаі грамадства (з сузідальна-мецэнацкай і творчай дзейнасцю якіх непарыўна звязана развіццё пісьмовых форм музычнага мастацтва) паступова страчвалі ўласна беларускую арыентаванасць, спазнавалі пэўны працэс духоўнай эміграцыі і станавіліся носьбітамі іншаэтнічных, перадусім заходніх традыцый. Ніжэйшыя ж слаі захавалі ў першароднай чысціні свой этнічны падмурак і фальклорныя скарбы.

Што датычыць працэсу "вестэрнізацыі" культуры вышэйшых слаёў, дык яго прынята трактаваць і як пазітыўны факт, маючы на ўвазе раннюю далучанасць айчыннага прафесійнага мастацтва да заходнееўрапейскіх традыцый. Аднак з пункта гледжання нацыянальнага самавызначэння, такія абставіны аказаліся трагічнымі, бо ў іх плённае фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі і адпаведнай, нацыянальнай беларускай кампазітарскай школы было немагчымым. Больш за тое, многія мастацкія каштоўнасці, што ўзніклі калісьці на тэрыторыі сённяшняй Беларусі, сталі асэнсоўвацца як здабыткі суседніх краін і народаў, з якімі беларусы жылі ў супольных дзяржаўных межах — перш за ўсё польскага, літоўскага і рускага. Зрэшты, для падобнага мастацкага асэнсавання меліся моцныя падставы: большасць кампазітараў беларускага паходжання, ураджэнцаў Беларусі, нават тых, якія асэнсоўвалі сябе беларусамі-літвінамі і вялі свой радавод з беларускіх земляў, сталі носьбітамі і нават сімваламі польскага, літоўскага і рускага музычнага мастацтва. У іх шэрагу і высокапрафесійныя творцы — С. Манюшка, Ф. Міладоўскі, В. Казлоўскі, М. Карловіч, і таленавітыя аматары — М. Агінскі, М. Радзівіл, Н. Орда і іншыя.

І ўсё ж найбольш істотнай і лёсавызначальнай для айчыннага мастацтва стала творчасць тых аўтараў, якія адкрыта, паслядоўна і мэтанакіравана выкарыстоўвалі беларускія музычна-фальклорныя і моўныя элементы. Такіх прыкладаў XIX ст. дае няшмат, і тым больш значным паўстае кожны з іх. Перадусім гэта храналагічна блізкія мастацкія ўзоры — аперэта "Сялянка" В. Дуніна-Марцінкевіча з музыкай С. Манюшкі і К. Крыжаноўскага ды фартэпіянная сюіта "Беларускае вяселле" А. Абрамовіча, а таксама яго песні на беларускія тэксты. Першы з узгаданых твораў па сутнасці адкрывае не толькі беларускамоўную драматычную, але і оперную плынь, другі — камерна-інструментальную і вакальную...

У цэлым можна зрабіць выснову, што складаны і цярністы шлях, якім прайшла музычная культура Беларусі да XX ст., да часу выразнага афармлення нацыянальнай творчай школы, быў адзначаны гістарычна перспектыўнымі з'явамі, што акумулявалі ў сабе шматлікія лакальныя кампаненты, увасобленыя ў розных іпастасях — ад шырокіх сюжэтна-вобразных абагульненняў да канкрэтных захадаў па збіранні беларускага фальклору і яго адлюстравання ў акадэмічнай творчасці. І хоць аб'ектыўна для прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай кампазітарскай школы XX ст. усе гэтыя феномены працяглы час заставаліся цалкам невядомымі ці не ўспрымаліся як здабыткі айчыннага мастацтва, усё ж дэталёвае, усебаковае і глыбокае іх даследаванне павінна стаць адной з першачарговых задач сённяшняй беларускай музычнай навукі.

**Віктар КАВАЛЁЎ**

*Фота аўтара*

# Кнігі, невядомыя сучанікам

**Пісьменніка, гісторыка, публіцыста і грамадскага дзеяча Юзафа Ігнацы Крашэўскага (28.07.1812 — 19.03.1887) нездарма называюць "польскім Дзюма" — яго творчая спадчына ўражвае. Ім напісана больш як 600 тамоў твораў!**

**Крашэўскі аддаў належную даніну павагі і Беларусі. Многія яго раманы і аповесці прысвечаны гісторыі Літвы, а этнаграфічныя і краязнаўчыя нарысы "Пінск і Піншчына", "Успаміны пра Палессе, Валынь і Літву", "Карціны з жыцця і падарожжаў", "Адзенне сялян і мяшчан з ваколіц Брэста, Кобрына, Пружан", "Старажытная Літва. Яе гісторыя, законы, мова, вера, звычаі, песні", "Вільня ад яе пачатку да 1750 г.", "Барысаў" чакаюць свайго перавыдання на беларускай мове.**

**Пра цікавасць да творчасці пісьменніка з боку расійскіх чытачоў сведчыць артыкул без подпісу, які быў надрукаваны ў № 111 Санкт-Пецярбургскай газеты "Ілюстрацыя" за 1860 год. Аўтара мы можам вызначыць даволі лёгка: усе артыкулы без подпісу ў газеце друкаваў яе галоўны рэдактар — папулярны журналіст, драматург і празаік Уладзімір Зотаў, у рэдакцыі якога ў той час працаваў наш зямляк Павел Шпілеўскі. Праз некалькі старонак пасля артыкула быў змешчаны цікавы графічны партрэт Крашэўскага, які не сустракаецца ў іншых выданнях.**

*Вось тэкст згаданага артыкула.*

Разважаючы аб значэнні польскай літаратуры, трэба звярнуцца да часу адкрыцця Кракаўскага універсітэта (1347 год). Там творы польскіх пісьменнікаў з'явіліся спачатку не на роднай мове, а на іншаземнай лацінскай. Толькі ў XV стагоддзі пачалі выходзіць сачыненні на польскай мове, але і гэта былі дачасныя кветкі, якія не маглі прынесці плёну. Вонкавыя і ўнутраныя беспарадкі ў пачатку XVII стагоддзя мелі неспрыяльны ўплыў на народную літаратуру, асаблівы быў уплыў езуітаў. Кракаўскі універсітэт, праўда, пачаў з імі змагацца, але бой быў няроўны. Пачаўся перыяд сапсаванага густу. Сама мова пацярпела ад гэтага: у яе ўвайшло мноства лацінскіх слоў. Нават драматычныя формы не адпавядалі духу мовы. Усе вучэбныя ўстановы пакутавалі тады ад гэтай шкоднай з'явы. Езуіты скарысталіся гэтай абыякавасцю нацыі і набылі над ёй поўнае валадарства.

У палове XVIII стагоддзя зносіны з Францыяй польскага караля Станіслава Ляшчынскага далі мала-памалу паляпшэнне становішча спраў. Густ пачаў ачышчацца. Ідэі, якія пракраліся з захаду, абудзілі народ ад разумовага ўсыплення і ўзбудзілі жаданне шукаць іншых задавальненняў, акрамя матэрыяльных. На жаль, і гэтая спрыяльная хвіліна да абуджэння была прапушчана. Замест самастойнасці польскія пісьменнікі пусцілі да перайманння і замест лацінскіх аўтараў увялі ў Польшчу французскіх.

Пры палітычных бурах Еўропы ў канцы мінулага стагоддзя і ў пачатку цяперашняга адрадзілася сапраўдная польская нацыянальная літаратура, і па гэтым шляху яна развілася да выдатных з'яў. Калі і зараз ёсць схільнасць да перайманння, то, з іншага боку, у паэзіі бачна моцная самастойнасць, прыкладам якой з'яўляецца вялікі Міцкевіч.

Крашэўскі па справядлівасці можа называцца аднаўляльнікам польскіх аповесцей. Ён паспеў выцесніць з галоў французскія раманы і ўвесці польскія творы. Ён нарадзіўся 26 ліпеня 1812 года ў Варшаве і правёў першыя дні дзяцінства ў хаце свайго дзеда. Першую адукацыю атрымаў у вучэльні рэктара Прэйса ў Біале, потым Люблінскай і, нарэшце, у Свіслачы, пасля чаго паступіў у Віленскі універсітэт. Праз тры гады дамагаўся ён звання прафесара польскай мовы ў Кіеўскім універсітэце св. Уладзіміра, і па іспытах гэтае месца было яму прызначана, але па некаторых акалічнасцях ён не мог прыняць яго, а пайшоў у прыватнае жыццё, каб займацца музыкай, жывапісам і літаратурнай працай. (Справа ў тым, што пасля паўстання 1830 — 31 гадоў было забаронена прадстаўляць месцы на дзяржаўнай службе палякам. Мы ведаем, што нават М.В. Гогалю, нягледзячы на хадайніцтва Аляксандра Пушкіна, Пятра Вяземскага і Васіля Жукоўскага, не ўдалося атрымаць месца ў тым жа універсітэце з-за таго, што яго сваяк генерал В. Яноўскі быў адным з кіраўнікоў паўстання. — Каментарый перакладчыка.) У 1838 годзе ён ажаніўся з Соф'яй Варонеч, пляменніцай апошняга польскага прымаса. Зараз ён жыве са сваім сямействам у горадзе Жытоміры, у паўднёвай Расіі.

Крашэўскі можа называцца адным з пладавіцейшых пісьменнікаў нашага часу. Акрамя шасцідзесяці тамоў "Атэнэума", які выдаваўся дванаццаць гадоў пад яго рэдакцыяй, ім выдадзена каля ста тамоў сваіх твораў. З іх некаторыя дажылі да трэцяга выдання. Не кажучы аб мноства яго аповесцей, назавём "Гісторыю Літвы" ў трох тамах, "Гісторыю Вільні" ў чатырох частках, "Вандраванне па Валыні і Адэсе", "Помнікі гісторыі Полыпчы", тры вялікія паэмы з літоўскай гісторыі. Крашэўскі ўдзельнічаў ва ўсіх польскіх перыядычных выданнях, а з 1844 года быў пастаянным супрацоўнікам пецярбургскага лістка "Tygodnik", таксама пісаў фельетоны ў варшаўскіх газетах.

Усе творы Крашэўскага носяць на сабе адбітак выдатнай здольнасці аўтара. Яны адрозніваюцца яго чароўным уменнем ствараць вобразы, натуральным эфектным спосабам выказвання, цудоўным стылем. Ва ўсякім разе яго творы маюць сучасны дух, які больш перадаецца сэрцам, чым розумам. Ён разглядае ўсе грамадскія з'явы, каб растлумачыць іх і знайсці рашэнне сучасных пытанняў. Ён выдатна апісвае ўсе саслоўі сваёй айчыны, надаючы гэтым аповедам то гістарычную, то паэтычную формы. Яго глыбокія веды робяць даступным кожны прадмет, і гэта дае яму ганаровае месца не толькі паміж пісьменнікамі сваёй айчыны, але нават паміж еўрапейскімі знакамітасцямі. Яго творы перакладзены не толькі на рускую мову, але на нямецкую і французскую.

**Падрыхтаваў**
**Аляксандр ВАШЧАНКА**

**"ЛіМ" пачынае знаёміць сваіх чытачоў з замежнымі гасцямі сёлетняга Дня беларускага пісьменства — удзельнікамі III Міжнароднага форуму "Мастацкі тэкст як сродак зносін народаў", арганізатарамі якога з'яўляюцца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, РВУ "Літаратура і Мастацтва" і рэдакцыя часопіса "Нёман".**
**Форум адбудзецца 5 верасня ў горадзе Смаргонь. Сённяшнія госці "ЛіМа" — прадстаўнік Рэспублікі Казахстан Святлана Ананьева і чарнагорскі пісьменнік Слабадан Вуканавіч.**

# Шляхі ўзаемнага збліжэння

**Думаецца, нікога не здзівім, калі скажам, што пасля распаду Савецкага Саюза шмат у чым страціліся сувязі паміж народамі былой агульнай дзяржавы. І больш за ўсё гэта адлюстроўваецца на сувязях культурных, у тым ліку і літаратурных. Становішча, зразумела, зусім не суцяшальнае. Але ці ўсё так кепска на самай справе, ці ёсць нейкія перспектывы? Пра гэта мы і пагутарылі з кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам, галоўным навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры і мастацтва імя М.А. Ауэзава Міністэрства навукі і адукацыі Рэспублікі Казахстан Святланай АНАНЬЕВАЙ.**

**— Святлана Віктараўна, здавалася б, Беларусь і Казахстан — далёкія і ў геаграфічным, і ў культурным планах краіны, што ж нас усё-ткі аб'ядноўвае?**

— Адказ на гэтае пытанне можна знайсці ў адным з артыкулаў былога Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Казахстан Ларысы Пакуш: "Цяжка знайсці дзве дзяржавы нават у СНД, якія б мелі так шмат пабуджальных матываў да ўзаемнага збліжэння. Перш за ўсё, гэта эканоміка: як Беларусь мае патрэбу ў прадукцыі казахстанскіх прадпрыемстваў, так і Казахстан — у беларускіх. Узаемаўплыў і ўзаемадапаўненне культур — таксама важны фактар збліжэння. А самае галоўнае, несумненна, чалавечыя лёсы. У Беларусі ніколі не забудуць дапамогу братняга народа ў часы цяжкіх выпрабаванняў, у Казахстане цэняць унёсак беларусаў у эканоміку, навуку і культуру рэспублікі".

**— Давайце больш падрабязна спынімся на культурных і, у першую чаргу, літаратурных сувязях нашых краін. Як даўно яны існуюць?**

— Гісторыя казахска-беларускіх літаратурных сувязей пачалася яшчэ ў XIX стагоддзі, калі ў Казахстан прыязджалі ўраджэнцы беларускай зямлі З. Серакоўскі, Б. Залескі, А. Янушкевіч і іншыя. Браніслаў Залескі, сябра Тараса Шаўчэнкі па казахскай ссылцы, вярнуўшыся на радзіму, стварае ў 1869 годзе вялікі жывапісны альбом "Жыццё казахскіх стэпаў". Жамбылу Жабаеву прысвячалі свае творы Янка Купала і Якуб Колас. У 1939 годзе на беларускай мове выйшла кніга Ж. Жабаева "Песні і паэмы". У 1936 годзе ў Мінску адбыўся трэці пленум Саюза савецкіх пісьменнікаў, на якім прысутнічаў І. Жансугураў. Пасля вяртання казахскага паэта на радзіму ў друку з'яўляюцца вершы Янкі Купалы ў перакладзе І. Жансугурава і Д. Сыздыкава. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў Казахстан былі эвакуіраваны калектывы Беларускага тэатра оперы і балета, Віцебскага абласнога драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, беларускія кінематаграфісты. Праз казахскія стэпы ехаў у эвакуацыю Якуб Колас. На Алма-Ацінскай кінастудыі Уладзімір Корш-Саблін у 1942 годзе зняў першы беларускі фільм ваеннага перыяду "Беларускія навелы". А беларускую зямлю абаранялі і вызвалялі А. Шарыпаў, Ж. Муддагадзіеў, С. Сяітаў, у чыю творчасць надоўга ўвайшла беларуская тэматыка. У Казахстане выдаваліся творы Якуба Коласа, М. Багдановіча, М. Танка, І. Шамякіна, П. Броўкі, А. Адамовіча, В. Быкава і інш. На старонках часопісаў "Полымя", "Беларусь", "Маладосць" друкаваліся казахстанскія блакноты, цалінныя дзённікі беларускіх пісьменнікаў, паэтаў, публіцыстаў і г.д.

**— А што ў гэтым плане адбываецца на сучасным этапе? Ці працягваецца ўзаемаўзбагачэнне, ці з'яўляюцца новыя перакладыбеларускіх пісьменнікаў?**

— Новых перакладаў з беларускай літаратуры не стракала, акрамя адной працы Любові Шашковай. Паэму Янкі Купалы "На куццю" Л. Шашкова пераклала ў 1990 годзе ў Доме творчасці "Іслач", дзе рыхтавала сваю трэцюю кнігу "Дыялогі з надзеяй". Перакладала непасрэдна з беларускай, паколькі была магчымасць пракансультавацца з беларускімі пісьменнікамі.

**— Наладжванне любых стасункаў паміж нашымі народамі не можа адбывацца без дапамогі дзяржавы. Ці ёсць нейкія зрухі ў гэтым плане?**

— Так. Вялікую ўвагу надае культурным сувязям паміж нашымі народамі Пасольства Рэспублікі Казахстан у Беларусі, якое правяло ў Мінску прэзентацыю Дзяржаўнай праграмы "Культурная спадчына", выдала кнігу пра казахаў, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, арганізавала літаратурна-музычную вечарыну, прысвечаную вялікаму Абаю, і іншыя творчыя вечарыны. Тэатральныя і музычныя калектывы Казахстана пастаянна ўдзельнічаюць у штогоднім кінафестывалі "Лістапад", міжнародным фестывалі "Славянскі базар", міжнародным фестывалі тэатральнага мастацтва "Панарама". У гэтым годзе казахстанскія выдаўцы ўпершыню прынялі ўдзел у штогодняй выставе "Кнігі Беларусі", і былі яе гаяровымі гасцямі. Восенню 2006 года ў Астане адбыўся тыдзень Мінска, у межах якога майстры мастацтваў Беларусі далі святочны канцэрт у сталічным Кангрэс-холе, была арганізавана выстава прадукцыі і навуковых дасягненняў Беларусі. У кастрычніку 2008 года ў Мінску па ініцыятыве Пасольства Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь і з удзелам Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, Саюза пісьменнікаў Беларусі і прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі адбыўся форум пісьменнікаў і культуролагаў "Культурная спадчына ў дыялогу традыцый", мэта якога — адраджэнне традыцый культурнага супрацоўніцтва і ініцыіраванне новага вектара гуманітарнага дыялога паміж братнімі рэспублікамі. У прывітальным слове Пасла Рэспублікі Казахстан Болата Іскакава ўдзельнікам форуму была адзначана атмасфера ўзаемнага разумення і даверу, у якой развіваюцца нашы стасункі. У пратаколе Пятага пасяджэння міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, якая адбылася ў верасні 2008 года ў Астане, сярод прыярытэтных былі пытанні культурнага супрацоўніцтва, а міністэрствам культур дзвюх краін даручылі ўзгадніць тэрміны правядзення Дзён культуры Казахстана ў Беларусі і Беларусі ў Казахстане.

**— Вялікі дзякуй за размову. Будзем спадзявацца, што згаданыя вамі мерапрыемствы дадуць штуршок для узнаўлення культурных сувязей паміж нашымі краінамі, а ўдзел казахстанскай дэлегацыі ў Днях беларускага пісьменства стане чарговым крокам на гэтым шляху.**

**Гутарыў**
**Аляксей ЧАРОТА**

# У Беларусь — за новымі ідэямі

У якасці аднаго з удзельнікаў III Міжнароднага форуму "Мастацкі тэкст як сродак зносін народаў", які адбудзецца падчас святкавання Дня беларускага пісьменства, запрошаны чарнагорскі пісьменнік Слабадан Вуканавіч. Яго паэтычныя кнігі "Зорнае пер'е", "Касмічнае перасяленне Мантэнегра", "Куды нам далей", "Човен — лыжка", "Дамы пахнуць дымам", "Гэта не для кволых", "Дзяўчынка з галоўкай апельсіна", а таксама кніга прозы "Пяць лібрэта для балета" і раман "Ключ — Маятнік" даўно заваявалі свайго чытача не толькі на радзіме. Творы перакладзены на англійскую, французскую, італьянскую, польскую, рускую, венгерскую, македонскую, балгарскую ды іншыя мовы. Для нас важна ў першую чаргу тое, што вершы Слабадана Вуканавіча пераствораны і па-беларуску. Менавіта таму карэспандэнт "ЛіМа" меў падставу пагутарыць з чарнагорскім літаратарам пра Беларусь.

**— Ці існуе ў вашай краіне свята, аналагічнае нашаму Дню пісьменства?**

— На жаль, у нас такога свята пакуль няма. А гэта было б вельмі дарэчы, паколькі менавіта ў Чарнагорыі была створана першая друкарня паўднёвых славян яшчэ ў 1494 г. — раней, чым у Нью-Йорку і Маскве. Я прапанаваў старшыні Чарнагорскага таварыства незалежных пісьменнікаў заснаваць такое свята і праводзіць яго на міжнародным узроўні.

**— Як вы ацэньваеце ролю Беларусі ў развіцці культурных узаемасувязяў славянскай супольнасці?**

— Беларусь — "рухавік" супрацоўніцтва паміж славянскімі землямі. Асабліва вылучаюцца ў гэтым сэнсе Мінск, Віцебск і Гомель. Для гісторыі літаратуры бясспрэчным доказам стануць тэксты, надрукаваныя ў газетах "Літаратура і мастацтва", "Культура", часопісах "Нёман", "Полымя", "Маладосць", "Всемирная литература". Шмат робяць у гэтым напрамку Іван Чарота, Аляксей Чарота, Іван Штэйнер, Алесь Карлюкевіч, Анатоль Казлоў...

**— Ці разлічваеце вы на тое, што сёлетняя паездка ў Беларусь нейкім чынам паўплывае на вашу творчасць?**

— Так. Напрыклад, у мінулым годзе я пазнаёміўся з Алесем Наварычам, а таксама з расійскімі пісьменнікамі Андрэем Сальнікавым і Кацярынай Палянскай, польскімі — Збігневам Фрончакам, Войцэхам Пестказм і Гжэгашам Вішнеўскім... Кожнае новае наведванне Беларусі — больш знаёмстваў, больш творчых праектаў, публікацый. У 2008 годзе ў часопісе "Всемирная литература" былі надрукаваныя пераклады вершаў дзесяці чарнагорскіх паэтаў. А зусім нядаўна ў чарнагорскім часопісе "Арс" змясцілі пераклады твораў трынаццаці беларускіх пісьменнікаў. Да канца года павінна выйсці з друку "Анталогія беларускай паэзіі", пераклады для якой зрабіў "пасол паўднёваславянскай культуры" Іван Чарота. У Мінску я не замежнік, тут мая душа. З нецярплівасцю чакаю сустрэчы з сябрамі і спадзяюся на новыя цікавыя знаёмствы.

**Падрыхтавала**
**Жанна КАПУСТА**

## У святле рампы

# Ад Юрася да Несцеркі

**"Завуць мяне Пятром, прозвішча маё Ламан.**

**Я нарадзіўся на Наваградчыне, у маленькай вёсачцы, якая так і называецца — Маласенцы, на сутоку дзвюх рэк: невялікай і ціхай Ушы ды імклівага ляснога Нёмана. Маці памерла, калі мне было чатыры гады.**

**Я закончыў Ярэміцкую сярэднюю школу, год працаваў трактарыстам, а потым даведаўся, што мой аднакласнік паступіў вучыцца, як у нас у вёсцы казалі: "На артыста". Я падумаў: "Во, а чым я горш за яго, давай і я паспрабую".**

**Паспрабаваў і, як бачыце, паспяхова. Пасля інстытута быў накіраваны ў тэатр імя Якуба Коласа і амаль два гады іграў на коласаўскай сцэне "пяты куст за сёмым дубам". Такое становішча мяне не задавальняла, трэба было знайсці нейкае выйсце, і яно знайшлося ў літаратуры...**

**Усур'ёз літаратура прыйшла тады, калі я задумаўся: а хто я такі на гэтай зямлі, а што ж гэта за зямля, на якой я жыву, а што ж гэта за народ. Словам, калі я ўсвядоміў сябе часцінкаю гэтага мужнага, шматпакутнага народа.**

**За гэты час я выдаў тры зборнікі вершаў, зборнік прозы, быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў...**

**Чалавек на гэтай зямлі нараджаецца двойчы — цела чалавека нараджаецца ў мацярынскім улонні, а дзе і калі нараджаецца душа?..**

Творчая душа заўсёды знойдзе прытулак менавіта ў творчасці. 1972 год. Тэймураз Джакелі ў спектаклі "Не трывожся, мама!". Выдатная аповесць знакамітага Надара Думбадзе. Пастаноўшчык — знакаміты майстар Барыс Эрын. Пакуты творчасці, радасць перамогі. Атрымалася!

А потым — Юрась у "Несцерцы". Візітная картка тэатра, спектакль з 1941 года ў рэпертуары коласаўцаў. Першы выканаўца ролі Юрася — народны артыст Беларусі Анатоль Шэлег. Вялікая адказнасць і гонар. Вывучыў на памяць фактычна ўсе мужчынскія ролі. Аднойчы без праблем замяніў у спектаклі выканаўцу ролі Шкаляра. Пра Несцерку марыў даўно. Падглядаў з-за куліс і за Фёдарам Шмакавым, і за Яўгенам Шыпілам, і за Валянцінам Салаўёвым, якім пашчасціла іграць гэтую ролю. Падчас апошняга аднаўлення спектакля ў 2006 годзе рашыўся выйсці на сцэну ў ролі Несцеркі. Шмат было спрэчак. Усе звыкліся з абліччам першых выканаўцаў — невысокіх, гарэзлівых, шпаркіх камедыйных акцёраў. А тут — артыст, знешне падобны на Янку Купалу, Максіма Багдановіча. Дарэчы, Багдановіча Пятро Ламан сыграў у тэлевізійным спектаклі, а Песняра (чытай Янку Купалу) у спектаклі "Сон на кургане", пастаўленым Віталем Баркоўскім паводле творчасці Янкі Купалы.

У сталым узросце акцёру шанцуе на цікавыя работы. У спектаклі "Фрэкен Юлія" А. Стрындберга Антон Грышкевіч даручыў яму ролю спакусніка Жана, у "Тузах" У. Відмера Віталь Баркоўскі прапанаваў сыграць разгубленага, "прыбітага" жыццём Краўзэ, у "Кракаўскім студэнце" Г. Марчука Валерый Анісенка прызначыў на ролю чалавека без радзімы Тураўца, у "Памінальнай малітве" Р. Горына Юрый Пахомаў убачыў Ураднікам, які спачувае, але нічым не можа дапамагчы Тэўе і ягонай сям'і, а ў спектаклі "Ён. Яна. Акно. Нябожчык", той жа рэжысёр Юрый Пахомаў даў Пятру Ламану камедыйную ролю "пакутніка" Роні; у прэм'еры "Апошнія сведкі" С. Алексіевіч па волі рэжысёра Уладзіміра Савіцкага акцёр успамінае маленства ад імя дзяцей вайны Парабковіча і Сівакова.

*"Я закончыў школу, закончыў інстытут, а ў мяне было такое ўражанне, што гісторыя маёй зямлі, гісторыя майго народа пачалася пасля семнаццатага года, а да гэтага ў бедных беларусаў нічога, акрамя лапцяў ды сахі, не было. Але Беларусь — гэта краіна тысячагадовых гарадоў. Беларусь — гэта краіна замкаў," — ведаў акцёр Пятро Ламан пра што гаворыць у спяктаклі...*

У свой юбілейны дзень нараджэння Пятро Ламан выйшаў на коласаўскую сцэну ў ролі Несцеркі. Коласаўцы, шчырыя прыхільнікі яго таленту павіншавалі любімага артыста, адданага нацыянальнаму тэатру. А дырэктар тэатра ўручыў Пятру Аляксандравічу нагрудны знак Міністэрства культуры "За ўклад у развіццё культуры Беларусі".

**Святлана ДАШКЕВІЧ,**
**кіраўнік літаратурна-драматычнай часткі**
**Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа**

# Беларусы далёкія і блізкія

**Магчыма, не ўсе чытачы ведаюць пра гэта, але выдавецкія анатацыі звычайна пішуцца самімі аўтарамі. Прачытаеш каторую — і адразу пачынаеш разумець, хто з іх на што здатны. У большасці анатацый, асабліва калі гаворка ідзе пра кнігу паэзіі, пераважаюць агульныя разважанні кшталту: шчырыя і сардэчныя радкі аўтар прысвячае бацькоўскай зямлі, апявае каханне і г.д. Розніца хіба ў тым, што ў некаторых выпадках усё гэта ўзмацняецца эпітэтамі, у выніку чаго атрымліваецца, што роднай зямлі прысвячаюцца не проста шчырыя і сардэчныя, а надзіва шчырыя і сардэчныя радкі. Зразумела, і апяванне кахання ўзнёслае, непаўторнае...**

З гэткай жа... рэкламай (не трэба баяцца такога слова, бо сёння, калі кніжны рынак літаральна завалены прадукцыяй, іначай да звыклай анатацыі ставіцца ўжо нельга) падаюцца і зборнікі апавяданняў. Калі ж гэта аповесць альбо раман, то звычайна пераказваецца змест твораў. На жаль, далёка нямногія аўтары памятаюць даўнюю ісціну: чалавека звычайна сустракаюць па апратцы. Таму да анатацыі і трэба ставіцца сур'ёзна, як да свайго роду "апраткі" кнігі.

А вось Рыгор Андрэявец цудоўна разумее, што шлях да сэрца чытача пачынаецца з таго самага моманту, калі толькі яшчэ выходзіш з ім на сустрэчу. Прынамсі, бярэш у рукі яго новую кнігу "Две Родины" (яна пабачыла свет у адным з філіялаў "Военного издательства" Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі), учытваешся ў анатацыю.... Павучыцеся, браточкі, як трэба пісаць яе: *«Почему былины, созданные в Черниговском и Киевском княжествах Древней Руси, вдруг «переселились» на север Новгородской республики? При каких обстоятельствах и каким образом Смоленская летопись оказалась в Великом Устюге? Был ли покоритель Сибири атаман Ермак Тимофеевич запорожским казаком? Какие белорусские корни можно найти в роду ученого Михаила Ломоносова?».* Далей у гэткім жа духу. Хочацца хутчэй браццца за чытанне? Яшчэ як хочацца!

Што датычыць мяне, дык я правёў за кнігай Р. Андрэяўца, не адрываючыся, некалькі гадзін запар. Асабліва захапіла першая яе частка — «Неизвестная Беларусь», у якую ўваходзіць аднайменнае гістарычнае эсэ. Пачынаючы з раздзела «Загадка Устюжской летописи», адчуў, што даўнавата ўжо не напаткоўваў для сябе такога, што б гэтак моцна, не адпускаючы ад сябе, прыцягвала ўвагу, выклікала жаданне хутчэй і хутчэй перагортваць старонку за старонкай. Ды і як жа іначай, калі адразу высвятляецца, якім жа чынам *«Смоленская летопись оказалась в Великом Устюге»*. Думка, якую выказвае Р. Андрэявец, нечаканая. *«Устюжская летопись*, — сцвярджае ён, — *это, по моему мнению, переписанная ... Смоленская летопись с вкраплением туда местных событий»*.

Коратка пра гісторыю самога пытання. Ва Усцюжскім летапісе ёсць звесткі, што датычаць гістарычных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. Гэта згадкі, да ўсяго вельмі падрабязныя, пра бітву на Ведрашы і ўзяцце ў палон Канстанціна Астрожскага, а таксама пра захоп маскоўцамі Смаленска і знакамітую Аршанскую бітву 1514 года... Самае цікавае, што такіх падрабязнасцяў больш нідзе не сустрэнеш — ні ў літоўскіх летапісах, ні ў маскоўскіх. Больш за тое, ва Усцюжскі летапіс трапілі і такія сведчанні пра Смаленск, якія датычаць 862 і 881 гадоў, а гэтага няма нават у знакамітай «Аповесці мінулых часоў».

Навукоўцы даўно выказвалі меркаванне, што некалі быў і Смаленскі летапіс, з якога захаваліся толькі асобныя ўрыўкі. Але чаму ў такім разе яны ўвайшлі не ва Усцюжскі летапіс, што было б верагодней, а адбылося наадварот? Калі ж прытрымлівацца гіпотэзы Р. Андрэяўца, то адказ на гэтае пытанне не такі і складаны. Згублены на сённяшні час Смаленскі летапіс, як пераканаўча даводзіць ён, быў колісь напісаны смаленскім епіскапам Варсанофіем, які пасля ўзяцца горада маскоўцамі трапіў у апалу. Адпраўляючыся ў высылку, Варсанофій і прыхапіў з сабой гэты летапіс.

З Р. Андрэяўцом цяжка не пагадзіцца. Варсанофій, як вядома, быў адным з першых кніжнікаў Смаленскага княства, з'яўляўся адукаваным чалавекам, сам займаўся творчасцю. Таму ён не мог не ведаць сапраўдную цану словам, якія апісваюць важныя падзеі. З гэтай прычыны і ўзяў з сабой запісы, калі не па ўласнай волі мусіў развітацца са Смаленскам. А ўжо знаходзячыся ў манастыры, пачаў пісаць пра тое, што адбылося нядаўна.

Праз некаторы час, калі ўжо стваралася Усцюжкі летапіс, у яго перайшла і частка тэксту са Смаленскага. Аднак пры гэтым падыход быў выбарачным: «*Убирали, конечно, все то, что было связано с Великим княжеством Литовским, когда Смоленск входил в это государство. Хорошо, что хоть оставили несколько фрагментов из древней жизни Смоленска и яркие события взятия Смоленска и Оршанской битвы*». Праўда, Р. Андрэявец пакуль не гатовы да больш канкрэтнага адказу на пытанне, у чым была сапраўдная прычына такой выбарнасці: «*На это, очевидно, каким-то образом настоял опальный епископ Варсонофий*».

Грунтоўна напісана не толькі «Неизвестная Беларусь». Што ні раздзел кнігі, то абавязкова нешта новае, цікавае, а калі яно для цябе ў чымсьці і знаёмае, то, як было відаць з гісторыі пра Усцюжскі летапіс, падаецца ў нейкім іншым ракурсе, нечаканым аспекце, з абавязковым прыцягненнем малавядомага, а то і зусім невядомага матэрыялу — «По следам былин», «Казаки Приднепровья», «Белорусы на сибирском тракте»...

У другой частцы кнігі — «От полесских дубрав до снегов северных», пісьменнік на прыкладзе беларусаў, для якіх суседняя краіна стала другой Радзімай, паказвае, як, Расія, калі перафразіраваць вядомыя словы, «произрастает Беларусью». Найперш пацвярджэнне таму — мастацка-дакументальная аповесць «Разведчик Генерального штаба», у якой прасочваецца лёс ураджэнца Лепельскага раёна, Героя Расіі Івана Коласа, на жаль, ужо нябожчыка.

Міжволі ловіш сябе на думцы, што калі б знайшліся спонсары, гэтую аповесць можна было б пакласці ў аснову кнігі «Разведчик Генерального штаба» для серыі «Жыццё выдатных людзей Беларусі», уключыўшы ў яе ўрыўкі з кніг самога І. Коласа (Іван Андрэевіч выступаў і як пісьменнік), а таксама ўспаміны людзей, якія ведалі «Жалезнага Коласа».

Урэшце ў асобныя кнігі маглі б выліцца і некаторыя з нарысаў Р. Андрэяўца, бо людзі, пра якіх ён расказвае, маштабам сваёй дзейнасці, выдатнымі арганізатарскімі здольнасцямі, адчуваннем новага таго заслугоўваюць. Людзей выпадковых Р. Андрэявец героямі сваіх нарысаў ніколі не робіць.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

# Аднаўленне рэпрэсаванай памяці

**У выдавецтве "Смэлтак" выйшаў у свет чарговы энцыклапедычны даведнік Леаніда Маракова "Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі (1917 — 1964)". Вядомы даследчык сталінскіх рэпрэсій, пляменнік расстралянага ў 1937 годзе паэта Валерыя Маракова, ужо займеў добрую славу і чалавечую павагу ў беларускім грамадстве, выдаўшы шмат кніг, якія адкрываюць вочы сучаснікам на злачынствы савецкай карнай машыны ў перыяд трыццатых-пяцідзесятых гадоў мінулага стагоддзя і ўшаноўваюць памяць бязвінна загінулых літаратараў, людзей культуры, навукі, святароў ды іншых зямных прафесій і заняткаў.**

Я памятаю, як няпроста тое давалася Леаніду Маракову на пачатку задумы. Бо адразу ў яго з'явілася ўпартае жаданне вывесці на чыстую ваду тых, хто спрычыніўся да справы яго, аблудна арыштаванага і расстралянага, дзядзькі-паэта. І калі ён пачаў адкрываць і дарэшты разварушваць гэтую справу, то аказалася, што побач з дзядзькам былі дзесяткі, сотні і тысячы абгавораных, справакаваных і абсалютна ні ў чым не вінаватых ахвяр. Каменныя казематы і сутарэнні турмаў проста заходзіліся ад непамернага гора, болю катаванняў і невыноснага стогну кінутых туды людзей. Да іх выраку нікому не было справы, апроч блізкіх і родных. Увесь астатні савецкі народ узнёсла і апантана верыў бальшавіцкім догмам і будаваў сацыялізм. Тыя ж, хто ўнутрана вычуваў пошласнасць кіруючай бальшавіцкай улады і яе сталінскае вераломства, лічылі за лепшае маўчаць і неяк ціхма перажыць гэтае нашэсце палітычных ваўкалакаў... Выжыць і перажыць іх удалося нямногім — найперш дзецям ды ўнукам. Вельмі цяжка ішло аднаўленне памяці і станаўленне аб'ектыўнасці. Ад Калымы, Салаўкоў, гулагаў да Курапатаў сцежка вытоптвалася спачатку гераічнымі адзіночкамі інтэлігентаў-дысідэнтаў тыпу Аляксандра Салжаніцына. Далей — болей... Пакуль у другой палове 80-х лёд імперскай "патайнай інквізіцыі" не пачаў паціху адтайваць, а на пачатку 90-х канчаткова выйшаў з берагоў і ашаламіў сваёй "бурапенай", змываючы ўсё гнілое, счахлае і... яшчэ жывое. Зрэшты, пра тое судзіць нашым гісторыкам. Што ўласна да Л. Маракова, то першыя яго творчыя вымогі, матэрыяльныя выдаткі і, урэшце, выдавецкі плён не супакоілі і не супынілі яго ў сваіх пачынаннях, а натхнілі на працяг бескарыслівай цяжкай, падчас фізічна знясільваючай працы. А выдаў ён з 2000-га па 2009-ты год 13 кніг энцыклапедычнага і даведачнага плана. Уявіце, колькі архіўных спраў, запытаў, даведак і даведнікаў трэба было пералапаціць, укладваючы ў свае "мемарыяльныя энцыклапедыі" адсеяную і адрэдагаваную факталагічную сутнасць справы пра кожнага рэпрэсаванага чалавека. А іх дзесяткі і дзесяткі тысяч!

Вось і ў гэтым даволі аб'ёмным выданні сабраны матэрыялы пра больш як 700 рэпрэсаваных каталіцкіх і свецкіх асобаў Беларусі, а калі да гэтага дадаць, што ў даведніку падаюцца звесткі пра 800 касцёлаў і больш як 2000 святароў, якія ў іх служылі, то панарама акрэсліваецца ўражлівая. Многія ведаюць з гісторыі, што на тэрыторыі СССР панавала зацятая ідэалогія атэізму, і калі ўсё ж хоць якая прадуха пакідалася для вернікаў праваслаўнай канфесіі, то хрысціяне-каталікі пастаянна знаходзіліся пад асабліва пільным вокам органаў дзяржаўнай бяспекі. Лічылася, што касцёл ужо па прыродзе сваёй адкідвае на савецкую Беларусь цень заходняй "пальшчызны". Вельмі скрушна чытаць нярэдкія ў гэтым выданні такія вось звесткі: *"З 1923 года адміністратар касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у мястэчку Зэльва, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобласці. Забіты членамі мясцовай прасавецкай групоўкі. Пахаваны ў агульнай магіле"*. Гэта пра Яна Антонавіча Крынскага (1861—1939). Альбо пра Вітольда Кузьміцкага (1873 — 1943): *"З 1936 года пробашч і дэкан парафіі св. Станіслава ў мястэчку Дамброва Віленскай архідыяцэзіі. Цяпер Польшча. Забіты з 5 святарамі і вялікай групай мясцовай інтэлігенцыі каля в. Навумавічы"*. Ці пра Вінцэнта Латарэвіча (1986 — 1919), які *"служыў пробашчам касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў Ішкалдзі. Расстраляны чырвонаармейцамі ў Мірскім замку Гродзенскай вобласці. Пахаваны ў Ішкалдзі"*. А вось святар Антон Леўша (1906 — 1942), які *"служыў вікарыем касцёла святога Казіміра ў мястэчку Стоўбцы, падчас Другой сусветнай вайны быў арыштаваны гестапа і зняволены ў Баранавіцкай турме. Паводле некаторых звестак, атручаны газам у лагеры Калдычэва каля Баранавічаў"*. Карнікі ўсіх краін і народаў заўсёды былі і ёсць адной нялюдскай масці. Але нялюдскасці не схаваеш, яна адкрываецца, няхай сабе і па-за часам здзейсненага злачынства. Гэта не здымае віны і кары з забойцаў. І разам з тым узвышае дух нявінных ахвяраў, увекавечваючы светлую памяць пра іх у сэрцах нашчадкаў. І, вядома ж, — папярэджвае наступнікаў.

**Леанід ГАЛУБОВІЧ**

## Кніжная паліца



У выдавецтве Логвінава выйшаў зборнік выбраных вершаў і паэтычных мініяцюр **Ігара БАБКОВА** *"Засынаць, прачынаца, слухаць галасы рыб"*. Гэта трэці паэтычны зборнік аўтара. Як піша ў анатацыі сам паэт, *"ён нарэшце трапіў дадому — у салодкую непрытомнасць восені"*. Мастак А. Глобус.

У выдавецтве "Харвест" выйшаў у перакладзе на рускую мову раман вядомага артыста і пісьменніка **Анатоля ЖУКА** *"Бульвар"*. У творы распавядаецца пра жыццё тэатральнай багемы нашых дзён з усімі калізіямі і складанасцямі ўзаемаадносін. Востры сюжэт, сучасная манера дыялога робяць гэты раман захапляльным і чытэльным.

У выдавецтве "Вараксіна" пабачыла свет першая кніга маладога аўтара з Чавусаў **Яўгена ЗУБОВІЧА** *"У небе сонца заходзіць самотна"*. Пад вокладкай дэбютанта сабраны вершы, п'есы, апавяданні і паэма. Прадмову напісаў член СПБ В. Крыжэвіч.

У выдавецтве "Галіяфы" выйшаў калектыўны зборнік прозы пісьменнікаў Швецыі *"Сучаснае шведскае апавяданне"*. У зборнік уключаны чатырнаццаць навел адзінаццаці аўтараў. Кароткія ўводзіны напісаў Даніэль Мёлер. Пераклад зроблены выключна маладымі асобамі жаночага полу. Укладанне В. Цвіркі. Рэдактар В. Акудовіч. Кніга выдадзена пры падтрымцы Дзяржаўнай рады культуры Швецыі і Цэнтра шведскіх даследаў.

У выдавецтве "Кнігазбор" выйшаў чарговы зборнік серыі "Мне сонцам свеціць Наднямонне", заснавальнікам якой з'яўляецца аддзел культуры Стаўбцоўскага райвыканкама, *"Дзе хвалі срэбна-залатыя..."* паэта **Яўгена ХВАЛЕЯ**. Гэта ўжо дзевятая кніжачка творцаў, жыццё якіх звязана са Стаўбцоўшчынай. Перад тым пабачылі свет зборнікі Якуба Коласа, Уладзіміра Сыракомлі, Язэпа Лёсіка, Валеры Дранчука, Міколы Маляўкі, Уладзіміра Мароза, Казіміра Камейшы і Генрыха Далідовіча. Чым не прыклад "культурнага патрыятызму" для іншых рэгіёнаў нашай краіны.

У Віцебскай абласной друкарні выйшаў першы зборнік вершаў **Аляксандра МАТОШКІ** *"Дзеяслоў жыцця"*. Здольны аўтар з правінцыі (Расоны), які мае вялікі жыццёвы вопыт, дзеліцца з чытачамі сваімі лірычнымі вычуваннямі. Чалавечай цеплынёй і душэўнасцю прасякнуты лепшыя творы выдання. Прадмова Н. Гальпяровіча. Рэдактар А. Салтук.

# Пошукі сапраўдных слоў

## Легкадумнасць радка

Часопіс адкрываецца літаратуразнаўчай знаходкай: падчас працы над новым навукова-каментаваным Зборам твораў Івана Шамякіна былі выяўлены ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва аўтографы двух апавяданняў пісьменніка "Чалавек з "Бізоніі" і "Міжнароднае права", якія ніколі раней не друкаваліся. Ліпеньскі нумар працягвае публікацыю матэрыялаў, прысвечаных 65-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, — гэта і дакументальная аповесць Юліяна Высоцкага "Таварыш Ганс", і апавяданні Івана Стадольніка "Паўлюк-Паўлюс", "Лекар". Сюжэт апавядання "Лекар", у якім распавядаецца пра яўрэя Навума Лекаха, чый хірургічны талент спатрэбіўся і беларускім партызанам, і нямецкім афіцэрам, — адна з тых "класічных" гісторый, якія канцэнтруюць у сабе разуменне трагічнасці чалавечага існавання падчас вялікіх войнаў.

Неадназначныя ўражанні пакідае эсэ Рымы Стаховіч-Ларчанкі "Размова са сваім партрэтам і з Богам". Аповед пра лёс жанчыны, пра хуткаплыннасць маладосці ў размове гераіні Ганны са сваім даўнім фотаздымкам сапраўды перацякае ў размову з Богам... Размова адбываецца ўва сне, аднак і гэта мала тлумачыць мастацкую задуму аўткі.

Варта падкрэсліць, што пісьменніца сама пазбаўляе крытыка магчымасці даваць твору ацэнку: Ганна скардзіцца Богу, што яе спробы друкаваць свае мастацкія творы не былі ўдалымі, што яе таленту своечасова не ацанілі і не падтрымалі, і магчыма, таму лёс яе склаўся не так шчасліва, як яна марыла. Чытаеш гэтыя радкі, адгадваеш у іх нешта аўтабіяграфічнае... і становіцца няёмка выказваць нейкія меркаванні. Аднак некаторыя месцы ў гэтым творы ўсё ж выклікаюць неўразуменне.

Падчас размовы Ганны з Богам нічога незвычайнага не адбываецца — гераіня задае тыя ж пытанні, шле тыя ж дакоры, што і сотні, тысячы людзей у хвіліны жыццёвай скрухі, зняверы, расчаравання ("Калі Ты сапраўды Усемагутны Гасподзь Бог, як жа Ты мог дапусціць такое, што рабілася ў нашай краіне, з нашым народам, з нашымі лепшымі таленавітымі людзьмі?"). У гэтых пытаннях няма нічога новага і нічога дзіўнага, нечаканага, здзіўленне выклікае іншае. Як, напрыклад, стасуецца з хрысціянскімі законамі такая фраза, вымаўленая ў творы Р. Стаховіч-Ларчанкі Богам: "Я ненавіджу балышавікоў і розных чыноўнікаў-бюракратаў не менш, чым ты... Нічога, нічога я ім не дараваў і не дарую... будзь спакойная!". Ці словы гераіні, адрасаваныя свайму суразмоўніку: "Не, не трэба расслабляцца, — загадала самой сабе жанчына, — не трэба дараваць, што нельга дараваць. Трэба спытаць у Яго з усёй строгасцю". Альбо як трэба ўспрымаць, напрыклад, гэта: "Хрыстос пачырванеў па самыя вушы і апусціў голаў..."; словы Бога: "Ты вось скардзілася мне толькі што, што ў цябе духоўнай падтрымкі не было, і я, дурань, ледзьве-ледзьве табе не паверыў"? Вядома, рэакцыя чытача на гэты твор будзе залежаць ад ступені яго рэлігійнасці, і нават калі не кожны палічыць патрэбным весці гаворку пра блюзнерства (хаця гэтага ў творы больш, чым дастаткова), то прынамсі эстэтычная недарэчнасць эсэ Р. Стаховіч-Ларчанкі відавочная.

У традыцыйна палымянскай, змястоўнай, насычанай сюжэтнасцю паэзіі (нізкі Валянціна Лукшы, Алеся Камароўскага, Тамары Кручэнкі) па кантрасце вылучаюцца вершы Валерыі Куставай — больш лёгкія і больш "легкадумныя". Апошняя характарыстыка не з'яўляецца адмоўнай, нічога заганнага няма ў легкадумнасці паэтычнага радка, праўда, толькі ў тым выпадку, калі яна па-мастацку прадуманая, калі яна нясе ў сабе паэзію. А ў прапанавай нізцы часам акурат гэтай вось прадуманасці і не стае. Сярод адметных вершаў ("Няблізкасць", "Здані", "***Мае вершаняты...") сустракаюцца і такія, што нічога не могуць сказаць пра аўтара і ўжо дакладна нічога новага не скажуць чытачу. Маецца на ўвазе перш за ўсё блякласць вобразаў, якія даўно нават і першасны свой сэнс страцілі ад празмерна частага ўжывання. Нельга ў 2009 годзе даваць вершу назву "Апошняе "Бывай!..". У літаратурным, паэтычным сэнсе гэта — пасля ўсяго сказанага і праспяванага — такія безаблічныя словы, што нават нейкія новыя адценні і нюансы наўрад ці здольныя гэтую безаблічнасць разбурыць.

Ахвотнікаў паназіраць за жыццём з філасофскага пункта гледжання хуткаплыннасці ўсяго існага не пакінуць абыякавымі "Зацемкі з левай кішэні" Леаніда Галубовіча. Крытыка і літаратуразнаўства прадстаўлены артыкуламі Уладзіміра Гніламёдава, Алены Бурбоўскай, Кастуся Ладуцькі, Казіміра Камейшы. Да 80-годдзя з дня нараджэння Еўдакіі Лось прымеркавана нізка ўспамінаў пісьменнікаў з Літвы, Латвіі, Арменіі, Азербайджана, Узбекістана і Расіі. Акрамя гэтага — краязнаўчае даследаванне Аляксандра Хазяніна і матэрыялы "круглага стала", прысвечанага 65-й гадавіне вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў, што адбыўся ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук.

## Смеласць адмаўляцца

Тых, хто сочыць за публікацыямі Дзмітрыя Пятровіча, усцешыць відавочны творчы рост гэтага аўтара. Яго новая аповесць "Белая жанчына" стане прыемнай і захапляльнай чытанкай.

Твор гэты можна вызначыць як містычна-прыгодніцкі, бо і таго, і другога ў аповесці хапае напоўніцу. Шмат нязвыклага: дзеянне адбываецца ў пячорах, а галоўныя героі — спелеолагі-аматары. Зрэшты, аўтар кіраваўся вядомай схемай: увечары — сяброўскія пасядзелкі ля вогнішча, падчас якіх няспынна гучаць жарты і распавядаюцца легенды і прафесійныя, спелеалагічныя забабоны; на наступны дзень — адносна лёгкі шлях да дасягнення мэты і нечаканае трагічнае здарэнне з адным з сяброў; шчаслівае, але невытлумачальна дзіўнае выбаўленне са, здавалася б, безвыходнага становішча; лірычнае заканчэнне, у якім герой развітваецца са сваімі патаемнымі страхамі... Аднак нягледзячы на прадказальнасць сюжэта, аповесць чытаецца цікава — перш за ўсё, дзякуючы напружанасці, дынамічнасці, захапляльнасці апісанага дзеяння.

А вось прыхільнікаў творчасці Міхася Южыка яго аповесць "І падаў снег на зямлю", надрукаваная ў ліпеньскім нумары "Маладосці", хутчэй за ўсё, расчаруе. Твор прывабліваe шматзначным метафарычным уступам, лёгкім дынамічным пачаткам, прыгожай і капрызлівай галоўнай гераіняй... Аднак увогуле аповед вядзецца даволі павярхоўна. Бадай, самае ўдалае ў творы — гэта скразны вобраз снегу, што падае на зямлю, — як увасабленне непарушнасці жыццёвых законаў, духоўнай гармоніі і ўтульнасці зямнога чалавечага існавання. Праўда, усё гэта не столькі расчароўвае, колькі здзіўляе, калі прыгадваеш ранейшыя, на значна больш высокім узроўні напісаныя творы М. Южыка.

Малады аўтар Андрэй Філіпчык, які ўжо друкаваўся ў "Маладосці", прапаноўвае чытачу два апавяданні "Вецер з поўначы" і "Не забуду цябе". Другое апавяданне, насуперак некаторай наіўнасці першага, падаецца больш цікавым. Малады хлопец, які скончыў жыццё самагубствам з-за нешчаслівага кахання, трапляе ў своеасаблівы іншасветны пункт-размеркавальнік. Аднак аказваецца, што насамрэч ён не памёр, знаходзіцца ў коме, і анёлы прапаноўваюць яму вярнуцца да жыцця, план якога, дарэчы, закладзены ў анёльскай базе дадзеных. Сюжэт, праўда, не зусім арыгінальны, такія размеркавальныя кабінеты з "анёламі-адміністратарамі" ў даведачных акенцах раз-пораз з'яўляюцца ў амерыканскіх фільмах. Але калі ўсе памерлыя зазвычай імкнуцца вярнуцца ў свет жывых любым спосабам, то герой А. Філіпчыка не пагаджаецца з запраграмаванасцю жыцця і выбірае смерць. Такім чынам, мабыць, малады аўтар пратэстуе супраць усемагутнага банальнага хэпі-энду.

Паэзія прадстаўлена нізкамі Валянціна Лукшы, Дар'і Лёсавай, Віктара Кажуры і Бажэны Мацюк. Варта вылучыць вершы двух апошніх аўтараў. Маладая паэтка Бажэна Мацюк здольная пераканаць чытача затрымаць позірк на сваёй нізцы пад назвай "Празрыстасць". Аднак не толькі дзякуючы "празрыстасці"(= аголенай шчырасці паэтычнага радка), але і праз імклівасць слова, сілу эмоцыі. Зразумела, не ўсё ў Б. Мацюк ідэальна, яшчэ не хапае сканцэнтраванасці паэтычнай думкі, часам не хапае смеласці адмовіцца ад прыгожага, але ўсё ж — што да глыбіні сэнсу — павярхоўнага вобраза на карысць гарманічнасці верша ў цэлым. Усе змешчаныя ў нізцы вершы прасякнутыя агульным адчайным настроем, і ўражвае пры гэтым адсутнасць позы: лірычная гераіня не стала штучным, падкрэслена манерным двайніком аўткі, што вельмі часта можна бачыць у "скрушных" вершах маладых паэтаў.

Да 65-годдзя з дня вызвалення Беларусі прымеркавана старонка вершаў паэтаў-франтавікоў М. Танка, П. Панчанкі, А. Куляшова, А. Пысіна, П. Пранузы і П. Прыходзькі.

Чытачу прадстаўлена заканчэнне гістарычнай драмы Уладзіміра Сыракомлі "Магнаты і сірата" (пераклад І. Багдановіч), у рубрыцы "Партрэты нашых ВНУ" распавядаецца гэтым разам пра Гродзенскі дзяржаўны універсітэт, працягваецца гарадзенская тэматыка ў артыкуле "Ведаць сваю гісторыю — належаць сваёй краіне" — Ірына Клімковіч знаёміць чытача з гродзенскай гістарычнай школай. Са старонак часопіса можна даведацца пра Ніла Гілевіча, якога раней не ведала Таццяна Кіявіцкая (яе артыкул называецца "Ніл Гілевіч, якога я не ведала"), Уладзімір Ягоўдзік распавядае, якія знакі на беларускім небе з'яўляліся ў XVI — XVIII стагоддзях, пісьменніку і вучонаму Міхасю Ганчарыку прысвечаны артыкул Кастуся Ладуцькі, Алесь Марціновіч аналізуе дзвюхмоўную кнігу Ізяслава Катлярова і Соф'і Шах.




## Новы імідж

Ліпеньскі "Нёман" паўстае перад чытачом у крыху зменены абліччы, і гэта датычыць не толькі знешняга афармлення — у часопісе з'явіўся новы раздзел "Всемирная литература в «Нёмане»". Гэтым разам ён прадстаўлены апавяданнем Жоржа Сіменона "Шаль" (пераклад з французскай мовы З. Краснеўскай) і нізкай вершаў Эдны Мілей (пераклад з англійскай Ю. Маслава).

Цікавыя і арыгінальныя празаічныя творы, змешчаныя ў нумары: раман Алега Ждана "Князь Мстиславский", кінааповесць Аляксея Дударава "Брестская крепость" і тры апавяданні Аляксандра Станюты. Як вядома, ужо распачаліся здымкі фільма паводле кінааповесці Аляксея Дударава, а чытачы "Нёмана" маюць магчымасць пазнаёміцца з творам задоўга да выхаду фільма на экраны. Праўда, і пра "Брестскую крепость", і пра раман А. Ждана паўнавартасную гаворку можна будзе весці толькі з выхадам наступных нумароў, у якіх маюць быць надрукаваныя заканчэнні.

Апавяданні А. Станюты "Дом офицеров", "Антек млоды", "Улица с кленами" прысвечаны ўспамінам юнацтва і маладосці. Апавядальнік апісвае падзеі з адлегласці перажытага, аднак у той жа час — вачыма сябе ранейшага. Менавіта такое спалучэнне робіць творы адметнымі, запамінальнымі. Пакідае аўтар і пэўную недасказанасць, нераскрытасць у сюжэце, што, зрэшты, адпавядае агульнай імпрэсіяністычнай танальнасці, у якой напісаны апавяданні. Лёгкая, светлая туга па тым, што вяртаецца ва ўспаміны, каб прынесці спатоленне, кранальная лірычнасць перададзены надзвычай выразна і лаканічна. Героі А. Станюты імкнуцца быць шчырымі перад самімі сабой, нібыта падкрэсліваючы гэтым патрэбу ў споведзі і дараванні, аднак іронія, якой прасякнуты ўсе тры апавяданні, нібы падказвае чытачу, што герой усё ж знайшоў "паразуменне" са сваім мінулым і з тымі людзьмі, якім не сказаў некалі самых галоўных слоў.

Прыемна ўражвае гэтым разам нёманская паэзія. Паэтычная нізка Раісы Баравіковай мае "нежаночую" назву "Счастье — злая ноша". Звычайна жанчыны перш за ўсё і нягледзячы ні на што імкнуцца да шчасця, а лірычная гераіня паэткі не толькі выказвае разуменне ілюзорнасці, прывіднасці людскога шчасця, але нават і скараецца гэтаму, сама згаджаецца замяняць радасць падманам радасці. Лірычны герой Міхася Башлакова шукае сваю "высокую долю". Нізка пад такой назвай уяўляе, па сутнасці, паэтычную малітву з некалькіх частак-вершаў. Герой моліцца за радзіму, за народ, за блізкіх людзей, а па-над усім гэтым —

*Пошли мне, Господи, страницу*
*Для искренних и чистых слов...*

Упершыню ў "Нёмане" змешчаны вершы Віктара Саланца, асноўная тэма нізкі "А он — живой!" — лёс чалавека на вайне. У памяці ўражлівага чытача, верагодна, застанецца верш "Солдат", у якім аўтар стварае парадаксальны малюнак:

*Под пулями солдат,*
*Приладив поудобней автомат,*
*Из банки уплетал консервы...*

І прафесійным гісторыкам, і проста аматарам роднай гісторыі цікавай будзе публікацыя Вячаслава Селяменева і Віталя Скалабана "Кирилл Мазуров — Пантелеймон Пономаренко. Беседы 1983 года", а таксама поўны тэкст мемуараў Івана Сініцкага "Новая Зеландия — Европа" (публікацыя У. Ягоўдзіка). Разнастайваюць нумар і нарысы Алеся Марціновіча і Барыса Нікітчыка, а таксама артыкул Анатоля Кудраўца пра асобу і творчасць Варлена Бечыка.

* * *

Чытаючы творы сучасных пісьменнікаў, усё часцей бачыш у іх сляды паспешлівасці. Як сучасны чалавек спяшаецца жыць, мабыць, так і пісьменнік спяшаецца завяршыць свой твор. Здараецца, што з-за гэтага ў вершы ці аповесці так і не з'явіцца самае галоўнае слова...

**Жанна КАПУСТА**

## Вера МІХНО

**Вера Міхно нарадзілася ў вёсцы Чэрцы Лепельскага раёна. Закончыла Мінскі дзяржаўны медуніверсітэт. Працуе ўрачом у Бараўлянах. Прафесія яе мае даўгавата-непаэтычную назву — отарыналарынголаг. А слых у маладой паэткі сапраўды надзвычай востры. Уласцівы яму і свае лагода, і цеплыня. А дзе ёсць свой слых, там ёсць і свой голас. Гэтым і жыве сапраўдная паэзія.**

**Казімір КАМЕЙША**

* * *

*Месяц белы ў зорным небе*
*І дарожка на вадзе*
*Адлівае чыстым срэбрам,*
*Ды куды яна вядзе?*

*У якую далеч-мару*
*Запаветную маю.*
*І адна ва ўсім абшары*
*Я на беразе стаю.*

*Паплыву, як бела лебедзь,*
*Па дарожцы гэтай я.*
*Можа знойдзецца дзе-небудь,*
*Можа стрэнецца дзе-небудзь,*
*Можа ёсць яна дзе-небудь*
*Доля белая мая...*

* * *

*Мы бавім час, марнуем час,*
*А час бяжыць, як той ручай.*
*І ён не пашкадуе нас,*
*Калі ў вачах нямы адчай!*

*Бо, стоячы на ТОЙ мяжы,*
*Чаму (не можам даць адказу)*
*На тое, чым так даражым,*
*Якраз і не хапіла часу?!*

* * *

*Бясснежны снежань дажывае*
*Дзянькі апошнія і ночы.*
*Прагноз ападкі абяцае,*
*Ды люд не бачыў снегу ў вочы.*

*Сплін парніковы сыпле неба,*
*Што выклікае сверб нервовы.*
*Ужо лепш дрыжыкі па рэбрах*
*І перастук зубоў здаровы.*

*Мацней бы ціскануў марозік,*
*Каб слёзы змерзліся на вейках,*
*Аздобіў шэранню бярозы*
*І, як на шлюб, убраў зямельку.*

*З яго пусціліся б у скокі,*
*Трушком імчаліся дахаты,*
*І смешна церлі вушы, шчокі*
*І ў ладкі пляскалі заўзята.*

* * *

*Сабой займацца — клопатная справа,*
*Ды калі хочаш быць другім цікавым,*
*Зрабіся перш цікавым для сябе.*

* * *

*Заранак свежы і ружовы.*
*Мароз траву пасерабрыў.*
*Яшчэ зялёныя дубровы*
*І толькі клёны,*
*што кастры.*

*Бадзёры холад у паветры.*
*Калючы ржэўнік на мяжы.*
*Як сірата, адзін на ветры*
*Рамонак кволенькі дрыжыць.*

* * *

*Здані,*
*здані ля каміноў*
*У дыме чорным,*
*Быцам гарэла ўсё не даўно,*
*А толькі ўчора.*

*Кветкі,*
*Кветкі кладуцца зноў*
*На камень цвёрды.*
*...Тры бярозкі наснілі сноў*
*Аб тым —*
*чацвёртым.*

### ДЗІВОСЫ ПРЫРОДЫ

*Халодны космас*
*Паблытаў межы.*
*Свет парніковым цяплом кануты,*
*Жартуе злосна:*
*Бясснежны снежань,*
*Адліжны студзень,*
*лагодны люты.*

* * *

*Колькі дарожак бясконцых*
*У розных кірунках вядуць,*
*Толькі цябе, маё сонца,*
*Я не змагу абмінуць.*

*Вызначу шлях без ваганняў,*
*Не заблуджуся нідзе.*
*Сэрца мяне да кахання*
*Лепей як компас, вядзе.*

*Згодна з табой*
*побач крочыць*
*Хоць па пякельных кругах.*
*І не імкнуся я збочыць,*
*Бо без кахання туга.*

*Ды не дамовішся з Богам,*
*Не прадугледзіш ніяк:*
*Кожны сваёю дарогай*
*Пойдзе ў апошні свой шлях.*

* * *

*Калі не хочаш*
*страціць годнасць,*
*Павінен, як закон, прыняць:*
*Душа —*
*інтымны дужа орган,*
*Яе не трэба агаляць.*

*Асцерагайся задаволіць*
*Цікаўных жэстам шчырасці,*
*З таемных слёз тваіх і болю*
*Так лёгка плёткам вырасці.*

## Валеры ПАЗНЯКЕВІЧ

### ПЕСНЯ ПАЛЕССЯ

*Гэй, Палессе маё, сінявокае!*
*Адгукніся, ці чуеш мяне?*
*Гэта песня твая пад аблокамі*
*Разам з птушкамі ў вырай плыве.*

*Над тваімі спрадвечнымі марамі*
*Восень бабіна лета прадзе,*
*Што плыве жураўлінымі парамі*
*Ў паднябессі, нібы па вадзе.*

*Восень-восень, навошта ты, мілая,*
*Мяне вабіш журботным крылом?*
*Лепш вясну прычакаю я з выраю,*
*Калі стрэне яе крыгалом.*

*І калі сакавік птушкай ранняю*
*Загукае натхнёна вясну, —*
*Я ўзгадаю Палессе світальнае,*
*З песняй той, што я ў сэрцы нясу.*

### ІВАНУ КУРБЕКУ

*Памяці пісьменніка, дзядзькі, дарадчыка*

*Няма ў аптэках ад плачу лекаў, —*
*Ліюцца слёзы, цякуць ракою.*
*Памёр мой дзядзька Іван Курбека,*
*Ад цяжкіх думак няма спакою.*

*Не стала творцы... Няма Курбекі.*
*За што для мовы такая страта?*
*Не б'ецца сэрца. Закрыты вейкі —*
*У бацькі раптам не стала брата.*

*А ён жа з мовай мяне сасватаў.*
*Сасватаў з музай мяне жывою.*
*Цяпер без дзядзькі — пустая хата.*
*Зямелька стала яго жаною.*

*Не думаў Янка, што гэтак хутка*
*Дзяды паклічуць да роднай хаты.*
*Што пахаваны ён будзе тутка,*
*Што прыйдзе ў госці да мамы й таты*

*У край, дзе словы на вуснах гралі,*
*Калі спраўлялі дзяды вячоркі.*
*Тут нават птушкі не так спявалі,*
*Калі знікалі на небе зоркі.*

*Я цешу думкі свае малітвай,*
*Каб дзядзькаў гумар*
*прыгадваць часам...*
*Памёр мой дзядзька*
*ў год мірных бітваў,*
*Падчас баталій за нафту з газам.*

*І слова: «крызіс» яго кальнула*
*Пякучай рыфмай. Сардэчным болем.*
*Жыццё ляцела. Любоў танула, —*
*Душа абрала палёт да волі.*

*Прымі, Айчына, рупліўца-сына.*
*Прымі, зямелька, яго, як брата.*
*І дай у скрусе гаючых сілаў*
*Усім, каго ён да мовы сватаў.*

### АБ ВЕЧНЫМ...

*Я хацеў бы памерці на вольнай зямлі*
*Ў час вясенніх дажджоў, час цвіцення,*
*Каб пялёсткі натхнёны*
*мой след замялі,*
*Каб накрылі труну сваім ценем.*

*Я хацеў бы памерці на роднай зямлі,*
*Што хадзьбою ў дарозе адмераў.*
*Дзе калоссем святла*
*жыццявеюць палі,*
*Усяляюць надзею і веру.*

*Я хацеў бы памерці на белай зямлі,*
*Пад тым небам, што бачыў вачыма.*
*Каб мяне жаўрукі*
*ў доўгі шлях правялі,*
*Той, адкуль прыляцець немагчыма.*

### ПАЛАНЯНКА

*Ты сягоння мая паланянка.*
*Я таксама ў палоне тваім.*
*З намі хваляй гуляе Зальвянка,*
*Над Зальвянкаю мы пастаім.*

*Пагаворым пра нашы спатканні,*
*Пра начныя сузор'і любві,*
*Што запальваюць сэрцы каханнем,*
*А ў вадзе — залатыя агні.*

*Дай руку мне сваю, калі ласка,*
*Працягні мне кахання руку.*
*Мы схаваемся разам у красках,*
*Пакуль хвалі бунтуюць раку,*

*Заблукаем у словах пяшчоты,*
*У абдымках духмянай расы,*
*Дзе ў суквецціях памятае цноты*
*Раскіданы твае валасы.*

*Ты сягоння — мая паланянка.*
*Я таксама ў палоне тваім.*
*Нас дваіх прытуліла Зальвянка.*
*Над Зальвянкаю мы пастаім.*

### МОВА

*Быццам хата старая, забітая,*
*Без нашчадкаў на роднай зямлі,*
*Проціць мова мая паўзабытая,*
*Каб яе мы, бы сцяг, узнялі.*
*І панеслі праспектамі, плошчамі*
*У жыццё, на вялікі прастор...*
*Словы мовы пад сонцам узрошчаны*
*І нясуць дабрыні харство*
*Той зямлі,*
*Што люляла, выпешчвала,*
*Словы ласкай сваёй і тугой...*
*Беларусь мая ў дзежцы замешвала*
*Мову з цестам, спявала на ёй.*
*Мова разам са мной гадавалася*
*І мяне закалыхвала ў сне.*
*Мова разам з кашулямі пралася*
*І была такой белай, бы снег.*
*Хто сказаў, што яна не прыдатная*
*Для размоваў у нашым жыцці?*
*Мова наша прыгожая, ладная,*
*І другой мне такой не знайсці.*

### РОЗДУМ

*Мой верш нямы —*
*Яго народ не чуе.*
*Глухі народ*
*Або народ нямы?*
*Ён не жыве ў хаціне,*
*Не начуе,*
*Каторы год вяртаецца з вайны.*
*Яна яшчэ палае ў кожным сэрцы,*
*Пад новазбудаванаю страхой.*
*І Беларусь, нібы ў палоне немцаў,*
*Схатынела і стала ўся глухой.*
*Я ведаю — не верш мой вінаваты,*
*А гэта я стаю, не бачу сам,*
*Як сябар мой пад кулі аўтамата*
*Ішоў і падаў,*
*Зноўку ўваскрасаў...*
*Ды толькі не ў жыцці,*
*А ў «пахаронцы»,*
*Якую нёс у вёску паштальён.*
*А я ўсё па старой той завядзёнцы*
*Крычу яму, але не чуе ён.*

### КРУГІ ЖЫЦЦЯ

*У шклянцы — недапіты дзень*
*Гучыць, бы голас твой, надрыўна.*
*За сонцам рухаецца цень,*
*Каб зданню зрынуцца з абрыва.*

*Малюе час свае кругі,*
*Малюе цыклы ў іншасвеце,*
*Каб перадаць жыццё другім,*
*Хто ў вершах рух кругоў прыкмеціў.*

*Хто абышоў кругамі лёс,*
*Той зразумее круг Айчыны,*
*Якім ідзе яна да кроз*
*З цяжкою думай за плячыма.*

*Яе кругі куды сталей*
*Чым тыя, што малюе дрэва*
*За час кароткі на ствале*
*Сваіх жыццёвых пераменаў.*

*І дзесьці там, ля тых кругоў*
*Мой лёс імклівы, чалавечы,*
*Як след ад леташніх стагоў*
*Ляжыць і думае аб вечным.*

Фота Кастуся Дробава

# Будзённае жыццё

Тацяна ГАРЭЛІКАВА

## Апавяданне

З самага ранняга рання біла вясёлае сонца ў вокны кватэры. І ён сёння быў бязмежна сонечны. Можна сказаць, шчаслівы. Пятніца, нарэшце. Ён стаяў у ванным пакоі, старанна галіўся і радасна пазіраў сам на сябе ў люстэрка. "Ці ж мне дасі сорак гадоў? Ад сілы трыццаць, — падумаў. — Нездарма ж такая маладзенькая закахалася... Іне — усяго дваццаць пяць. І сёння пасля работы..." Не мог схаваць сваю радасць. Аж жонка... Тупала, тупала ўсё вакол ды побач ды й сказала:

— Нешта ты сёння не такі, як заўсёды, — паглядзела на яго пільна, аж насцярожана.

— Чаму не такі? Такі, як заўсёды, — паспакайнеў ён. Ён даўно ўжо гаварыў розную няпраўду спакойна. Хоць дзе — хоць дома, хоць на працы. Усюды. З усімі. І з начальствам таксама. Хлусіць даводзілася часта, але ён даўно ўжо рабіў гэта з чыстымі вачыма. Выгадна: сказаў няпраўду — і ўсё на сваім месцы, і табе добра, і таму, з кім гаворыш, спакойна.

— Не, я ж бачу, ты нейкі сёння... Аж расцеш... — упарта вяла сваё жонка.

— Пятніца. Два выхадныя наперадзе, — спакойна сказаў ён.

Яму ўжо карцела хутчэй пайсці з дому. Прэч з жончыных вачэй. Бо тая будзе глядзець, глядзець і, нарэшце, аб усім здагадаецца. Яна праніклівая, ягоная жонка... Крутнуўся, апрануўся — і за дзверы.

— Што, Саша, вясна на вуліцы? — сказаў весела вадзіцелю, сядаючы каля пад'езда ў службовую машыну.

— Вясна, Генадзь Пятровіч! — пачціва, павярнуўшы да яго галаву, сказаў Саша.

І больш яны, пакуль ехалі, не гаварылі. Генадзь Пятровіч зноў згадаў Іну...

Ён лячыў у яе зуб. Сядзеў у крэсле, і яна, незнаёмая, была так блізка, так побач, маладая, вабная, і рукі ў яе такія далікатныя, пяшчотныя, што ён захваляваўся. Яны былі адны ў пакоі.

— Будзе балець раптам — прыходзьце, — пад канец лячэння ласкава сказала яна.

— Прыйду, — сказаў ён. І ўважліва, па-мужчынску паглядзеў на яе. Паклаў руку на сэрца: — Будзе балець — прыйду! — паглядзеў зноў, пільна, стараючыся ўгадаць яе паводзіны наперад. Пасмялеў. — Сёння ўвечары. Вы да васьмі?

— Да васьмі, — успыхнула яна.

— Вось у восем я буду чакаць каля паліклінікі.

І яна раптам сказала:

— Я на машыне. Мы можам куды-небудзь з'ехаць.

— Цудоўна! — узрадаваўся ён. Гэта было тое, што трэба. Пракурорская пасада вымушала асцярогі — многія, і яму незнаёмыя, яго ў гарадку знаюць. — Цудоўна! — паўтарыў ён і пацалаваў ёй руку. Падняўся з крэсла...

Так яны пачалі сустракацца...

Іна — маладзенькая, нявопытная, хоць і мае ўжо дачку, але жыве без мужа. Яе лёгка было абводзіць вакол пальца, нават у дробязях, яна ўсё, што ён казаў, брала на веру і побач з ім ажно зіхацела ад шчасця. І ён быў радасны і вясёлы з ёю, але ў той жа час гатовы, калі раптам што якое, тут жа разарваць з ёю ўсе адносіны...

Зайшоў у кабінет і перш за ўсё расхінуў на акне шторы. Ранішняе сонца азалаціла пакой. Зняў лёгкую куртку. Адамкнуў сейф. І вось ужо на стале стосы папер. І маўчыць пакуль, дзякуй Богу, тэлефон. Трэба шмат што зрабіць. Да паўдня работы пад завязку... Столькі спраў — і ў кожную ўнікнуць... Будзе адно прадстаўленне, другое. Пракурорскі нагляд. Строгі і паўсюдны...

Ён любіў працаваць раніцай. І калі не было наведвальнікаў ды найбольш маўчаў тэлефон, асноўнае, што трэба, рабіў да абеду.

Так і сёння было. Спярша прыняў двух наведвальнікаў, выслухаў кожнага, разабраўся з іхнімі справамі. Потым засеў за дакументы. Кожную справу бачыў і разумеў адразу, разумеў галоўнае, і пісалася яму лёгка і ўпэўнена...

Ён ужо тры гады як на пракурорскай пасадзе, і за гэты час, у стасунках з самымі рознымі людзьмі — ад самых розных злачынцаў, самых розных кіраўнікоў, да ўсялякага начальства, — набачыўся ўсяго, знаў у сваёй працы ўсе падводныя камяні ды рыфы, знаў, як не паслізнуцца, як выйсці сухім з вады ў любых абставінах. Карацей не жаўтароцік. Умеў ён з начальствам. Ён знаў, дзе сказаць, што сказаць і як, дзе прамаўчаць, дзе зрабіць выгляд, што не зразумеў, а дзе, калі раптам і не дапяў да чаго, дык хай думаюць, што ўсё яму ясна...

Час праляцеў хутка, і на абед, як заўсёды, ён паехаў дадому. У кватэры нікога не было, жонка на працы, сын у каледжы. Сеў за стол. Быў смачны абед. Ён успамінаў сёння часта Іну, але цяпер, седзячы за сталом, еў жончына варыва — яна добра гатавала, — і пра яе, жонку сваю, падумаў... Ён даўно прывык да яе і, нягледзячы ні на што, яму было спакойна з ёю. Тылы што трэба... Праўда, яна вельмі "актыўная", неяк сказала: "Калі б я, а не ты была пракурорам — я б сваё ўварвала...". А ўчора ўвечары, уже ў ложку, яна паведаміла: "А ў начальніка міліцыі новая дача... Казалі мне, такі катэдж адгрохаў... — прытулілася да яго. — Вось каб нам катэдж займець за горадам, а, Гена?".

Ён з ёю амаль заўсёды згаджаўся, амаль не пярэчыў. "Добра было б, канечне, катэдж займець за горадам", — пагадзіўся ён тады. У самога ж іншае было ў галаве. Але ён нічога не сказаў больш жонцы. Шмат гаварыць — прагаварыць. Можа, не спраўдзіцца...

Пасля абеду паехаў у раённы суд. Пакуль ехаў, успамінаў учарашнюю нараду ў вобласці. Па яго раёне заўваг вялікіх не было, наадварот, адзначылі, што раскрывальнасць злачынстваў добрая, большы працэнт, чым па вобласці. І колькасць злачынстваў знізілася — таксама пахвалілі... Абласны пракурор добра да яго ставіцца. І бачылася ўжо Генадзю Пятровічу новая пасада... Гэта тое, пра што ён не казаў жонцы... У абласной пракуратуры... А там... І ў рэспубліканскай... А што? Не Багі гаршчкі...

І да старшыні райсуда ён зайшоў бадзёры і ўпэўнены, пракінуліся словам з ім, ды й на пасяджэнне...

Судзілі сёння шаснаццацігадовага хлопца. Падлетка, можна сказаць. Шараговая кватэрная крадзежа... Але тут пры патуранні маці. Ён прызнаўся ёй, што ўгледзеў у суседзяў пад дываном ля дзвярэй ключ, відаць, ад кватэры, але яна не загадала яму: "Ты ж глядзі, не чапай яго! Хай ляжыць", а толькі пазласлівіла: "Хто зойдзе да іх — азалаціцца. Яны багатыя". Што называецца, падахвоціла... І той вынес з чужой кватэры грошы і шмат залатых ювелірных вырабаў, на вялікую суму, і ўжо спрабаваў збыць іх...

Суд пачаўся. Суд гаворыць. Усе па чарзе, каму трэба. І ўсе патрабавальныя, суровыя. І маці падлетка сядзіць у зале. Сярэдніх гадоў жанчына. У хустцы. Яна паварочвае галаву да таго, хто гаворыць, і, напятая, слухае, сціскаючы, бачна, насавік у руцэ. Усіх слухае, змізарнелая і ўчарнелая, з трывожным бляскам у вачах, з маўклівай мальбою: "Пашкадуйце...".

Нешта яна нагадвала пракурору, нешта сваё, даўняе, вельмі даўняе нейкае жыццё, і ён, недаўменны, сумніўны нейкі да самога сябе, пазірае час ад часу на яе, і нешта робіцца ў яго душы...

Нешта даўняе-даўняе ўспыхвае ў памяці, трывожыць...

Ён глянуў на падсуднага, на гэтага падлетка ў цеснаватым чорным касцюмчыку — і... сябе такога ж успомніў...

Яны жылі тады ўжо без бацькі (бацька быў шафёрам, трапіў у аварыю, загінуў), і мама, адна, без мужа, праз нейкі час зрабілася нейкай бездапаможнай і нават... злоснай...

Ён помніць. Ён усё помніць... І як мама паклікала яго аднойчы ўвечары да сябе, прамаўляючы: "А-а, тарбахваты! У іх усё ёсць.. Хай будзе і ў мяне... І я не горшая...". І як сказала яму: "Ідзі сынок, налаташы ў Мядзведзіхі яблыкаў... Белага наліву... Вазьмі кайстру... Толькі гляджы, каб ніхто не ўбачыў..."

Такое было ўпершыню. Дагэтуль мама заўжды наказвала яму: "Глядзі, не руш чужога!". І ён засумняваўся, выструніўся, пільна-пільна паглядзеў на маму — не, гэта яна сказала: "Налаташы ў Мядзведзіхі белага наліву...". І ён пайшоў, смелы і рашучы — мама ж сказала! — і хітры, асцярожны, каб жа не ўчула, не угледзела, не выскачыла з хаты Мядзведзіха... Цёмным вечарам пераскочыў суседчын плот і налаташыў вялікую кайстру крутабокага белага наліву, і прынёс дадому. І яны потым сядзелі ў хаце, на кухні, пры святле цьмянай лямпачкі дружна храбусцелі тымі яблыкамі, і мама, ацёхлая, таксама.... І ён тады, у той вечар, упершыню адчуў сябе не малым, не падлеткам... Ён нешта зразумеў. Нешта ў той вечар перайначылася ў ім. Гэта было нешта новае. Але зразумеў — выдатнік, ён хутка добра засвойваў новае...

І цяпер вось, на судовым пасяджэнні, яму ўспомніўся той белы наліў... Мама ўспомнілася. Іхняя тая, у той вечар, радасць... Гэта ён не хлопцу гэтаму цяпер вызначаць пакаранне будзе — гэта ён сябе, таго, даўняга, зялёнага, судзіць... І мама яго тут... Так-так, гэтая жанчына, маці падсуднага, што сядзіць, скамянелая, у зале, нечым падобная да ягонай маці... Тады, у юнацтве... Яна сядзіць нерухома, у яе ўскінута галава і мальбою свецяцца вочы...

Генадзь Пятровіч пасміхнуўся: яна спадзяецца невядома на што. Ага, добрыя дзядзькі сядзяць тут, у судзе... Адвёў ад яе вочы. Рашуча аслабаніўся ад згадак пра сябе, пра той белы наліў... Гэта было, але гэта маё, і нікому да гэтага ніякае справы...

Суд не маўчыць. Вось прыйшоў час, сказаў свае слова і ён, пракурор, — так, як заўсёды на судзе, строга і ўладна. Па законе.

Але пайшоў з таго суда, чамусь ніяк не могучы забыцца пра той белы наліў, пра тыя яблыкі... І маці сваю ўспомніў, якой ужо няма на белым свеце. Яна была тады такой жа затурканай, як маці гэтага падсуднага... Ён пасля школы паехаў у Мінск, вучыцца, ва універсітэт паступіў, а яна засталася ў вёсцы адна... І распілася... Ад гарэлкі памерла...

Сеў у машыну і цяжка ўздыхнуў. Нахмурыў бровы. Сказаў Сашу:

— У пракуратуру.

Там, у пракуратуры, у кабінеце, пагаварыў з памочнікам, даў яму даручэнні. Потым патэлефанаваў начальніку міліцыі Красачку, перагаварыў пра тэрміны разгляду некаторых спраў. А фанабэрысты гэты палкоўнік міліцыі, ніяк гэта не збіць з яго. Абламаю. Будзеш ты скакаць пад маю дудку. Паклаў, незадаволены, слухаўку. Зірнуў на гадзіннік — час ехаць у райвыканкам. На стале шмат папак. Прыбраў іх у сейф...

Ён зайшоў у кабінет намесніка старшыні райвыканкама, дакладней, намесніцы, засяроджаны і ўдумлівы. Дзелавы. Словам, цалкам адпавядаў свайму мундзіру. Яна пасадзіла яго, пачалі гаварыць пра нейкую там раённую нараду, што рыхтуецца, трэба, кажа, каб і пракуратура падключылася. Яны абмеркавалі, што зрабіць трэба яму, пракурору...

Яна, намесніца старшыні райвыканкама, таксама яму начальства. Ён быў з ёю ўважлівы, паважлівы, і гаварыў усё ў час і што трэба.

Далажыў пра учарашнюю абласную нараду — што раён пахвалілі па дзвюх пазіцыях, ды якіх пазіцыях — самых галоўных... Хай і яна знае. Быццам і яе нейкая заслуга ў гэтым. Дакладней жа, хай знае, які ў раёне пракурор... І падумаў пра яе: "Трэска на хвалях... Невядома, дзе ты будзеш заўтра... Не вечна ж на гэтай пасадзе... Куды цябе праз год-два прыб'е, да якога берагу — адзін Бог знае...".

Ну, вось і абгаварылі ўсё. Паціснуў працягнутую руку. Пайшоў.

Паехаў адразу дадому — працоўны дзень закончыўся. Адпусціў каля пад'езда машыну. Дома быў сын, ён сядзеў у сваім пакоі за камп'ютэрам. Сын вучыцца ў эканамічным каледжы, і добра вучыцца, настырны, такія, знаў бацька, не прападаюць. Пасля каледжа будзе універсітэт — сын мэту сабе паставіў, учэпісты. У маці пайшоў. Генадзь Пятровіч спакойны быў за сына. Надта не лез у яго жыццё, даваў, калі той прасіў, грошы, ведаючы, што ён на абы-што іх не патраціць. І сумніўных сяброў у яго не будзе. Хоць бы таму, што ў яго лепшы сябар — мама. У іх, у сына і жонкі, адчуваў ён, ёсць нейкія сакрэты, нешта яму недагаворанае... Ён адчуваў нейкую сваю далекаватасць ад сына, але знаў, што той не прападзе...

— Скажы маме, я пайшоў запісвацца ў басейн. У новы спартыўны комплекс.

Сын, не адрываючыся ад камп'ютэра, "ыгыкнуў".

Пераапрануўшыся ў цывільнае, Генадзь Пятровіч праз колькі хвілін быў ужо на сонечнай вуліцы. Трэба будзе заўтра ці калі пазней і сапраўды патэлефанаваць дырэктару гэтага спорткомплексу ды заказаць абанемент у басейн, гадзін на семвосем вечара. Будзе прычына пайсці з дому...

Ён сеў у аўтобус, "сямёрку", паехаў у процілеглы ад таго спорткомплексу бок, даехаў да самага канцавога прыпынку. Выйшаў з нешматлікімі незнаёмымі людзьмі і прайшоў яшчэ метраў трыста ад прыпынку. Каля бардзюра яго чакала светлая легкавая машына. За рулём была Іна...

І вось ужо едуць яны за горад, сядзяць у машыне моўчкі, але адчуваючы адно аднаго з паўслова, з пагляду. І неўзабаве праехалі невялікую вёсачку, за гэтай вёсачкай лес. Заехалі ў той лес, спыніліся за дрэвамі...

Расклалі ў машыне сядзенні, і машына была домам ім, прытулкам, і ўсё пачалося так ласкава і шчыра... Так доўга не маглі нацешыцца, ён з ёю...

Потым яна, супакоеная, шчаслівая, адчыніла багажнік, выняла адтуль пакеты, зачыніла багажнік, усё з пакетаў на яго расклала, і так смачна ўсё было, і столькі шчасця. Яны нават па кілішку гарэлкі ўзялі... Такая харошая гэта вясна! Птушкі вунь як спяваюць... Зеляніна... І яна, Іна, так блізка-блізка... І вось яны зноў у машыне, і зноў пачалося ў іх... Ах, як шчасліва на белым свеце жыць. Проста жыць...

А вярталіся назад, калі сонца ўжо вісела нізка. Вунь наперадзе невялікая вёсачка, у адну вулку, мінуць яе — а там і райцэнтр... Там расставанне...

Ён сядзеў на пярэднім сядзенні, і Іна была побач, такая маладая, прыгожая, і яму захацелася быць бліжэй да яе, і, хоць яна была за рулём, ён абняў рукой яе за плечы і пацалаваў у шчаку. Яна ласкава глянула на яго... Машына раптам непаслухмяна крутнулася ўправа, паімчала па ўзбочыне... Наперадзе вунь ідзе жанчына — Іна таропка піпікнула, жанчына быццам хістанулася, але чаму яна на адскокнула? Зачапіла яе машына? Збілі? Няўжо, збілі...

Іна на вачах збялела. Разгубленая, тармазнула. Ён зіркнуў вачыма ў адно бакавое шкло, у другое, у задняе шкло, наперад — пуста наўкола, нідзе нікога, ні душы... І ў хатах, што наводдаль, вокны сюды не глядзяць...

— Паехалі! — схапіў сяброўку за плячо. — Іна, паехалі! Не спыняйся!

І машына падпарадкавалася ёй — рванула з месца здарэння, мільганула па пустой кароценькай вулцы, і во ўжо выскачылі за вёсачку...

— Што мы нарабілі, Гена?! — разгублена сказал Іна, калі ўжо ехалі па пустой вузкай гравійцы.

— Што нарабілі? Будзеш цяпер перажываць? Плакаць? Што нарабілі — тое нарабілі, — сказаў ён, прыцішваючы ў сабе ўзбуджанасць.

Іна сядзела за рулём. Твар у яе збялеў. Яны хутка даімчалі да райцэнтра. Уехалі ў горад і на ўскрайку спыніліся.

— Што мы нарабілі, Гена?! — у роспачы сказала Іна. — І чаму мы не спыніліся, не завезлі тую нячасную ў бальніцу? Я ж доктар... Давай, Гена, вернемся! Можа, яна жывая... Без дапамогі сканае...

— Так! — па-мужчынску цвёрда, уладна сказал ён. — Лічы, не ты была за рулём. Я быў за рулём! Усё астатняе цябе не датычыць. Забудзь пра ўсё! Глухая вёска. Не было ніякіх сведкаў — я добра паглядзеў, — перавёў дыханне. Яго таксама ўжо брала роспач ад гэтага недарэчнага здарэння. Але падмяў самога сябе. — Супакойся, галоўнае, не было ніякіх сведкаў. І ты тут ні пры чым — я быў за рулём! Дарагая мая... А ёй не трэба было так напівацца, што аж пад машыну трапіла. Яна ж была п'яная!

— Ой, Гена, — усё яшчэ разгублена сказала Іна. Але і яна ўжо во паспакайнела. Выдыхнула шумна. Паправіла свае раскошныя светлыя валасы на галаве.

— Сустрэнемся, — сказаў ён. — Я пазваню.

Звыкла зірнуўшы ў бакавое шкло, направа, налева — ці няма знаёмых? — ён вылез з машыны. Іна паехала.

А ён пайшоў пехам. Да аўтобуснага прыпынку. А перад вачыма была тая кароценькая вясковая вуліца, уезд на яе. Дакладна, яна была пустая. І — цяжар з душы: ніхто не бачыў, яны хуценька з'ехалі адтуль. Дасць Бог, абыдзецца... Ну, а раптам... Людзі палкоўніка міліцыі Красачкі ўсюдыісныя, хутка раскручваюць... Але ж тут — дудкі. Сведкаў абсалютна ніякіх. Абсалютна. Калі ж, не дай Бог... Калі раптам... Канечне, не дай Бог... Але тады — яна была за рулём! Не я! Я пасажыр быў. Хоць і гэта пры маёй пасадзе па мне б'е, вядома ж, — не просты я пасажыр... Але ж, абыдзецца... Усё на тое..

Вось і "сямёрка"!. Паехаў...

Выйшаў ён з аўтобуса недалёка ад дому, за адзін квартал. Пайшоў. А вясна на вуліцы... Ах, якая вясна... Ужо зелянеюць дрэвы. Столькі паветра. Так дыхаецца. Столькі прастору. Аж распірае ад усяго грудзі... Ішоў няспешна, адчуваючы сябе маладым, здаровым і шчаслівым.

Ужо заходзіла сонца. Навакольле сцішвалася. І людзей на вуліцы мала. Ну, і добра. Толькі б не сустрэць каго-небудзь знаёмага. Чамусьці не хацелася нікога бачыць. Ні з кім знаёмым не хацелася гаварыць, ды й проста вітацца. Ён помніў яшчэ побач з сабою Іну і нёс у сабе радасць — хай яна будзе з ім хоць да парога кватэры. Бо там усё перамяшаецца, перамелецца, там будзе проста жыццё. Будзённае жыццё.

# Успамін пра букет

**Сталічная мастацкая галерэя "Універсітэт культуры" прапанавала ўвазе сваіх наведнікаў своеасаблівы букет, складзены з трох выстаў работ творчай моладзі.**



**"Intro".** Так называлася экспазіцыя работ маладой фотамастачкі Таццяны Вельт. Яе прылада — светлавы пэндзаль, яе палатно — лічбавая матрыца.

Карыстаючыся адмысловымі святлодыёднымі святільнікамі, доўгай вытрымкай фотаапарата, шклом і вадой, Таццяна стварае свой уласны "святлопіс". На фотаздымках Таццяны Вельт можна ўбачыць начны калейдаскоп неонавых агнёў, якія адлюстроўваюцца ў шкле куфляў і ператвараюцца ў ілюзорны свет эмоцый і прадчуванняў.

**"Пункт гледжання".** Назва гэтай выстаўкі, безумоўна, гаворыць сама за сябе. І — прываблівае. Бо пункт гледжання генерацыі дваццацігадовых на жыццё, на час і на мастацтва прадставілі гарэзлівыя калажы студэнтаў Інстытута сучасных ведаў. Многія з гэтых маладых творцаў з'яўляюцца лаўрэатамі фестываляў моды "Млын моды", "Мамант" ды іншых. Дарэчы, на ўрачыстым адкрыцці выставы адбыўся паказ мадэляў адзення, створаных студэнтамі, чые работы ўвайшлі ў "Пункт гледжання".

Свае па-філасофску глыбокія назіранні за студэнцтвам прэзентаваў прадстаўнік пакалення 40-гадовых, выкладчык Інстытута сучасных ведаў, вядомы беларускі графік Андрэй Скіцёў. На яго графічных аркушах, што чырвонай ніткай прайшлі праз студэнцкую экспазіцыю, увасоблены сцэнкі з жыцця маладых, партрэты сучасных юнакоў і дзяўчат, вучняў гэтага мастака.

**"Вясновыя святы"** — яшчэ адна, і вельмі самабытная, кветка ў букеце выставак. Студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў падрыхтавалі да яе творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, выкананыя пад кіраўніцтвам выкладчыкаў у вучэбных майстэрнях кафедры: кераміку, габелены, саломапляценне, вышыўку, мастацкае ткацтва і г.д. Адкрывалася экспазіцыя ў маі, таму не дзіўна, што ўсе ўключаныя ў яе творы аб'ядноўвала тэма вясны.

Выстава "Вясновыя святы" адлюстравала стрыманыя, някідкія фарбы роднай зямлі. Работы студэнтаў, што спецыялізуюцца ў народным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, заўсёды кранаюць жывой пяшчотай і свежасцю. У гэтых творах закладзены эстэтычныя ідэалы, узятыя ад майстроў мінулых часоў, якія імкнуліся сваім талентам, умельствам упрыгожыць сваё жытло, адзенне, свет вакол сябе.

**Сапраўды незабыўным** букетам сталіся вясновыя выставы галерэі "Універсітэт культуры". Розныя паводле жанраў і напрамкаў, яны прыцягнулі ўвагу шырокага кола гледачоў сваёй, уласцівай для маладых творцаў, пазітыўнай энергетыкай і святочнай прыўзнятасцю.

**Дзяніс БАРСУКОЎ**

*На здымках: стракатыя "пялёсткі" выставачнага букета.*

*Фота Віктара Кавалёва*

# Гендэль, Бах і купалаўцы

**Пры канцы чэрвеня, калі чарговы тэатральна-канцэртны сезон у сталіцы спакваля набліжаўся да завяршэння і публічнае творчае жыццё прыкметна пацішэла, на Малой сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы адбылася прэм'ера. І пафас гэтай прэм'еры сілкаваўся менавіта жыццём творчым, дакладней, роздумам пра яго адвечныя праблемы ды парадоксы.**



Пастаноўку п'есы Паўля Барца "Магчымая сустрэча" ажыццявіў беларускі рэжысёр Генадзь Мушперт, найперш вядомы сваёй адметнай працай (здаралася, што і ў якасці сцэнографа) на сцэне Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра. У выніку захопленага творчага працэсу з'явіўся на свет спектакль пад назваю "ГендэльБах", жанрава пазначаны як "вячэра без антракту паводле п'есы "Магчымая сустрэча". Гэта лёгка патлумачыць, калі ведаць змест камедыі Паўля Барца і задачу рэжысёра-пастаноўшчыка.

Вось што, у прыватнасці, пісаў аўтар п'есы, паводле якой адбываецца супольная вячэра славутага Георга Фрыдрыха Гендэля і на той час малавядомага Ёгана Себасцьяна Баха: "Камедыя "Магчымая сустрэча" грунтуецца на ўяўным сюжэце — прыдуманай сустрэчы Баха з Гендэлем у 1747 годзе з нагоды прыняцця Баха ў "Таварыства музычных навук", першым і адзіным ганаровым чальцом якога з 1745 года быў Гендэль. Насамрэч гэтыя кампазітары, нягледзячы на шматлікія паралелі ў іх біяграфіях, ніколі не сустракаліся, да таго ж Гендэль апошні раз прыязджаў у Германію толькі ў 1750 годзе — годзе смерці Баха. Астатнія ж факты, пры ўсёй адвольнасці іх інтэрпрэтацыі, цалкам аўтэнтычныя, у тым ліку і відавочнае нежаданне Гендэля асабіста сустракацца з Бахам, і неаднаразовыя спробы Баха пазнаёміцца з непараўнальна больш славутым калегам падчас яго прыездаў у Германію".

Стваральнік спектакля Генадзь Мушперт убачыў у гэтым драматургічным матэрыяле нагоду для разваг пра адваротны бок славы артыста, музыканта, усялякага творчага чалавека — пра тое, чаго проста не ведаюць і над чым не задумваюцца прыхільнікі талентаў. Сапраўды, камедыя камедыяй, а ў стасунках мастака і ўлады, мастака і дзяржавы, мастака і соцыуму, мастака і натоўпу, у стасунках мастака з мастаком і, урэшце, мастака з самім сабою, — столькі нежартоўных праблем! Так, усе яны сур'ёзныя, адвечныя і глабальныя. І назву "ГендэльБах" творчы чалавек без асаблівых тлумачэнняў успрыме арганічна — як намёк на пакутлівае задзіночанне і не менш пакутлівы разлад Таленту і яго Альтэр Эга.

У ролі Баха выступае Сяргей Краўчанка, Гендэль — Аляксандр Падабед, а дэбютант Сяргей Кавальскі ўвасабляе Шміта.

**Лана ІВАНОВА**

*На здымку: заслужаныя артысты Беларусі Сяргей Краўчанка і Аляксандр Падабед у ролях Ёгана Себасцьяна Баха і Георга Фрыдрыха Гендэля.*

*Фота Аляксандра Дзмітрыева*

# Музычная аўра Мсціслава

**Імклівае адраджэнне гістарычнай памяці і своеадметнай культуры нашага старажытнага горада Мсціслава неад'емнае ад фестывалю мастацтваў, якое ладзіцца тут па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Нядаўна ў гэтым цудоўным кутку Магілёўшчыны прайшло ўжо восьмае такое свята, арганізаванае славутым аркестрам пры дапамозе Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Магілёўскага аблвыканкама і яго ўпраўлення культуры, Мсціслаўскага раённага выканаўчага камітэта.**

Фэсты, якія праводзіць заслужаны калектыў краіны на чале з маэстра М. Фінбергам у невялікіх беларускіх гарадах і мястэчках, маюць агульную эстэтычна-асветніцкую скіраванасць, родняцца высокім творчым узроўнем, але абавязкова адрозніваюцца між сабой канцэптуальна. І гэта зразумела, бо кожная фестывальная праграма — непаўторная, грунтуецца на культурна-гістарычных каранях канкрэтнага рэгіёна і на яго сённяшніх рэаліях.

У чым жа унікальнасць фестывалю, які зрабіўся добрай штогадовай традыцыяй культурнага жыцця Мсціслава? У тым, што сярод шматлікіх праектаў Нацыянальнага канцэртнага аркестра ён адзіны прысвечаны выключна беларускай музычнай класіцы XX стагоддзя і, да таго ж, носіць імя аднаго з яе патрыярхаў — народнага артыста Беларусі Мікалая Чуркіна. Дарэчы, сёлета 22 мая споўнілася 140 гадоў з дня нараджэння гэтага адметнага кампазітара і педагога. І аркестр не прамінуў знамянальную дату, падрыхтаваўшы да фестывалю "Мсціслаў-2009" гожую прэм'еру — праграму пад назвай "Мікалай Чуркін. Вяртанне". Прагучала яна ў інтэрпрэтацыі добра вядомых музычных суполак, што працуюць у складзе вялікага калектыву: Камернага аркестра, Струннага квартэта, ансамбляў флейтыстаў, салістаў на драўляных духавых інструментах, кларнетыстаў, ансамбля трубачоў "Інтрада".

"Гонар прэзентацыі лепшых узораў нацыянальнага музычнага мастацтва, у тым ліку і першага выканання, і ўзнаўлення незаслужана забытых твораў, выпаў Мсціслаўшчыне нездарма, — разважае мастацкі кіраўнік фестывалю, народны артыст Беларусі Міхаіл Фінберг. — Менавіта тут нарадзілася першая беларуская опера савецкага часу "Вызваленне працы", напісаная Мікалаем Чуркіным у 1922 годзе, калі ён плённа працаваў у Мсціславе настаўнікам і кіраўніком мастацкай самадзейнасці. Сёння асабліва відавочна, што менавіта Мсціслаўшчына і, шырэй, Магілёўшчына далі Чуркіну той творчы імпульс, які дазволіў яму, ураджэнцу Каўказа і спадкаемцу традыцый рускай культуры, стаць сапраўдным класікам беларускага музычнага мастацтва, адным з пачынальнікаў нашай нацыянальнай кампазітарскай школы".

Развагі маэстра падхоплівае навуковы кіраўнік фестывалю, доктар мастацтвазнаўства Вольга Дадзіёмава: "Менавіта мсціслаўскія музычныя рэаліі ды фальклорныя скарбы гэтай зямлі натхнілі Мікалая Чуркіна на стварэнне такіх шэдэўраў, як сімфаньета "Беларускія малюнкі", творы для аркестра беларускіх народных інструментаў, камерныя інструментальныя і вакальныя творы, заснаваныя на беларускім фальклорным матэрыяле. Менавіта першыя беларускія ўражанні зрабіліся тым падмуркам, на якім потым узрос велічны будынак нацыянальнай музычнай школы, заснаванай Чуркіным, яго аднадумцамі і паслядоўнікамі на невычэрпнай ідэі фалькларызму, духоўнасці, гуманізму, што з'яўляюцца існасцю беларускага мастацтва і культуры".

♫ Святочны летні дзень у Мсціславе завяршыўся гала-канцэртам "У падарунак — песня". Гэтая праграма Нацыянальнага канцэртнага аркестра пад кіраўніцтвам М. Фінберга з удзелам лепшых салістаў калектыву, прысвечаная Году роднай зямлі і 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, прагучала на Цэнтральнай плошчы горада.

**Святлана БЕРАСЦЕНЬ**

*На здымках: помнік юнаму Пятру Мсціслаўцу, куток музея Мікалая Чуркіна ў Мсціслаўскай цэнтралізаванай дзіцячай школе мастацтваў, якая носіць яго імя; Ансамбль салістаў на драўляных духавых інструментах Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі.*

*Фота Віктара Кавалёва*

**Пайшоў сто шосты год з дня нараджэння Мікалая Набокава (1903 — 1978) — кампазітара, пісьменніка, чалавека надзвычайнай дынамічнасці і "ўсенапрамкавай" дзейнасці ў свеце мастацтваў. Імя Мікалая Дзмітрыевіча стаіць у вялікім слоўніку "Лярус" перад імем яго стрыечнага брата, пісьменніка Уладзіміра Набокава.**

# Набокаў застаўся беларусам

Нарадзіўся Мікалай Набокаў у мястэчку Любча, што ў дваццаці кіламетрах ад Навагрудка. Маці Мікалая, Лідзія Фальц-Фейн, наведаўшы замак у Любчы (у мінулым — рэзідэнцыя князёў Гогэнлоэ), упадабала яго з першага погляду і купіла разам з прылеглымі 3 500 дзесяцінамі зямлі. Ды і як было не палюбіць гэтыя мясціны? На тэрыторыі маёнтка раскінуўся неабдымны лес, у гушчары якога хавалася таямнічае возера Кромань. Сярод мноства легенд, што луналі вакол яго, адной з самых вядомых была легенда пра вёску, зніклую ў азёрнай вадзе, і пра царкоўныя званы, гучанне якіх даносіцца з глыбіні.

Дзмітрый Набокаў развёўся з жонкай, калі іх сыну Мікалаю было толькі тры гады. Маці выйшла замуж за суседа па маёнтку, Мікалая фон Пэйкера, які для яе стаў адданым мужам, а для дзяцей — добрым, справядлівым, любым дзядзькам Кало.

У сям'і вялікая ўвага надавалася адукацыі. Прачыналіся а восьмай. А палове дзевятай спускаліся ўніз да снядання. Па сняданні пачыналіся гадзіны "класаў". Штодзённа даводзілася складаць з літар словы на трох ці чатырох мовах, вучыць вершы па-руску, па-французску, па-нямецку. У родзе Набокавых увогуле вялікае значэнне надавалі вывучэнню замежных моў. Гувернантак выпісвалі з Францыі, Англіі, Германіі. Было прынята размаўляць некалькі дзён у тыдзень толькі па-французску, потым некалькі дзён па-нямецку. Толькі ў нядзелю размаўлялі па-руску. Абавязковымі былі таксама заняткі музыкай, жывапісам і спортам. Паводле ўспамінаў Мікалая Набокава, ці Ніка, як яго клікалі ў сям'і, дом быў заўсёды напоўнены музыкай. Маці вельмі любіла граць на фартэпіяна. Увечары з замка чуліся гукі скрыпкі: гэта брат і сястра Мікалая выконвалі п'есы Ф. Крэйслера і З. Фібіха.

У маёнтку быў тэнісны корт. Дзеці мусілі займацца тэнісам, верхавой яздой і плаваннем. Але спорт не вельмі цікавіў Мікалая. Тэніс здаваўся яму бязглуздым заняткам, а коннік з яго так і не атрымаўся. Толькі катанне на лодцы па Нёмане ўспрымалася як сапраўднае задавальненне. Акрамя абавязкаў, былі, вядома ж, і святы, якія ў Набокавых адзначаліся шырока. Летам у Любчу наведвалася шмат гасцей. Многія прыязджалі на некалькі тыдняў, а то і месяцаў. Да асабліва ўрачыстых нагод ладзілі феерверкі, запрашалі музыкантаў. Дзяцінства было такім ідылічным і шчаслівым, што маленькаму Ніку здавалася, нібы песня гучыць паўсюль. "Спявалі сяляне на сенакосе, даяркі, што завіхаліся з каровамі, спявалі жаўрукі ў нябёсах, і нават толькі што злоўленыя ракі выпускалі ледзь чутны меладычны свіст", — пісаў М. Набокаў ва ўспамінах.

Увосень 1911 г. Мікалай пераехаў у Санкт-Пецярбург. І менавіта тут нарадзіўся яго першы твор — "Калыханка" для фартэпіяна, навеяная каўказскімі і ўсходнімі матывамі, напісаная да дня нараджэння маці.

У 1914 г. Мікалай Набокаў вытрымлівае экзамены ў Імператарскі Аляксандраўскі ліцэй, той самы, дзе вучыўся А. Пушкін. Адначасова ён пачынае асвойваць чытанне аркестравых партытур. Юны Набокаў рэгулярна наведвае сімфанічныя канцэрты, Марыінскі оперны тэатр і Александрынку. Сярод яго першых музычных захапленняў Э. Грыг, А. Скрабін і Ф. Шапэн. Ён можа гадзінамі сядзець за раялем, граючы "Танец Анітры", "Смерць Азэ" і — пазней — Канцэрт для фартэпіяна фадыез мінор ці "Паэму агню". У іх доме на Фантанцы маці рэгулярна ладзіць прыёмы і званыя абеды, на якіх збіраецца да сарака чалавек. Але лета абавязкова бавяць у Любчы.

У 1917 г. у сувязі з небяспечнай сітуацыяй у Петраградзе Набокавы пераязджаюць у Ялту. Там Мікалай сур'ёзна пачынае займацца кампазіцыяй з Уладзімірам Іванавічам Рэбікавым, вучнем П. Чайкоўскага. Але гэтыя заняткі не былі доўгімі. Сям'я пераязджае ў Севастопаль, а потым з сям'ёй Сяргея Набокава (дзядзькі Мікалая) на борце "Трапезунда" адплывае з Расіі. "Маці плача. Гаротная, гаротная мая. Знерваваная, бездапаможная. Я прытуляюся да яе. Цалую яе рукі. Яна гладзіць мяне па галаве і ўсміхаецца праз слёзы... Нада мною — зоркі. Перада мною — мора, бяскрайняе, неабсяжнае...", — успамінаў М. Набокаў.

Сям'я апынулася ў Берліне, дзе Мікалай з маці пасяліліся непадалёк ад дзядзькі Уладзіміра (бацькі будучага пісьменніка У. Набокава). У сваёй кватэры дзядзька Уладзімір і цётка Лёля здолелі адрадзіць той дух багацця і інтэлектуальнасці, які вылучаў іх дом у Пецярбургу. Абое былі шырока адукаваныя, з выбітным розумам. А Мікалая радніла з дзядзькам Уладзімірам тое, што ў адрозненне ад большасці Набокавых ён вельмі любіў музыку. Кожную нядзелю Ніка з дзядзькам наведваліся на рэпетыцыі Берлінскага філарманічнага аркестра і потым усчыналі абмеркаванне. Неўзабаве Мікалай ведаў увесь асноўны тагачасны рэпертуар. Пазней яго запрасілі працаваць канцэртным аглядальнікам у штодзённік "Руль". Гэта дало магчымасць наведваць канцэрты лепшых выканаўцаў, якія прыязджалі ў Берлін.

Пэўны час Мікалай вучыўся ў Акадэміі музыкі ў Штутгарце. Кола яго стасункаў пашыралася. Ён сустракаўся з Сяргеем Ясеніным і Айседорай Дункан, пазнаёміўся з графам Гары Кеслерам — выдаўцом, аматарам мастацтва, на віле якога Мікалай Набокаў бавіў шмат часу разам з Райнерам Марыяй Рыльке, Андрэ Жыдам, іншымі прадстаўнікамі багемы.

У канцы 1920-х М. Набокаў пераязджае ў Парыж і неўзабаве, пасля знаёмства з Сяргеем Дзягілевым, атрымлівае ад яго запрашэнне ў Монтэ-Карла для пастаноўкі балета "Ода". Харэографам-пастаноўшчыкам быў Мясін. Праца ішла даволі хутка, але не без цяжкасцяў, непазбежных для маладога кампазітара. На працягу трох сутак перад прэм'ерай усе жылі ў стане ліхаманкавага вар'яцтва: мастакі дараблялі дэкарацыі, Мікалай начыста перапісваў партытуру, Дзягілеў асабіста сачыў, як крояць і шыюць касцюмы. Прэм'ера "Оды" прайшла з вялікім поспехам! А ў Мікалая, акрамя славы, з'явіўся новы сябра — Ігар Стравінскі. І хаця маэстра быў старэйшы і больш славуты, яны вельмі пасябравалі. Усё жыццё яны дасылалі адзін аднаму паштоўкі з розных куткоў свету, а калі былі сустракаліся — гралі ў чатыры рукі на фартэпіяна, шмат часу бавілі ў размовах.

Пасля "Оды" М. Набокаў напісаў балеты "Афрадыта" і "Вальсы Бетховена". Аднак на пачатку 1930-х у Парыжы справы не надта ладзіліся. Фірма "Плеель" збіралася закрыць часопіс "Musique", дзе Мікалай працаваў памочнікам галоўнага рэдактара. Заказаў на стварэнне музыкі да спектакляў і фільмаў рабілася ўсё менш. І вось — прыйшло запрашэнне з Фонду Барнса ў Амерыцы прачытаць цыкл лекцый пра мастацтва. 9 жніўня 1933 г. Мікалай Набокаў са сваёй жонкай Наталляй Шахаўской адплывае ў Нью-Йорк.

Праз год ён стварыў два балеты для трупы Базіля: "Жыццё Палішынеля" і "Юніён пасіфік", напісанне якога заняло толькі 23 дні, аднак менавіта гэты твор меў найбольшы поспех з усяго рэпертуару, і трупа выступала з ім па ўсёй Амерыцы, па Еўропе, паўсюдна выклікаючы захапленне.

У верасні 1936-га М. Набокаў далучаецца да штата выкладчыкаў Уэлс-каледжа, дзе працуе на працягу пяці год. Калі з мая 1940 г. у ЗША скіравалася плынь эміграцыі, Мікалай Дзмітрыевіч, адметнай рысай якога заўсёды было ўменне сябраваць, стараўся быць карысным для сваіх еўрапейскіх сяброў. Ён дапамог уладкавацца ва Уэлс-каледж Паулю Хіндэміту і Жаку Марытэну, забяспечыў іх амерыканскімі візамі.

Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны М. Набокаў (з 1945 па 1947) працуе культурным дарадцам Амерыканскага вайсковага ўрада ў Германіі і на гэтай пасадзе набывае рэпутацыю найактыўнейшага дзеяча заходняй культуры. З 1951 па 1965 год ён з'яўляецца арганізатарам мастацкіх фестываляў пад эгідай "Кангрэса культурнай свабоды". Першы фестываль "Мастацтва XX стагоддзя" адбыўся ў Парыжы (1952), другі — "Музыка нашага часу" — у Рыме (1954). Потым былі фестывалі ў Токіо, Нью-Дэлі, Берліне. У Лондане ў 1951 г. выйшла яго кніга ўспамінаў "Old friends and new music". А ў 1975 г. у Парыжы — кніга "Касмапаліт" ("Багаж").

Смерць заспела Мікалая Дзмітрыевіча за заканчэннем музычнага твора, які прызначаўся для чарговага фестывалю. 15 красавіка 1978 г., з прычыны смерці М. Набокава, лонданская "Times" пісала, што ён быў чалавекам разнастайных талентаў, высакароднай душы і вялікай асабістай прывабнасці.

Свету ён падараваў шэсць балетаў, тры сімфоніі, дзве оперы і значную колькасць іншых твораў. А ў сваёй кнізе мемуараў "Багаж" гэты сусветна вядомы касмапаліт напісаў: "...Беларусь поўнілася непаўторным ціхім хараством. Асабліва гэта датычыць тых мясцін, дзе жылі мы. Там вырасла мая нязменная любоў да гэтых мясцін, асаблівая, дзіўная любоў — з адценнем смутку і безнадзейнасці, любоў бясконца пяшчотная і пазбаўленая горычы. Я ўпэўнены — кожны, хто наведаў Беларусь, пранікаўся да гэтага краю пачуццямі, падобнымі да маіх. Сам я, што б ні здарылася, да канца дзён сваіх застануся беларусам. Для мяне гэта адзіны спосаб захаваць сувязь з далёкай і недасяжнай зямлёй".

**Вольга ГОМАНАВА**

**У сваёй кнізе мемуараў "Багаж" гэты сусветна вядомы касмапаліт напісаў: "...Беларусь поўнілася непаўторным ціхім хараством. Асабліва гэта датычыць тых мясцін, дзе жылі мы. Там вырасла мая нязменная любоў да гэтых мясцін, асаблівая, дзіўная любоў — з адценнем смутку і безнадзейнасці, любоў бясконца пяшчотная і пазбаўленая горычы. Я ўпэўнены — кожны, хто наведаў Беларусь, пранікся да гэтага краю пачуццямі, падобнымі да маіх. Сам я, што б ні здарылася, да канца дзён сваіх застануся беларусам. Для мяне гэта адзіны спосаб захаваць сувязь з далёкай і недасяжнай зямлёй".**

# Жывапіс? Іншасвет...

**У мастацкай галерэі "Vilnius", што месціцца ў сталічнай бібліятэцы № 18, прайшла персанальная выстава Віктара Васюкевіча "Колерамузыка".**

Жывапіс Віктара Васюкевіча для беларускага мастацтва — з'ява выключная. Яго абстрактныя палотны, насычаныя неверагодна моцнай энергетыкай, не пакідаюць гледача абыякавым, нават калі ён далёкі ад усялякіх авангардных тэндэнцый. Гэтыя незвычайныя карціны ўзрушваюць, зараджаюць, засмоктваюць, ускружваюць галовы ды абуджаюць душы. Знаходжанне ў мастацкай прасторы выставы ўводзіць у своеасаблівы гіпноз, зацягвае ў іншасвет. І таму вернісаж стаўся для яго наведнікаў падзеяй проста незабыўнай.

Да самага моманту адкрыцця экспазіцыі прысутныя заставаліся ў недасведчанасці і запытальна чакалі, сабраўшыся ў фае бібліятэкі. І вось дзверы расчыніліся, людзі пацягнуліся ў галерэю і былі агаломшаныя двойчы: па-першае, сутыкнуўшыся з невядомай для сябе сферай мастацтва, а, па-другое, пабачыўшы арыгінальную імпрэзу ў выкананні тэатра "Мімоза", які працуе пры ўстанове "Інвацэнтр" Беларускага таварыства інвалідаў. Карагод незвычайных артыстаў у жоўтых строях нагадаў своеасаблівую містэрыю, што сімвалізуе надыход вясны. Разняволеная і загадкавая атмасфера палотнаў В. Васюкевіча сталася надзвычай спрыяльным фонам для тэатралізаванай дзеі, і — дзіва! — калі пачаў выконваць свае рамансы музыка Аляксей Крэчат, удзельнік колішняга "Еўрафэсту", гледачы пабраліся парамі і пачалі таньчыць, нібыта на святочным вечары. Прынамсі, мне такога эфекту ад убачанага на вернісажы дагэтуль не даводзілася назіраць.

Наогул, выстава "Колерамузыка" мела на мэце як мага шырэй прадставіць творчасць таленавітага мастака Віктара Васюкевіча. Асноўная частка экспазіцыі — 33 жывапісныя работы, напісаныя ім за апошнія тры гады. Гэтую лінію ў творчасці мастака цяжка суаднесці з пэўным напрамкам, бо Віктар паўстае тут абсалютным наватарам. Яго стыль можна назваць абстрактным экспрэсіянізмам, эзатэрычным жывапісам, мастацтвам "ньюэйдж", ды найбольш трапным падаецца яго ўласнае вызначэнне: "Мой жывапіс — гэта спроба матэрыялізацыі музыкі". Калі ідэі духоўнага настаўніка з Індыі Шры Чынмоя памножыць на творчую апантанасць Вінсэнта Ван Гога, дык мы атрымаем асобу Віктара Васюкевіча — новую велічыню ў, пэўна ж, не толькі беларускім, мастацтве.

Глядач таксама азнаёміўся з авангарднымі, але больш фігуратыўнымі вопытамі мастака, з рэалістычнымі пейзажамі і нацюрмортамі, спробамі ў партрэце, з акварэлямі, а таксама з цікавай эксперыментальнай графікай, скіраванай на развіццё абстрактнага мыслення.

**Алесь СУХАДОЛАЎ**

***На здымках: мастак Віктар Васюкевіч і яго жывапіснае палатно "Вока Сусвету".***

***Фота аўтара***

# Аўтар «Помнікаў беларускага пісьменства»

**У вераснёўскім і кастрычніцкім нумарах часопіса "Маяк" за 1845 год пад адной рубрыкай "Помнікі беларускага пісьменства" былі надрукаваны два артыкулы Льва Кавеліна. Першы прысвечаны "Энеідзе навыварат", а другі "Рабункам мужыкоў" Яна Баршчэўскага. Калі не лічыць кароткага артыкула Іосіфа Цытовіча, гэта першыя публікацыі ў расійскай перыёдыцы, прысвечаныя беларускай літаратуры. Што мы ведаем пра іх аўтара?**

МАЯКЪ.

ЖУРНАЛЪ
СОВРЕМЕННАГО ПРОСВѢЩЕНІЯ,
ИСКУССТВА
и
ОБРАЗОВАННОСТИ,

Леў Аляксандравіч Кавелін нарадзіўся ў 1822 годзе, вучыўся ў першым маскоўскім кадэцкім корпусе, які закончыў у 1840 годзе. Пасля гэтага ён дванаццаць гадоў служыў паручнікам, а потым капітанам у прэстыжным лейб-гвардыі Валынскім палку. Яшчэ ў перыяд службы ён славіўся між таварышамі як кніжнік і літаратар, цікавіўся гісторыяй, пісаў вершы, добра ведаў польскую і ўкраінскую мовы. Літаратурны дэбют Льва Кавеліна адносіцца да 1839 года, калі ў "Часопісе для чытання выхаванцаў ваенна-вучэбных устаноў" быў надрукаваны яго верш, прысвечаны барадзінскім манеўрам. Потым ён блізка сыходзіцца з выдаўцом "Маяка" Бурачком, якому дапамагае рэдагаваць часопіс і сам у ім друкуецца. У складзенай пазней занатоўцы "Мае пасільныя працы з 1838 па 1872 год" Кавелін успамінае: "Я кіраваў раздзелам вершаў у "Маяку" і прыцягнуў да ўдзелу ў ім з таварышаў — здольнага аднакашніка і аднапалчаніна Д. Пацукевіча, а з знаёмых — доктара Шаўцова і Шарша". Па прозвішчы Пацукевіча мы можам меркаваць, што ён быў выхадцам з Беларусі.

Публікацыю "Энеіды навыварат" малады афіцэр прысвяціў беларускаму гісторыку і этнографу Івану Пятровічу Барычэўскаму, з якім разам супрацоўнічалі ў "Маяку". У "Ілюстрацыі" Зотава Кавелін друкуе "Нарысы Арыенбаума" і пераклад "Нарыса паўночнай Беларусі" Яна Баршчэўскага. Надрукаваны ў "Незабудцы" пераклад псіхалагічнага рамана Штымлера "Душа ў сухотах" дае падставу сцвярджаць, што перакладчык Кавелін быў знаёмы з Баршчэўскім, а супрацоўніцтва з "Маяком" і "Ілюстрацыяй" — выданнямі, у якіх у гэты час друкаваўся беларус Павел Шпілеўскі — дазваляе меркаваць, што іх творчыя шляхі недзе перасякаліся. Здавалася б, наперадзе ўдалая вайсковая кар'ера і светлая літаратурная будучыня...

І раптам, у 1852 годзе бліскучы капітан лейб-гвардыі Леанід Кавелін мяняе гвардзейскі мундзір на расу манаха і становіцца паслушнікам Оптынай пустыні Леанідам. Што падштурхнула яго да гэтага ўчынку? Вядомы літаратуразнаўца Генадзь Васільевіч Кісялёў знаходзіў паралелі між падзеямі, апісанымі Львом Талстым у "Айцы Сергіі" і ўчынкам Леаніда, тым больш, што класік для вывучэння быту манахаў наведваў Оптыну пустынь. Безумоўна, прыгожая версія. Але, мне здаецца, усё значна прасцей. Калі мы пачытаем змешчаны ў т. 16 "Маяка" за 1844 год артыкул Кавеліна "Варожыя дзеянні злых духаў супраць чалавека" і яго іншыя працы духоўнага зместу, то зразумеем, што ўсё сваё свядомае жыццё ён рыхтаваў сябе да служэння Богу. І што менавіта ў гэтым служэнні Леанід раскрыўся, як творца, духоўны пісьменнік і царкоўны дзеяч. У 1857 годзе ён быў пастрыжаны ў манахі, у 1863 годзе прызначаны кіраўніком расійскай духоўнай місіі ў Іерусаліме з узвядзеннем у сан архімандрыта. Пазней быў настаяцелем рускай канстанцінопальскай пасольскай царквы, настаяцелем Уваскрэсенскага манастыра Новы Іерусалім і, нарэшце, намеснікам Сергіевай лаўры. Пагадзіцеся, дастойная духоўная кар'ера. Адначасова архімандрыт Леанід займаўся даследчыцкай і пісьменніцкай дзейнасцю, быў вядомы як пладавіты гісторык і палеограф, падтрымліваў сяброўскія сувязі з Бадзянскім ды іншымі вучонымі. Да гэтага часу спецыялісты звяртаюцца да яго капітальных работ "Агляд Казельскага Оптына манастыра і быўшых у ім да пачатку XVIII стагоддзя храмаў", "Каталог старадрукаваных і рэдкіх кніг бібліятэкі Козельскай Оптынай пустыні", "Апісанне рукапіснага збору графа А. Уварава", "Аб радзіме і паходжанні глаголіцы і аб яе адносінах да кірыліцы". Кавелін нямала зрабіў для выяўлення і вывучэння айчынных культурных каштоўнасцяў у замежных зборах, у прыватнасці на Афоне.

На жаль, поўнага спісу артыкулаў, нарысаў і кніг Леаніда няма ў друку. Самымі каштоўнымі для нас з'яўляюцца два артыкулы І. Корсунскага "Намеснік Сергіевай Лаўры архімандрыт Леанід" і "Успаміны аб айцы архімандрыце Леанідзе". Іх аўтар асабіста ведаў Леаніда і карыстаўся яго ўласнаручнай занатоўкай "Мае пасільныя працы з 1838 па 1872 год". Незадоўга да смерці Леанід вёў з І. Малышэўскім палеміку па пытанні аб паходжанні князя Вольгі. Памёр архімандрыт Леанід у 1891 годзе.

Як мы бачым, Леанід быў вельмі неардынарнай асобай і мае вялікія заслугі перад беларускай культурай і нашым літаратуразнаўствам. Хочацца, каб прарочыя словы, напісаныя ў прадмове да "Энеіды навыварат", помнілі і нашы чытачы: "Усе адукаваныя рускія даўно ўжо зразумелі неабходнасць вывучэння беларускай даўніны і пісьменнасці. Але дагэтуль яна застаецца краем некранутым, у той час, як і яна багатая не меней за іншых. Што ж ўтрымлівала асвечаных крывічоў? Іржывы сорам за сваю радзіму: "Куды ёй да іншых!". Дай Бог, каб з лёгкай рукі г. Цытовіча гэты артыкул паслужыў добрым пачынам будучых поспехаў паэзіі, гісторыі і пісьменнасці Белай Русі, без якой паэзія, гісторыя і пісьменнасць усяе Русі ёсць і будзе аднабаковай і не поўнай". *Выдавец Маяка.* (1843 г., т. 9, кн. XVII, Смесь, стар. 37).

**Аляксандр ВАШЧАНКА**

# Патрыёт Украіны, сябар Беларусі

***Штрыхі да партрэта У. Сасюры (1898 — 1965)***

**Уладзімір Сасюра быў шчырым сябрам Беларусі, называў яе сінявокай сястрой Украіны. З вялікай сімпатыяй пісаў пра нашых творцаў, Максіма Багдановіча параўноўваў з Міхаілам Лермантавым. Часта наведваў нашу краіну, з многімі сябраваў, таму невыпадкова называў У. Дубоўку сябрам, А. Александровіча — братам. Балела яго чалавечнае сэрца па М. Чароту, Ц. Гартнаму, А. Дудару, па ўсіх ахвярах 30-х гадоў.**

*Штрых першы:* па сваім нацыянальным паходжанні ён не ўкраінец. Па бацьку — француз, пра што, дарэчы, сведчыць прозвішча, якое ўяўляе сабой украінізаваны варыянт французскага *дэ Сасюр*; маці ж яго была мадзьярка.

*Штрых другі:* падчас грамадзянскай вайны У. Сасюра служыў дабравольцам украінскага войска.

*Штрых трэці:* ён паспяхова перажыў крывавага дыктатара, які так метадычна патрабаваў вышукваць і караць "ворагаў народа", яшчэ й быў узнагароджаны яго ж прэміяй у 1948 годзе за зборнік "Каб сады шумелі" (1947). Але раптам пільны таталітарны рэжым пачаў бэсціць свайго лаўрэата за верш "Любіце Украіну", створаны яшчэ ў 1944-м і змешчаны якраз у тым *прэміраваным* і таму, здавалася б, недатыкальным зборніку. У звязку з вершам "Любіце Украіну" фігуравала так званая "справа Сасюры". А верш, які трапіў у апалу, як кажуць, бясскрыўдны, такі светлы і аптымістычны, у ім нават матыў дружбы народаў прысутнічае, ды не ў той, не ў традыцыйнай па тым часе паслядоўнасці выказаны інтэрнацыянальнае і нацыянальнае пачуцці: Юначе! Хай буде для неі твій сміх, / і сльози, і все до загину... / Не можна любити народів других, / коли ти не любиш Вкраїну!..

Спагадлівы лёс У. Сасюры даў яму дажыць да хрушчоўскай "адлігі" і атрымаць у 1963-м Дзяржаўную прэмію УССР імя Т. Р. Шаўчэнкі за кнігі паэзіі "Ластаўкі на сонцы" і "Шчасце сям'і працоўнай".

Штрых чацвёрты — апошні — да неардынарнага партрэта: У. Сасюра быў камуністам з 1920 года. Ён з'яўляўся аўтарам кніжак: "Чырвоная зіма" (1922) — пра гераіку кастрычніцкіх падзей і грамадзянскай вайны; "Днепральстан" (1930), "Новыя вершы" (1937), "Жураўлі прыляцелі" (1939) — пра будаўніцтва сацыялізму ва Украіне. Былі ў яго і кнігі пра подзвігі на Вялікай Айчыннай вайне, і пра мірную працу. Была і паэма "ГПУ", былі вобразы накшталт "Цвіце Чырвона Украіна", публіцыстычная тарабаршчына: "Безсмертна воля ВКП", трапляліся рыфмы "Ілліч — клич" і г.д. "Прыстасаванец! Двурушнік!" — можа падумаць хтосьці. Ах, гэты паспешлівы суд!.. У хрэстаматыі ўкраінскай літаратуры і літаратурнай крытыкі XX стагоддзя "Украінскае слова" (1994) можна прачытаць пра дваістасць У. Сасюры, выкліканую цяжкім унутраным канфліктам, — гаворка ідзе пра барацьбу ў асобе паэта дзвюх сіл — свядомасці і пачуцця, розуму і сэрца.

Сучаснаму чытачу не так цікава ведаць, калі і хто ў гэтай неардынарнай асобе перамагаў — сардэчны ўкраінец з глыбокім нацыянальным пачуццём ці камуніст. Важна іншае — тое, што ў яго душы праз усё наносна прабівалася крынічная паэзія. Запавет "Любіце Украіну" лёгка пераносіцца і на нашую рэчаіснасць. Дзякуй, сын Украіны, што выклікаеш блізкае пачуццё: "Любіце Беларусь!".

**Васіль ЖУКОВІЧ**

# Гісторык антычнасці

**Адным з першых знаёмых Вісарыёна Бялінскага пасля таго, як ён у канцы кастрычніка 1839 года перабраўся на сталае жыхарства ў Пецярбург, быў Міхаіл Кутарга. Ужо ў лісце да В. Боткіна ад 22 лістапада крытык характарызуе свайго новага знаёмага як "маладога прафесара, гегельянца і разумнага чалавека". А Чарнышэўскі ў студэнцкія гады пісаў пра М. Кутаргу, што ён яму "спадабаўся непараўнальна больш за астатніх прафесараў, якія нам чытаюць". Сёлета спаўняецца 200 гадоў з дня нараджэння гэтага славутага вучонага, нашага суайчынніка.**

Міхаіл Сямёнавіч Кутарга, прафесар гісторыі Пецярбургскага, а затым Маскоўскага універсітэтаў, нарадзіўся 6 ліпеня 1809 года ў горадзе Чэрыкаве Магілёўскай губерні, у сям'і небагатага служачага Сямёна Кутаргі, які неўзабаве быў пераведзены ў Пецярбург. З ім пераехала і ўся яго сям'я.

У 1827 годзе Міхаіл Кутарга паступіў на славеснае аддзяленне гісторыка-філалагічнага факультэта Пецярбургскага універсітэта, аднак прабыў там толькі год. Было вырашана выбраць з універсітэтаў каля дваццаці самых здольных студэнтаў і камандзіраваць іх для навуковых заняткаў спачатку ў Дэрпт, а пасля Берлін ці Парыж. Сярод такіх студэнтаў аказаўся і Міхаіл Кутарга. У Дэрпце ён затрымаўся на чатыры гады, тут напісаў сваю першую навуковую працу і, абараніўшы дысертацыю, атрымаў ступень магістра філасофіі. У 1833 — 1834 гг. ён слухаў лекцыі па сваёй спецыяльнасці ў Парыжы, Гейдэльбергу, Мюнхене, аднак больш за ўсё часу правёў у Берліне.

Варта адзначыць, што ў гэты час у нямецкіх універсітэтах папулярнай стала так званая "Нібураўская школа". Прафесары гісторыі займаліся пераважна вывучэннем антычнага свету. Шляхам строгага крытычнага аналізу, праз непасрэднае вывучэнне твораў класічных пісьменнікаў, адноўлялі і вытлумачвалі гісторыю Грэцыі і Рыма. Да гэтага навуковага кірунка далучыўся і М. Кутарга.

Па вяртанні з-за мяжы, ён быў прызначаны для выкладання ў Пецярбургскім універсітэце старажытнай, сярэдняй і новай гісторыі. У 1838 годзе М. Кутарга абараніў доктарскую дысертацыю на тэму "Пакаленні і саслоўі антычныя". Гэтая праца неўзабаве была перакладзена на французскую мову і выдадзеная ў Парыжы, а Кутарга ўзведзены ў экстраардынарныя прафесары.

З канца 1840-х гг. Міхаіл Сямёнавіч пачаў ладзіць у сябе дома своеасаблівыя "вячэрнія гутаркі" — правобраз семінарскіх заняткаў. Тут ён займаўся разборам асобных гістарычных пытанняў, даваў студэнтам тэмы для распрацоўкі, аналізаваў сачыненні, якія яны прыносілі, і такім чынам на справе знаёміў маладых людзей з патрабаваннямі і прыёмамі гістарычнай крытыкі. Шмат хто з удзельнікаў гэтых "гутарак" стаў з цягам часу вядомым даследчыкам, аднак галоўная заслуга М. Кутаргі ў тым, што ён адзін з першых пачаў распрацоўваць самастойна класічныя старажытнасці, падвяргаючы вывучэнню як тэксты, так і самі помнікі. З гэтай мэтай ён здзейсніў тры паездкі за мяжу — Малую Азію, Егіпет і Грэцыю. Сярод сучасных яму знаўцаў эліпізму Міхаіл Сямёнавіч займаў самае пачэснае месца. У 1882 годзе шырока быў адзначаны 50-гадовы юбілей яго навуковай дзейнасці.

Выйшаўшы ў адстаўку, М. Кутарга пасяліўся ў сваім маёнтку Борткі Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні, дзе і памёр у 1886 годзе.

**Вячаслаў АФАНАСЬЕЎ**

# Дзе дзённікі Максіма Танка?

**Гэта пытанне на сённяшні дзень застаецца адкрытым. Пытанне аб месцы знаходжання дзённікаў славутага беларускага паэта ўзнікла ў сувязі з падрыхтоўкай 9-га тома Збору твораў Максіма Танка «Ліcткі календара» (1936 — 1939 гг.). Дзённікі (1941—1994 гг.)». «Ліcткі календара» рыхтуе да выдання А. Ліс. Адказным за афармленне тэкстаў дзённікаў і аўтарам каментарыяў да гэтых тэкстаў з'яўляецца У. Казбярук, літаратуразнаўца з вялікім вопытам у даследаванні беларускай літаратуры. У свой час (праца па падрыхтоўцы Збору твораў была распачата ў 1996 годзе) ён плённа працаваў над машынапісам дзённікаў, выявіў розначытанні і недакладнасці, адзначыў варыянты і пропускі ў параўнанні машынапісу Танка і першапублікацыі ў часопісе «Полымя». Аднак сёння вычытаць тэкст дзённікаў, падрыхтаваны У. Казберуком, звяраючы з арыгіналам, немагчыма з-за адсутнасці гэтага арыгінала.**

Тэксталагічная група, якая на сучасным этапе займаецца выданнем Збору твораў, прынялася за росшукі тэкстаў рукапісу і машынапісу. Па сведчанні сына Максіма Танка, Максіма Яўгенавіча Скурко, рукапісы былі знішчаны самім Яўгенам Іванавічам пасля таго, як на іх аснове ён надрукаваў на машынцы другі варыянт. Максім Яўгенавіч не бачыў рукапісу дзённікаў пасля смерці бацькі, у дамашнім архіве захоўваўся толькі машынапіс. Са слоў У. Казберука, рукапіс складаў 21 сшытак, сярод якіх былі вялікія кнігі і тоненькія школьныя сшыткі, асобныя лісткі з запісамі, а таму аўтару прыйшлося самому заняцца ўстанаўленнем паслядоўнасці ў такой масе розных матэрыялаў і друкаваннем тэкстаў дзённікаў на друкарскай машынцы. У навуковай працы па вывучэнні творчасці паэта машынапісам карысталіся У. Казбярук, У. Мікуліч, затым у 1997 годзе на аснове машынапісу ў часопісе «Полымя» друкаваліся дзённікі Максіма Танка, за публікацыю якіх у той час адказвалі С. Законнікаў і А. Клышка, непасрэдны рэдактар тэкстаў. Па сведчанні С. Законнікава, пасля апублікавання дзённікі не захоўваліся ў архівах часопіса, што пацвердзіў і цяперашні галоўны рэдактар часопіса М. Мятліцкі, які адзначыў, што ў спадчыну ад папярэднікаў атрымаў толькі часопісы «Полымя» за некалькі гадоў выдання. Як адзначыў А. Клышка, пасля апублікавання ён не бачыў машынапіснага тэксту і не ўяўляе, куды, акрамя БДАМЛМ, ён мог трапіць (у БДАМЛМ паступалі ўсе надрукаваныя ў часопісе матэрыялы, у першую чаргу звязаныя з класікамі беларускай літаратуры). Аднак і ў БДАМЛМ, як сцвярджае дырэктар архіва-музея Г. Запартыка і яго супрацоўнікі, дзённікі так і не дайшлі, а сын паэта туды іх не перадаваў (у БДАМЛМ захоўваюцца ўсе матэрыялы з сямейнага архіва Максіма Танка).

Ёсць некалькі версій (версіі не аўтара артыкула) адносна месца знаходжання дзённікаў. Першая версія — дзённікі маглі трапіць выпадковаму прахожаму падчас правядзення рамонтных работ у будынку, дзе знаходзілася рэдакцыя часопіса «Полымя», — у той час каштоўныя матэрыялы са спадчыны знакамітых беларускіх пісьменнікаў былі ў адкрытым доступе з-за адсутнасці месца для іх захавання. Другая версія звязана з тым, што хтосьці ўзяўся папрацаваць над дзённікамі ды так і не вярнуў тэксты ні ў сямейны архіў, ні ў БДАМЛМ. Трэцяя версія звязана з тым, што дзённікі трапілі ў рукі зацікаўленай у іх авалоданні асобе і сталі экспанатам прыватнай калекцыі. І шэраг падобных версій можна працягваць: есць версіі, але няма доказаў і прамых указанняў на тое, дзе яны могуць знаходзіцца. Нас выратавалі б у падрыхтоўцы тэкстаў дзённікаў да друку ксеракопіі машынапісу, аднак ні ў У. Казберука, ні ў М. Мікуліча, па іх сцвярджэнні, ксеракопій не засталося. Атрымліваецца так, што тэксты дзённікаў у часопісе «Полымя» і перапрацаваныя тэксты, якія падрыхтаваны для 9-га тома Казберуком, — апошнія версіі дзённікаў. Пры гэтым узнікае яшчэ адно пытанне: чаму ў дзённіках Максіма Танка не прадстаўлены 1940 і 1947 гг.? Запісы ў дзённіках аўтарам вяліся рэгулярна, у некаторыя гады паэт вельмі падрабязна апісваў розныя падзеі асабістага і творчага жыцця, аднак у машынапісе 40-ы і 47-ы гады адсутнічалі. Зноў жа, зыходзячы з меркаванняў даследчыкаў, гэта магло быць звязана з няпростымі перыядамі ў жыцці Яўгена Іванавіча, калі яму было не да дзённікаў; таксама важным аргументам можа стаць самакрытычнае стаўленне да вядзення дзённікаў, калі ён некалькі разоў прымаў рашэнне не пісаць і зноў вяртаўся да запісаў; існуе і такая думка, што запісы ў 40-м і 47-м гг. аўтарам знішчаны ці згублены. Агулам, пытанне застаецца адкрытым: ці існуюць увогуле дзённікавыя запісы за 40-ы і 47-ы гады?

Акрамя таго, як адзначае А. Клышка, некаторыя запісы заносіліся Танкам у дзённікі пазней, праз некаторы час пасля падзей, а таму, калі рыхтаваў тэксты для апублікавання, А. Клышка выявіў некаторыя неадпаведнасці паміж рэальнымі фактамі і напісаным, і гэтыя мясціны (са слоў А. Клышкі, іх было няшмат) ён не ўключаў у палымянскую публікацыю. Аднак гэта ўжо літаратуразнаўчыя праблемы, якія ўлічыў і з якімі паспяхова справіўся У. Казбярук пры падрыхтоўцы дзённікаў. Ёсць і іншыя праблемы, звязаныя з выданнем Збору твораў, аднак яны ўспрымаюцца другарадна на фоне незразумелага, загадкавага знікнення шматлікіх матэрыялаў са спадчыны Максіма Танка. Тут варта яшчэ ўзгадаць пра лісты, напісаныя Максімам Танкам. Наша тэксталагічная група ў свой час звярталася да людзей (гэта пісьменнікі, рэдактары, настаўнікі і многія іншыя), якія вялі перапіску с Максімам Танкам, паспрыяць нам у атрыманні ксеракопій лістоў паэта дзеля іх уключэння ў асобны том «Лісты», аднак на наш заклік адгукнуліся нямногія, хаця з дзённікаў Максіма Танка дакладна вядома, што паэт вёў даволі актыўную перапіску як з беларускімі, так і з замежнымі (часцей польскімі і літоўскімі) адрасатамі. Многія з лістоў Максіма Танка, пра якія у нас была інфармацыя, таксама дзіўным чынам зніклі. Таму, карыстаючыся магчымасцю звярнуцца да чытачоў праз газету, яшчэ раз запрашаем паўдзельнічаць у пачэснай справе выдання Збору твораў Максіма Танка і прапанаваць нам лісты ці іншыя матэрыялы паэта.

В. Рагойша, як старшыня камісіі па спадчыне Максіма Танка і даследчык яго творчасці, запэўніў, што таксама будзе займацца росшукамі дзённікаў паэта. Словам, калі вы валодаеце інфармацыяй адносна дзённікаў Максіма Танка, паведаміце, калі ласка, у Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы, а яшчэ лепш — дапамажыце вярнуць дзённікі ў БДАМЛМ, дзе яны і павінны захоўвацца для вывучэння іх сучаснікамі і будучымі пакаленнямі даследчыкаў. Не павінна страчвацца самае дарагое — нацыянальныя помнікі прыгожага пісьменства, а дзённікі, як і лісты, Максіма Танка з'яўляюцца не толькі літаратурнай гісторыяй, але і важнай крыніцай ведаў пра этапы станаўлення глыбокага таленту паэта, фарміравання неардынарнай асобы Яўгена Іванавіча Скурко. Дзённікі маюць вялікае культурна-эстэтычнае значэнне для ацэнкі гісторыі беларускай літаратуры, а праз фактаграфію жыццёвага і творчага лёсу Максіма Танка шматлікія падзеі літаратурнага працэсу набываюць новае прачытанне.

**Святлана КАЛЯДКА**

## Роздум чытача

# «Сена» + «салома» = ?

ТРЫМАЮ ў руках расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік нашага земляка з-пад Новага Пагоста Вацлава Ластоўскага. Аўтар тлумачыць: "Назваў я гэты слоўнік "Расійска-крыўскім", бо як гісторыя сведчыць, нашае запраўднае племяннае і нацыянальнае найменне ёсць Крывічы". Выданне арыгінала слоўніка датуецца прыкладна 1924 годам. У прадмове В. Ластоўскі піша: "У надзеі на тое, што новыя сілы з новай моладзі зазначаць сябе працай над роднай мовай, я пастараўся замацаваць на паперы тое, што мне ўдалося сабраць за час маёй працы на ніве нашага адраджэння".

Калі чытаеш слоўнік Ластоўскага, дзіву даешся: выразы, якія, здаецца, даўно прыжыліся ў сучаснай літаратурнай мове, маюць самавітыя родныя адпаведнікі, якімі карысталіся ў зносінах нашы продкі. Але гэтыя слоўцы ўжо забытыя, сучасныя пакаленні іх не ўжываюць у гаворцы. Знаёмы ў паэтычнай мове "акраверш" — "скрытаслоў", "абрэвіяцыя" — "скарот", "алея" — "прасада" (менавіта, прасада, бо слова паходзіць ад "садзіць", а не "абсаджваць" у значэнні аправы). Скажаце, гэтыя словы састарэлі і прызнаны ў сучаснай літаратурнай мове архаізмамі, але я не пагаджуся з вамі. Кожнае самавітае беларускае слоўца выспявала стагоддзямі, а зараз заменена больш сучасным іншаземным.

Наша мова за час свайго існавання ведала падзенні і ўзлёты. У XVI стагоддзі яна была дзяржаўнай у адной з найвялікшых і развітых краін тагачаснай Еўропы. На першую трэць XX стагоддзя прыпадае ўзорная мастацкая літаратура сусветнага ўзроўню.

"Моўны" заняпад прыпадае на XVIII і пачатак XIX стагоддзя, аднак, у першай палове XIX стагоддзя адрадзілася мова, як Фенікс з попелу. Але ўжо ў 20-я гады XX стагоддзя пачала выцясняцца на перыферыю грамадскага жыцця...

Заўважце, што ва ўсіх сучасных славянскіх краінах у якасці адзінай дзяржаўнай мовы юрыдычна зацверджана мова тытульнай нацыі. Выключэнне складае Беларусь, дзе пасля майскага рэферэндуму 1995 года большасцю насельніцтва дзяржаўнымі прызнаны дзве мовы — руская і беларуская.

Рарытэтная сітуацыя, калі мова тытульнай нацыі не карыстаецца пашанай сярод пераважнай часткі насельнікаў і не ўжываецца ёю ў паўсядзённым і прафесійным жыцці, з усіх славянскіх краін маецца толькі ў Беларусі. Балюча гаварыць, але гэта значыць, што мова ў заняпадзе.

У падобным стане, дарэчы, знаходзіліся мовы і ўкраінцаў, і палякаў, і рускіх. Напрыклад, у дачыненні да нашых заходніх суседзяў у 1542 годзе польскі пісьменнік-патрыёт пісаў: "Я не магу здзіўляцца таму, што ў той час, як усялякі іншы народ шануе, развівае, упрыгожвае і старанна апрацоўвае сваю мову, польскі народ грэбуе і пагарджае сваёй мовай. Прычынай таму служыць польская ўласцівасць быць больш схільным да чужых звычак, спраў, людзей і моў, чым да сваіх уласных".

Адлік існавання новай рускай літаратурнай мовы, як і новай беларускай, ідзе толькі з XVIII стагоддзя, бо яшчэ ў першай трэці XIX стагоддзя яна не карысталася пашанай у адукаванай свецкай частцы рускага грамадства. Так, галоўная гераіня рамана Пушкіна "Яўгеній Анегін" Таццяна Ларына — "русская душой" — дрэнна ведала рускую мову.

Беларуская народная супольнасць, як вядома, узнікла на аснове славянскіх плямёнаў (крывічоў, радзімічаў, дрыгавічоў), а нормы яе пісьмовай літаратурнай мовы склаліся на працягу XIV — XV стагоддзяў. Дадзеная мова праіснавала да пачатку XVIII стагоддзя і мае ў сучаснай лінгвістыцы назву старабеларуская.

Новая беларуская літаратурная мова зарадзілася ў першай палове XIX стагоддзя. На грунце беларускіх народных гаворак яна фактычна страціла непасрэдныя сувязі са старабеларускай пісьменнасцю.

Як мы размаўляем сёння? Па-руску? Па-беларуску? Ці на трасянцы? Распаўсюджаная трасянка — гібрыд літаратурнай беларускай і рускай моў. "Змешаная" мова ўжываецца і ў нашых паўднёвых суседзяў — сумесь украінскай і рускай моў там завецца суржыкам. Суржык азначае стрэсенае зерне розных злакаў. А наша трасянка — стрэсеныя сена і салома, якімі кормяць свойскую жывёлу. Ва Украіне ўкраінская мова прызнана адзінай дзяржаўнай, таму суржык асуджаны на выміранне. Наша трасянка пры афіцыйным дзяржаўным двухмоўі не толькі замінае ўсялякім мерапрыемствам і намаганням па ўкараненні рускага ці беларускага маўлення, але і перашкаджае набыць самастойны статус.

Яшчэ ў школе мы мелі магчымасць вывучаць творчасць беларускай асветніцы — Цёткі. Устрывожана перачытваю вытрымку з яе артыкула "Шануйце роднае слова":

"На вас, моладзі, ляжыць вялікая адказнасць: развіваць далей родную мову, узбагачаць свой народ знаннем і культурай. Вы здабываеце навуку для сябе, дык дзяліцеся ёю з тымі, хто для вас цяжкай працай здабывае кусок хлеба".

Здаецца, усё тут зразумела. Безумоўна, родная мова чакае свайго ўдасканалення.

Некаторыя нечуллівыя людзі кажуць, што "родная мова аджывае", намякаючы на тое, што яна памірае. Але ж які дваісты сэнс у гэтым слове "аджывае". Задумаліся? Так, яна аджывае — адраджаецца. Набірае новую моц у бойкіх струменях жыцця. Мова яшчэ аджыве... Вы верыце? А я веру!

**Алена БАСІКІРСКАЯ**

№ 30 14 жніўня 2009 г. Літ

# На беражку памяці

**У Расіі выйшла грунтоўнае выданне, прысвечанае славутаму пейзажысту, народнаму мастаку Беларусі і Расіі В.К. Бялыніцкаму-Бірулю. Гэта — першая значная работа расіян пра нашага земляка пасля 50-х гадоў мінулага стагоддзя.**

Жыццё выдатнейшага беларускага жывапісца Вітольда Бялыніцкага-Бірулі нагадвае мне раку, якая сваёй ціхай, але велічнай, плынню, сваімі берагамі паядноўвае многія краіны і народы. Вітольд Каятанавіч нарадзіўся ў Беларусі, вучыўся ў Кіеве, 68 гадоў пражыў у Расіі, з якіх амаль 45 звязаны з удомельскай зямлёй, што ў Цвярской вобласці, дзе на беразе аднайменнага возера мастак пабудаваў лецішча "Чайка" і напісаў большую частку сваіх карцін.

Жыццю Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, яго творчай і грамадскай дзейнасці на Удомельшчыне і прысвечана кніга Таццяны Бай "Чайка" на Удомле", якая толькі што пабачыла свет у Цвярскім выдавецтве "Параграф". Як пазначана ў анатацыі, гэтым выданнем адзначаецца *"25-летие пуска первого энергоблока, а выполнено оно при финансовой поддержке Калининской АЭС и является новым вкладом атомной станции в сохранение и развитие культурного пространства Тверской области"*.

Як вядома, з Удомельшчынай звязана жыццё і дзейнасць многіх выдатных расійскіх мастакоў. Першым блізу двух стагоддзяў таму адкрыў гэты край акадэмік жывапісу А. Венецыянаў, пазней тут стваралі свае выдатныя палотны І. Левітан, С. Жукоўскі, А. Мараваў, а Вітольд Бялыніцкі-Біруля, зачараваны гэтым краем, пабудаваў нават лецішча — сваю знакамітую "Чайку".

Яно цяпер, падкрэслівае Т. Бай, — адзіны мемарыяльны куток, які нагадвае пра слаўную плеяду таленавітых жывапісцаў, і з'яўляецца унікальным помнікам расійскай гісторыі і культуры. Бірулёва "Чайка", заўважае аўтар кнігі, — «это единственный, не по статусу, но по сути, памятник федерального, более того, международного значения на территории Удомельского района».

Кніга "Чайка" на Удомле" складаецца з некалькіх невялічкіх раздзелаў, якія абагульняюць вядомыя матэрыялы пра жыццё і творчасць мастака ("Становление художника", "Расцвет творчества", "Признание заслуг", "Домля. "Чайка", "Государственные художественные мастерские", "Возвращение в "Чайку", "Друзья", "Осиротевшая "Чайка", "Чайка" на рубеже веков", "Фотографии. Документы"), але яны цікавыя ўкрапленнямі ў вядомае зусім невядомых ці малавядомых шырокай публіцы дэталяў, удакладненняў, фактаў.

Прыкладам, аўтар здолела ўдакладніць час пабудовы мастаком свайго лецішча. Агульнавядома, што ўпершыню Вітольд Каятанавіч завітаў на Удомельшчыну ў 1901 годзе. Праз адзінаццаць гадоў ён прымае рашэнне пабудаваць на высокім беразе возера Удомля невялікую сядзібу, дзеля чаго набывае ў селяніна Аляксея Грыгор'ева 18 гектараў неапрацаванай, парослай хмызняком, зямлі. Шырока распаўсюджана думка аб тым, што лецішча "построено в 1912 году, а может, и раньше". На падставе ўважлівага вывучэння аўтабіяграфіі мастака, шэрага архіўных дакументаў Т. Бай пераканаўча сцвярджае, што будаўніцтва лецішча пачалося не раней за 1913 год, а ўвосень 1915 прасторны дом з элементамі стылю мадэрн ужо лунаў над возерам, і на доўгі час стаў творчай майстэрняй мастака і яго сяброў.

Даследчыца грунтоўна прасочвае і гісторыю Вольных дзяржаўных мастацкіх майстэрняў, якія пачалі дзейнічаць у "Чайцы" з 3 лютага 1919 года. Пад кіраўніцтвам гаспадара лецішча, мастакоў Багданава-Бельскага, Маравава, Карэтнікава, Дабратворскага і іншых у майстэрнях займаліся сялянскія дзеці з навакольных вёсак. Аднак неўзабаве "Тверская правда" друкуе ліст "Коммунары из коммуны "Чайка" некаторых прадстаўнікоў мясцовай інтэлігенцыі, у якім майстэрні называюцца "прибежищем для оставшейся буржуазии". Ананімныя падпісанты прапаноўваюць зрабіць законным гаспадаром "Чайкі" народ. Пасля выхаду артыкула ў лецішча была накіравана рэвізія, зроблены вопіс маёмасці і асабістых рэчаў мастака. І хоць рэвізоры ў сваёй справаздачы адзначылі, што "никакой обособленной от всех коммуны" няма, Бялыніцкага-Бірулю гэты выпад вельмі закрануў: ён выйшаў з ліку кіраўнікоў майстэрні. *"Конечно, не собираюсь никаких шагов предпринимать относительно своих прав на свои вещи собственные, так как верю, что сами люди поймут, что они в отношении меня поступили неправильно. Но скажу откровенно, что глубоко считаю себя обиженным и оскорбленным за всё доброе, за все заботы по отношении к неверному нашей волости населению, даже за устройство мастерских, как художественных, так и ремесленных, мне заплатили подлой клеветой и сплетнями. И вот я единственно, чем отвечаю,* — пісаў мастак з Масквы 8 верасня 1919 года старшыні Удомельска-Радскай ячэйкі камуністаў-балышавікоў Аляксею Воінаву, — *ухожу из школы, мною созданной, мною взлелеянной, при таких отношениях жить и работать не могу и не в силах"*. Дарэчы, майстэрні праіснавалі да 1922 года. І калі ў іх у 1919 годзе вучылася 177 вучняў, то пазней, заўважае даследчыца жыцця і творчасці нашага славутага земляка Таццяна Бай, колькасць навучэнцаў ва ўзросце ад 10 да 50 гадоў павялічылася да 437 чалавек.

Варта заўважыць, што Вітольду Бялыніцкаму-Бірулю "дзяліцца" з мясцовымі сялянамі даводзілася і пазней: у 1922 годзе ён аддаў ім значную долю зямельнага ўчастка, пакінуўшы сабе толькі невялікую частку пад сад і агарод; праз два гады пасля гэтага на пасяджэнні прэзідыума Удомельска-Радскага валвыканкама "обсуждался

вопрос о передаче гражданином Бирулёй дома при бывшем его имении "Чайка" под школу. Президиум решил дом при имении "Чайка" под школу взять, но учитывая, что он ещё не оборудован, договориться с гражданином Бирулёй о занятии до окончания ремонта двух комнат в доме, где проживает сам художник"; у 1931 годзе Вітольд Каятанавіч перадаў калгаснікам і адну з пабудоў пад клуб... Дый маскоўскі дом-асабняк В.К. Бялыніцкага-Бірулі, што знаходзіўся на Варатнікоўскім завулку, перайшоў дзяржаве, якая выдзеліла яму кватэру на першым паверсе. Але неўзабаве пачалося ўшчыльненне, і ў кватэру мастаку падсялілі яшчэ дзве сям'і.

*"...Устал от нашего милого народца,* — са скрухаю жаліўся Вітольд Каятанавіч А. Воінаву, — *который буквально при всяком удобном случае грабит — за хлеб, масло и продукты приходиться отдавать буквально всё, снимать даже пиджак, ничего не поделаешь, такие нравы."*

У кнізе выразна праглядаецца грамадзянская пазіцыя Т. Бай, неабыякавага чалавека, які любіць родную зямлю, шануе яе гісторыю, людзей, якія жылі і тварылі на ёй. Гэты неспакой і заклапочанасць асабліва напаляюцца, калі яна распавядае пра жыццё Вітольда Каятанавіча ў 20-я гады, пра складаны лёс "Чайкі" пасля смерці жывапісца. Лецішча перайшло ў спадчыну да ўдавы мастака Алены Аляксееўны, якая паспрабавала заснаваць у ім мемарыяльны музей. Але ні мясцовыя, ні абласныя ўлады, ні больш высокія інстанцыі яе не падтрымалі. Адгаворка вядомая і простая: "Чайка" знаходзіцца ўдалечыні ад вялікіх гарадоў і дарог і яе ніхто не будзе наведваць. Аднак, Бірулёва лецішча прыцягвала да сябе людзей: настаўнікаў, пісьменнікаў, маладых мастакоў, школьнікаў. З 1957 да 1972 года Алена Аляксееўна ўтрымлівала на свае сціплыя грошы "Чайку", якая працавала як музей, захоўвала памяць пра памерлага мастака. Але паступова дом старэў, прыходзіў у запусценне. У 1972-м яна прадае лецішча масквічу В. Баброву, а рэчы, якія знаходзіліся ў доме, з дапамогай Дзяржаўнага мастацкага музея БССР (сёння Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь) перавезла ў Мінск. Пазней на аснове іх быў створаны музей В. К. Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве.

У жніўні таго ж года Баброў прадае частку "Чайкі" таксама масквічцы О. Сеземан, яны разам зрабілі рамонт. Праз 5 гадоў "Чайкай" зацікавіўся першы сакратар Калінінскага абкама КПСС Н. Карыткаў, і дом з вясны 1978 года быў выкуплены ва ўладальнікаў і ўзяты пад ахову дзяржавы як помнік гісторыі і культуры. Аднак, сядзіба не была пастаўлена на баланс абласнога ўпраўлення культуры, а мясцовыя ўлады не мелі грошай на яе ўтрыманне. Зноў разбурэнне, зноў запусценне і заняпад.

Па-сапраўднаму адраджацца "Чайка" пачала з 1995 года, калі лецішча было перададзена на баланс удомельскага прадпрыемства "Домакіраванне" і ў ёй пасялілася сям'я Юрыя Міхайлава. Да ўзнаўленчых работ падключыліся прыватныя фірмы, адміністрацыя раёна, калектыў Калінінскай атамнай станцыі. У выніку, быў створаны гісторыка-культурны цэнтр лецішча "Чайка" для арганізацыі выставачнай і асветніцкай работы. Цяпер у гасцінным і адноўленым Бірулёвым доме рэгулярна ладзяцца выставы жывапісу, графікі, скульптуры, праходзяць паэтычныя вечарыны, прадаўжаецца і традыцыя, закладзеная яшчэ Вітольдам Каятанавічам: тут створана дзіцячая майстэрня мастацкай творчасці.

Значнай падзеяй у гісторыі адроджанай "Чайкі" стала правядзенне восенню 2001 года Міжнароднага пленэру "Вобраз Радзімы ў выяўленчым мастацтве", прысвечанага памяці В.К. Бялыніцкага-Бірулі, у якім удзельнічалі і беларускія мастакі.

...Ужо сёмы год "Чайка" знаходзіцца на балансе дзяржаўнай установы культуры "Цвярская абласная карцінная галерэя". Гэта значыць, ажыццявілася тое, аб чым амаль паўвека таму марыла ўдава Вітольда Каятанавіча Алена Біруля.

А творчая інтэлігенцыя Масквы, Цвярской вобласці, Удомельшчыны ідзе далей. Віцэ-прэзідэнт саюза дызайнераў Масквы Ілья Пейда выношвае задуму стварыць на базе "Чайкі" расійска-беларускі гісторыка-культурны цэнтр. Было б выдатна, каб гэты пачын знайшоў падтрымку і ў Беларусі.

**Надзея ПАЛОННІК**

***На здымках: В. К. Бялыніцкі-Біруля; жывапісныя палотны мастака.***

## Вандроўны твор мастацтва

Нацыянальная філатэлістычная выстава "Белфіла-2009" прайшла ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі ў шосты раз. І кожны год яе галоўная гераіня — марка — атрымлівае новыя вызначэнні і эпітэты. Звыклы знак паштовай аплаты расцэньваецца спецыялістамі як аб'ект мастацтва, люстэрка гісторыі, носьбіт інфармацыі, візітная картка краіны, упрыгожванне канверта, а для філатэлістаў яна — экспанат, гонар, залацінка, здабытая праз доўгія пошукі.

Выстава "Белфіла-2009" стала самай шматлікай па колькасці ўдзельнікаў — сабрала 77 калекцый з Беларусі, Германіі, Латвіі, Літвы, Расіі, Польшчы, Украіны. Падчас афіцыйнага адкрыцця, нагадваючы пра пераможна-патрыятычную танальнасць выставы, якая сёлета прысвячалася 65-годдзю вызвалення Беларусі, на прыступках музея гасцей сустракаў ваенны аркестр. Вызваленчы матыў раскрываўся цэлым шэрагам калекцый, якія адлюстроўвалі ўсю гісторыю змагання і перамогі, — "Палявая пошта 1941—1945 гадоў", "Пошта Ленінградскай блакады", "Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне" ды многімі іншымі. Экспанаваліся і сапраўдныя лісты з фронту — трохкутнікі са штампамі цэнзуры захоўваюцца ў калекцыі аднаго са старэйшых беларускіх філатэлістаў Жарэса Артамонава. Адмыслова да выставы быў выпушчаны паштовы блок на тэму 65-годдзя вызвалення Беларусі, цырымонія яго гашэння адбылася на адкрыцці мерапрыемства.

"Белфіла-2009" — гэта яшчэ і конкурс, дзе прагаласаваць за ўпадабаную калекцыю маглі ўсе наведнікі музея. Кожная калекцыя мае сваю індывідуальнасць, за кожнай маркай — цэлая гісторыя. Так, упершыню на выставе быў прадстаўлены збор марак на рэлігійную тэму — Леон Карповіч з вёскі Луно Мастоўскага раёна праілюстраваў цытаты з Бібліі маркамі са шматлікіх краін свету. А Валерый Андраюк з Брэста звярнуўся да прыродных крыніц: у экспазіцыі ўдзельнічаюць адразу некалькі яго калекцый — пра Белавежскую пушчу, а таксама на дагістарычную тэму стасункаў чалавека і леса. Валерый збіраў гэтую калекцыю чатыры гады, што па філатэлістычных мерках няшмат, але не выключана, што з часам яна папоўніцца новымі экспанатамі. Прыкладам гэтаму — экспазіцыя калекцыянера з Ульянаўска, які ўдзельнічаў у выставе ў Беларусі ажно трыццаць сем гадоў таму, а сёння зноў прывёз тую самую калекцыю, якая пасталела разам з ім.

А самы важкі збор выставы — калекцыя Уладзіміра Навасёлава са Смаленска, якая адсылае гледача да вытокаў філатэліі, дэманструючы так званы "чорны пені" — першую ў гісторыі марку 1840 года на арыгінальным канверце і з пячаткай. Акрамя таго, тут можна падзівіцца на самыя незвычайныя віды марак — на залатых і плацінавых пласцінках, папірусе, шоўку, з галаграмай альбо крышталікамі "Свароўскі" ці нават з музычным аздабленнем.

**Саша ДОРСКАЯ**

**Віктар Антонавіч Каваленка праводзіў мяне на цягнік да Брэста. На мінскім вакзале, сучасным, новым, прыгожым, ён даў мне на дарогу тры вялізныя круглыя боханы чорнага хлеба. Я чамусьці не пярэчыла і ўзяла іх. Развітвалася са сваім навуковым кіраўніком па дысертацыі, які стаў дарагім настаўнікам, збіралася ўжо ісці на перон, шукаць брэсцкі цягнік. Але Віктар Антонавіч папрасіў затрымацца на хвілінку, бо паблізу, у буфеце, яго жонка Марыя Андрэеўна купляла яшчэ бутэрброды мне на дарогу. Я глянула, куды паказваў Віктар Антонавіч, і ўбачыла яе. Упершыню... Вось такі быў мой сон, які прысніўся незадоўга да раптоўнай смерці Віктара Антонавіча спякотным летам 2001-га года...**

# Хлеб на дарогу

Мне асабіста і майму пакаленню, што ішло ў навуковае літаратуразнаўства ў 80-я гады, вельмі пашанцавала: нашымі універсітэцкімі настаўнікамі, аўтарытэтнымі акадэмічнымі кумірамі, часцей вядомымі толькі па кнігах, публікацыях у літаратурна-мастацкай перыёдыцы, былі літаратуразнаўцы-шасцідзесятнікі, назаўсёды дарагія і незабыўныя настаўнікі. Яны натхняліся адчуваннем грамадскай перспектывы, вольнага творчага і навуковага пошуку. Сваёй верай у нас і апантанай уласнай літаратурна-даследчыцкай працай яны натхнялі і акрылялі маладзейшых. Жывая пошукавая думка кніг А. Адамовіча, В. Каваленкі, А. Мальдзіса, М. Мушынскага, А. Яскевіча, І. Навуменкі, А. Лойкі, У. Калесніка, Г. Кісялёва, В. Жураўлёва, У. Гніламёдава, Н. Гілевіча і іншых навукоўцаў вучыла і пераконвала, што і тваё слова ў літаратурнай навуцы павінна быць грунтоўным, сумленным, вартым. Іх імкненне да навуковага пошуку, прага духоўнасці, слугаванне грамадскаму прагрэсу, адвечным маральна-этычным ісцінам дапамагаюць не страціць накірунак-шлях і сёння, калі арыенціры захісталіся і, здаецца, мяняюцца нават каардынаты быцця.

Віктар Антонавіч Каваленка (1929 — 2001), вядомы беларускі літаратуразнаўца і крытык, быў аўтарытэтным і прызнаным у нашай краіне вучоным-гуманітарыем, бліскучым даследчыкам гісторыі літаратуры і сучаснага яму літаратурнага працэсу. Яго эрудыцыя, канцэптуальна-філасофскае мысленне, прафесійная сумленнасць і адказнасць за кожнае слова засведчаны ў мноства кніг, якія мелі і маюць базавае значэнне для айчыннага літаратуразнаўства і крытыкі. Прызнаннем важкасці ўнёску В. Каваленкі ў беларускую літаратурную навуку стала прызначэнне яго дырэктарам Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН Беларусі і абранне акадэмікам АН Беларусі. У гэты час выявілася шырыня і дэмакратызм поглядаў вучонага, прывабныя рысы арганізатара і каардынатара навуковых даследаванняў бягучых і перспектыўных праблем беларускага літаратуразнаўства. І, магчыма, яшчэ ў большай меры ў асобе Віктара Антонавіча выяўляліся рысы беларускага вучонага, інтэлігента, звычайна стрыманага, ветлівага, тактоўнага, пры неабходнасці — годна-прынцыповага, прыгожага сваімі адносінамі да працы, да калег, да вучняў, да людзей і жыцця ўвогуле.

Сталым вучоным В. Каваленка стаў яшчэ ў 70-я гады, якія сённяшнія ўсезнаўцы называюць застойнымі, ігнаруючы ўсе тагачасныя здабыткі. Можа парадаксальна, але, я пераканана, у беларускім літаратуразнаўстве і крытыцы яны не былі застойнымі. Магчыма, якраз насуперак дзяржаўна-палітычнаму застою ў беларускай філалагічнай навуцы пульсавала атмасфера жывога пошуку — пошуку ісціны, праўды, духоўнасці, будучыні. Беларуская гуманітарная думка няспынна шукала выйсце — да агульначалавечых ідэалаў, да духоўна-філасофскіх берагоў, праз разняволенне духу асобы, праз няўхільную зарыентаванасць на высокія грамадзянскія, маральна-этычныя ідэалы кожнага чалавека і ўсяго народа. І доказ гэтаму — творчасць В. Быкава, У. Караткевіча, Я. Брыля, І. Шамякіна, «новыя» кнігі А. Куляшова, М. Танка, П. Панчанкі, прыход маладога пакалення Н. Мацяш, А. Разанава, У. Арлова... І аргументы гэтаму — навукова-даследчыя і літаратурна-крытычныя працы А. Адамовіча, В. Каваленкі і калег іх пакалення.

Даследаванні В. Каваленкі 70-х і наступных гадоў «Шляхі развіцця беларускай прозы» (у сааўтарстве з М. Мушынскім і А. Яскевічам), «Прага духоўнасці», «Праблемы сучаснай беларускай крытыкі», «Жывое аблічча дзён», «З пазіцый сучаснасці», «Міфа-паэтычныя матывы беларускай літаратуры», «Покліч жыцця» і іншыя вызначаюцца глыбокай даследчыцкай зацікаўленасцю, грамадзянскім неспакоем, заангажаванасцю духоўна-філасофскімі ідэямі агульначалавечага кшталту, пра што сёння ў рэцэнзіях або крытычных нататках-самарэкламах нават не згадваецца. Названыя працы В. Каваленкі, як, дарэчы, і многія кнігі-даследаванні яго сучаснікаў, адзначаны высокай культурай і прафесійнасцю; яны і сёння маюць аксіялагічную каштоўнасць у плане навукова-анталагічным і метадалагічным, нягледзячы на шматлікія спасылкі на пастановы і рашэнні партыйных з'ездаў, на партыйныя рэзалюцыі адносна літаратурна-мастацкага жыцця.



Прадметам даследавання ў названых працах В. Каваленкі і яго калег выступаюць вечныя агульнанародныя і агульначалавечыя дыфініцыі: духоўны свет асобы, пазіцыя мастака, ідэалы і мэты ў жыцці і творчасці, ненатольная прага духоўнасці, паэзія і мужнасць духу, мастацкая праўда і дакумент, сучаснасць і літаратура, праўда і вымысел, веліч праўды жыцця, смутныя колеры вайны, чорныя бездані слабых душаў, творчы подзвіг... Літаратурна-даследчыя кнігі А. Адамовіча, В. Каваленкі і іх калег разам з мастацкай творчасцю беларускіх пісьменнікаў фарміравалі культ творчай, разняволенай, гуманітарна-адукаванай асобы беларуса. З іх клопатам аб гуманізацыі, дэмакратызацыі грамадства праз літаратурна-мастацкую сферу, думаецца, варта звязваць і з'яўленне «Тутэйшых» і нават сённяшняга літаратурнага авангарда. Тое пакаленне рыхтавала гуманітарна-філалагічны прарыў канца XX — пачатку XXI стагоддзяў.

Асобна варта вылучыць працы В. Каваленкі, якія, несумненна, маюць фундаментальнае значэнне для айчыннага літаратуразнаўства — «Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіццё беларускай літаратуры XIX — XX ст.» (1975) і «Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры» (1981). Фармальна фундаментальнасць іх засведчана сотнямі спасылак на аўтарытэтныя навуковыя высновы В. Каваленкі многіх даследчыкаў, якія пасля выхаду гэтых кніг звярталіся да сугучных літаратуразнаўчых праблем. Па сутнасці названыя працы ўтрымліваюць у сабе многія перспектыўныя праекты далейшага, праблемна-паглыбленага даследавання беларускай літаратуры. Прыкладам гэтага можа быць арыгінальная распрацоўка вучоным з Магілёва С. Даніленкам, вучнем В. Каваленкі, праблем сацыяльнай міфатворчасці ў беларускай літаратуры XX ст.

Названыя манаграфіі сведчаць, наколькі ўдумлівым і дасведчаным вызначальных тэндэнцыях беларускага і сусветнага літаратурнага працэсу, як тэорыі, так і мастацкай практыкі, быў В. Каваленка. У кнізе «Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры» аўтар занепакоена пісаў: «Недахопы і ўпушчэнні ў вывучэнні фальклорнай спадчыны павінны хутчэй пераадольвацца, тым больш, што ў сучасным свеце наглядаецца нарастанне хвалі велізарнай зацікаўленасці да міфалогіі і фальклору. Сусветная літаратура шукае і выпрацоўвае новыя, яшчэ больш багатыя і дасканалыя формы народнай мастацкай творчасці, якія адкрываюць новыя магчымасці ў эстэтычным пазнанні чалавека. Інтэнсіўнае творчае пераасэнсаванне міфалогіі і фальклору служыць гэтай глабальнай задачы сусветнай літаратуры». Народжаную новым часам пільную ўвагу да міфалогіі В. Каваленка глыбока разумеў і даў ёй арыгінальную, канцэптуальную інтэрпрэтацыю, назваўшы яе «ўнутранай эстэтычнай рэакцыяй творчых сіл на недаацэнку мастацкай культуры мінулага ў пэўны перыяд духоўнага развіцця нашага грамадства». Зварот высокаразвітых літаратур свету да міфалагічных і фальклорных матываў скіраваў дапытлівую думку В. Каваленкі да адпаведных пошукаў на беларускай літаратурнай ніве: ці захапіла гэтая суветная тэндэнцыя беларускую літаратуру XIX і XX стагоддзяў? У якой меры? Які характар гэтых уздзеянняў?.. У грунтоўным манаграфічным выкладзе аўтар выказаў слушныя меркаванні, што міфалагічныя вобразы ў беларускім літаратурным працэсе выкарыстоўваюцца як сродкі метафарызацыі і абагульнення думкі, як мастацкі прыём увасаблення агульначалавечых ідэй. Больш таго, В. Каваленка паказаў уключанасць міфалагічных уяўленняў у сучаснае мастацкае мысленне: «Без адчування святла духоўнасці, якое ідзе да нас з глыбіні вякоў, без ведання самога характару ўплыву мінулага на сённяшні дзень погляд на сучаснае не можа быць аб'ектыўным». Кніга «Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры» мне бачыцца знакавай і фундаментальнай і ў плане прадчування аўтарам новай метадалогіі, калі міфалагізм умацоўвае ідэі архетыпавай структуры мастацкага твора, чым паспяхова сёння займаецца структуралізм, германеўтыка, фенаменалогія.

Многа і слушна напісана пра В. Каваленку-крытыка. І сапраўды, шырыня інтарэсаў і прафесійнасць, якія выявіліся пры асэнсаванні Віктарам Антонавічам тэорыі і практыкі сучаснага яму літаратурнага працэсу, уражваюць. Старонкі яго кніг літаратурнай крытыкі «Жывое аблічча дзён», «Праблемы сучаснай беларускай крытыкі», «Прага духоўнасці», «З пазіцый сучаснасці» і іншых здзіўляюць філасофска-эстэтычнай праніклівасцю, аналітызмам даследавання мастацкай творчасці яго сучаснікаў. В. Каваленка зацікаўлена пісаў пра творы І. Мележа, І. Шамякіна, В. Быкава, А. Адамовіча, Н. Гілевіча, П. Панчанкі, Я. Брыля, К. Кірэенкі, А. Куляшова, І. Чыгрынава, В. Адамчыка, Е. Лось... З цікавасцю і заклапочанасцю аналізаваў прозу і паэзію маладзейшых — А. Разанава, Р. Баравіковай, А. Дзятлава, В. Гігевіча... У полі зроку даследчыка былі таксама жанравыя пошукі беларускай драматургіі, у прыватнасці, творы А. Макаёнка, К. Крапівы, М. Матукоўскага...

Надзвычай адказна ставячыся да літаратурнай справы, вучоны патрабаваў ад сучаснай яму крытыкі эстэтычнай чуласці, прафесійнасці, сталасці, перасцерагаў калег ад небяспекі ідэалізацыі. В. Каваленка да псіхалагічных драбніц разумеў сутнасць і спецыфіку пісьменніцкай працы. Удумліва перачытаем яго радкі: «Больш насцярожана крытыка павінна ставіцца да тых твораў, дзе паэтызацыя побыту незаўважна ператвараецца ў адбор лёганькіх, мілых, нават смяшлівых экзатычных канфліктаў, дзе дрэнныя старшыні толькі ў мінулым... Чытаеш такія творы і чуеш: яшчэ нясмела, сарамліва, але даволі выразна... пачынае выкукоўваць знаёмую ... песеньку старая літаратурная зязюлька — ідылія. Бясстрасная, бяскрылая апісальнасць параджае раўнадушша да жыцця і сама параджаецца ім. Майстэрства і талент — гэта разуменне. Жыццё заўсёды супраціўляецца пісьменніку, яго пераўтваральнай думцы, супраціўляецца майстэрству, нібы не хочучы адкрывацца ў сваёй глыбіннай плыні, нібы змушаючы пісьменніка задаволіцца толькі тым, што на паверхні. І ў гэтым супрацьборстве або пераможа майстэрства, і тады мастацкі твор адбудзецца, з'явіцца, або пісьменнік здасца перад стыхіяй жыцця, удасца ў апісальнасць і гэта стане паражэннем аўтара, паражэннем літаратуры».

Думкі і выказванні В. Каваленкі не страцілі жывога, заклапочанага сэнсу, непакою за літаратуру, якая ва ўсе часы павінна заставацца мастацтвам, а не мадэрновай падробкай пад яго: «Не шукайце сёння высокага прафесійнага ўмення ў аўтараў і палахлівых і падатлівых, хто не шукае і не адкрывае ісцін чалавечага быцця, а адлюстроўвае адлюстраванае». Віктар Антонавіч пісаў пра літаратуру ў той час, калі чытача цікавіла праблема праўдзівасці адлюстравання жыцця, калі задачы перад літаратурай ставіла грамадства. І літаратура павінна была не проста адпавядаць грамадскім ідэалам, але ісці наперадзе, выконваючы прарочую, купалаўскую місію. Ён пісаў пра творы, якімі зачытваліся многія тысячы чытачоў. Несумненна, што творы Быкава, Шамякіна, Мележа, Караткевіча, Брыля, Макаёнка, Крапівы і інш. мастакоў разам з эстэтычна чулай, заангажаванай духоўна-філасофскімі ідэямі літаратурнай крытыкай А. Адамовіча, В. Каваленкі, М. Мушынскага, А. Яскевіча, У. Калесніка, Дз. Бугаёва, У. Гніламёдава, М. Мішчанчука і інш. прыкметна ўплывалі на фарміраванне грамадзянскіх, духоўных, увогуле светапоглядных арыенціраў беларускага грамадства апошніх дзесяцігоддзяў XX ст., а часта непасрэдна, наўпрост фарміравалі асобу беларускага інтэлігента, гуманітарыя.

Віктар Антонавіч быў з ліку тых творцаў-літаратараў, якія дакладна адчувалі духоўны стан грамадства, яго сённяшняга і нават заўтрашняга дня. Старонкі яго кніг сэнсава-ёмістыя, прысвечаныя разнастайным праявам і заканамернасцям літаратуры. Але, як бачыцца, галоўным клопатам яго было захаванне духоўнасці — у жыцці, у літаратуры, у малых і вялікіх справах людзей. Сваёй важнай грамадзянскай і прафесійнай задачай ён лічыў «асэнсаванне і выглумачэнне духоўнасці, павышэнне ўзроўню маральных ідэалаў, барацьбу з пранікненнем духоўнай непатрабавальнасці ў штодзённы лад людскога жыцця, распазнанне ўсіх відаў і формаў мяшчанскай мімікрыі». Гэтая вялікая, складаная, перспектыўная задача вырашалася Віктарам Антонавічам сумленна, адказна і шчыра. Працягваць гэтую прафесійную, цяжкую і пачэсную справу нам, хто жыве і светла помніць Настаўніка, бо, несумненна, для нас і для будучыні напісаны яго патрабавальныя і адначасова ўзнёслыя радкі:

«Каб спажываць духоўныя багацці, іх трэба мець — ісціна відавочная. Яны выпрацоўваюцца ў штодзённым жыцці народа, выпрацоўваюцца цяжка, праз пераадоленне небяспекі голага практыцызму, грубага матэрыяльнага разліку, жорсткага эгаізму. Духоўнасць у жыцці народа мацнее і ўзбагачаецца не ізалявана, не праз штучнае, аранжарэйнае культываванне. Духоўнасць — гэта не толькі абстрактныя думкі пра высокія паняцці ў жыцці. Гэта само жыццё. Духоўнасць узнікае і творыцца ў душы кожнага чалавека, прылучанага да высокіх мэт...

Задача літаратуры — з пчалінай стараннасцю збіраць «нектар» сапраўднага жыцця — духоўнасць — і вяртаць людзям як найвялікшую «слодыч» чалавечага існавання».

Усё жыццё буду ўдзячна Настаўніку за хлеб на дарогу...

**Зоя МЕЛЬНІКАВА,**
**доктар філалагічных навук,**
**прафесар**

**Сталым вучоным В. Каваленка стаў яшчэ ў 70-я гады, якія сённяшнія ўсезнаўцы называюць застойнымі, ігнаруючы ўсе тагачасныя здабыткі. Можа парадаксальна, але, я пераканана, у беларускім літаратуразнаўстве і крытыцы яны не былі застойнымі. Магчыма, якраз насуперак дзяржаўна-палітычнаму застою ў беларускай філалагічнай навуцы пульсавала атмасфера жывога пошуку — пошуку ісціны, праўды, духоўнасці, будучыні.**

РВУ "Літаратура і Мастацтва" выказвае глыбокае спачуванне кансультанту ўпраўлення друкаваных СМІ і знешніх сувязей Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Шычко Анатолю Уладзіміравічу з прычыны напаткаўшага яго вялікага гора — смерці МАЦІ.

РВУ "Літаратура і Мастацтва" выказвае глыбокае спачуванне загадчыку сектара рэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі і кантролю за выкананнем заканадаўства прававога кіравання Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Гурэцкаму Віктару Антонавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Грамадскае аб'яднанне "Саюз пісьменнікаў Беларусі" выказвае шчырае спачуванне пісьменніку Кукуцю Міледзію Мікалаевічу з прычыны напаткаўшага яго вялікага гора — смерці БАЦЬКІ.

**Пётр СЯЎРУК. Нарадзіўся ў 1905 годзе ў Скідзелі Гродзенскай вобласці. Падчас Першай сусветнай вайны (1915) сям'я падалася ў бежанства і апынулася на шэсць гадоў у гарадку Ліпецк Тамбоўскай вобласці. Там атрымаў пачатковую адукацыю. Восенню 1921 года сям'я вярнулася ў Скідзель, які стаў часткай Заходняй Беларусі. Займаўся сялянскай працай і самаадукацыяй. Летам 1926 года ўзначаліў скідзельскі гурток Таварыства Беларускай Школы. Заснаваў у мястэчку першую беларускую бібліятэку. У красавіку 1927 года стаў на чале Гарадзенскай акруговай управы Таварыства Беларускай Школы. Друкаваўся ў часопісе "Студэнцкая Думка" і ў газеце "Беларускі Дзень". Памёр у кастрычніку 1929 года.**

**Нядаўна асобным выданнем у серыі "Невядомыя старонкі беларускага нацыянальнага руху" выйшла яго літаратурная спадчына — кніга "НЕБЫЦЦЯ НЕ ІСНУЕ" (Гродна-Вроцлаў, 2009, укладанне і каментарый Андрэя Вашкевіча і Сяргея Токця, 240 старонак з фотаілюстрацыямі).**

*Не можа нацыя сысці,*
*Нібы вада ў пясок, —*
*Павінна след пакінуць ці*
*Хоць там які слядок.*

**Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК**

Які жаль ахоплівае ўсю маю істоту, калі я пачынаю глыбока ўсведамляць магчымую значнасць такіх рана адышоўшых з жыцця найталенавіцейшых творчых асоб нацыянальнага адраджэння, як С. Палуян, М. Багдановіч, П. Трус, П. Сяўрук і тых, каго трохі пазней звялі са свету сталінскія апрычнікі... Ды і сёння чамусьці самае таленавітае, самаснае і адметнае сыходзіць на самым зачыне сталага творчага жыцця: В. Гадулька, А. Пісьмянкоў, А. Асташонак, А. Сыс...

Першы раз я даведаўся пра Пятра Сеўрука з палымянскай публікацыі яго вершаў, зробленай Янкам Брылём у сярэдзіне 80-х. Нават паспеў добрым словам адгукнуцца пра гэтую неардынарную з'яву на старонках "ЛіМа". Але чамусьці да выхаду ў свет гэтай кнігі шырокай агалоскай, не кажучы ўжо пра вывучэнне і вытлумачэнне творчасці і грамадска-палітычных поглядаў Пятра Сеўрука, ніхто асабліва не пераймаўся.

Голас падаўся, ды рэха не разышлося... Для беларусаў такое звыкла. Кожны найперш думае пра сябе і сваіх блізкіх. Агульнай грамадскай справай тутэйшыя людзі заўжды займаліся толькі мусова, па загадзе зверху. "Мая хата з краю, нічога не знаю" — чыста беларуская послаўка. Ментальнае кляймо.

І ўсё ж дзякуючы любові і спагадлівасці сясцёр, братоў і пляменніка Пятра Сеўрука яго імя, а галоўнае яго літаратурная спадчына, захаваліся і нарэшце шырока выйшлі ў свет, да тых людзей, доляй якіх ён турбаваўся ўсё сваё кароткае жыццё. Пісаў, што праца яго па сутнасці творчая і "гэта праца над развіццём беларускага народа; свядомую энергію дае паняцце таго, што мы не можам ганьбаваць ніякаю моваю і ніякім народам, як бы ён не быў малы ці не культурны. (...) Гэтым шляхам ідуць тыя, што працівяцца беларускаму культурнаму развіццю, але беларуская культура пачынае ламаць гэтыя дзікунскія бар'еры і здзяйсняе думку тых, хто 20 гадоў назад далі яму ўсведамленне свайго прыроднага права і абавязку".

Чытаючы напісанае П. Сеўруком, адчуваеш, што гэта вельмі шчырая, простанародная, даходлівая споведзь чалавечай душы, якая прыцягвае і хвалюе сваёй, можна сказаць, непрыхаванай наіўнасцю, а часам і сентыментальнасцю. Вядома, стыль пісьма іншым разам патрабуе большай адмысловасці, але чытаючы сучасных палітолагаў, разяўляючы рот ад іхняга досведу і псеўдавучонасці (яны пішуць для свайго вузкага кола, у якім таўкуцца, як камары, і з аглядкай на сітуацыю таўкуць мак "эўрапейскай", мала каму цікавай, думкі), адразу ўзгадваеш ясныя разважанні Пятра Сеўрука, выбудаваныя на веданні і цвёрдых асновах народнага жыцця...

І сёння маюць нейкую прыязную душэўную ўспрымальнасць яго высновы і пасылы адносна першапрычыны нацыянальнай самабытнасці народа (артыкул "Мова і нацыя"), ну, вось хоць бы гэты фрагмент: "Дык той, хто борацца за вызваленне і права задушанай і выгнанае мовы — робіць вельмі добрую рэч. Калі чалавек адракаецца ад свае нацыі, ад свае мовы, дык ён утраціць чыстату свае споведзі і загубіць сваю душу. Ягоная гутарка не будзе адбіваць ягонае душы, гэткім чынам усё чалавечае — гэта значыць чыстата душы магчымая пры споведзі — ў ім загіне. У наш час, каб чалавек быў чалавекам, ён павінен зберагчы асаблівасці сваёй нацыі, гэта значыць асаблівасці свае мовы". Праўда, у гэтым жа артыкуле ёсць і дзіўныя, больш чым спрэчныя разважанні аўтара пра нацыянальны патрыятызм. Аднак, зважаючы на яго маладосць і адносны інтэлектуальны досвед, яны выбачальныя і маюць права на жыццё як палемічныя па сваёй сутнасці для таго часу. Ва ўступе да кніжкі П. Сеўрука прафесар Варшаўскага універсітэта Е. Тамашэўскі мяркуе, што сучасны "сацыёлаг крытычна паставіцца да яго канцэпцыі народа і роднай мовы, аднак яна вартая ўвагі як сведчанне перадумоваў, на якіх пачаткова будавалася ідэя беларускай нацыянальнай свядомасці".

Але чытаючы спадчыну П. Сеўрука, і тым самым як бы ідучы шляхам яго жыцця, не без здзіўлення адкрываеш для сябе поўную маладой духоўнай прагі натуру — да кніг, да ведаў і да агульнасусветнай культуры. Будучы адарваным ад Айчыны ў малалецтве, страціўшы духоўную повязь з Беларушчынай, ён тым не менш намагаецца пашырыць свой досвед і піша ў сваім "дзённіку", што па вяртанні ў Скідзель плануе набыць: "Библию, Веды, Ксенофонта, Платона. Аристотеля, Марка Аврелия, Спинозу, Яна Гуса. Петра Хельчицкого, Паскаля, Ламенэ, Конфуция, Лао-Тзе (Лао-Цзы — **ЛеГАЛ**). (...) В последнее время, начиная с нового года, я прочитал около 70 книг, отчего у меня болят глаза; и это может скончиться слепотой". Пералік аўтараў уражвае, зважаючы на тое, што гэта піша правінцыйны юнак сялянскага паходжання, які мае ўсяго толькі пачатковую адукацыю. Цікавы факт, што П. Сяўрук вёў свой "дзённік" па-руску. Нават ужо тады, як вярнуўся на Радзіму і пачаў актыўна змагацца за ўжытак і развіццё роднай мовы, стварыўшы ў Скідзелі беларускую бібліятэку і ўзначаліўшы Таварыства Беларускай Школы. Лістуючыся з такімі вядомымі постацямі, як Антон Луцкевіч, Ігнат Дварчанін, Зоська Верас, ён, між іншым, не быў цэльным і адназначным у сваіх стаўленнях тых ці іншых балючых пытанняў нацыянальнага адраджэння. Вось што ён пісаў Антону Луцкевічу: "Калі пажадаеце надашлю вам свае творы ў расейскіх арыгіналах, бо па беларуску я пішу слаба. Пераклаў гэты артыкульчык з дапамогай маскоўска-беларускага слоўніка. Калі гэты пераклад добры, дык магу пералажыць і вышайупомяненыя творы. Каб навучыцца па беларуску мушу мець іншыя падручнікі, а каб купіць іх не маю грошы" (...) "Я ўсё пішу па расейску, бо лепш уладаю гэтай мовай і ў ёй большае багацце словаў. Гэтак напр. у нашай, так сама даволі багатай мове німа адпаведнага дзеля расейскага благо. Ды і наагул я добра ня уладаю беларусай мовай". Але тут жа мы можам прачытаць і тое, што дае нам ключ да разгадкі яго глыбока чалавечай натуры: "Перш-наперш свядомы чалавек ведае, што ён чалавек, значыцца, кожны чалавек, як чалавек, можа памыляцца, і дзеля таго, каб не памыліцца, ён павінен заўсягды імкнуцца да ведаў, гэта значыць, павінен мець рухлівы розум; і такі чалавек ніколі не скажа сабе, што я ведаю ўсё, бо я нічога не хачу ведаць апрача таго, што ведаю".

Чытаючы некаторыя пасажы П. Сеўрука, не можаш адкаснуцца ад думкі, што гэта ён піша пра сучаснага беларускага чалавека. Можна сказаць, што сам Сяўрук і восемдзесят гадоў таму быў чалавекам роўным у сваім інтэлектуальным развіцці цяперашнім беларусам у іх асноўнай масе. Хіба не так разважаюць многія нашы інтэлігенты, як разважаў Сяўрук у сваім артыкуле "Аб мове, народзе і друку ў роднай мове": "Дык калі паміж народу беларускага знойдуцца геніі сусветнай велічыні, як Гогаль, Дастаеўскі, Чэхаў і гэтак далей, тады з беларускаю моваю будуць лічыцца ўсе культурныя народы, як цяпер лічацца з рускаю. А сто гадоў назад руская мова была тое самае, што цяпер беларуская. Толькі геніі літаратуры звяваралі ёй месца ўвагі ў сусветнай культуры". Хоць тут зноў жа закрадваецца спрэчная думка. Варта толькі ўзгадаць выдатныя сусветныя дасягненні ірландскай літаратуры (у прыватнасці яе Нобелеўскіх лаўрэатаў), што праўда не заўсёды створаныя на іх роднай мове. Праўда, пішучы "Аб беларускай літаратуры", ён зазначае, што "мы не павінны глядзець на шырыню друкаванага слова, але на ягоныя вартасці. Што ў беларускай літаратуры ёсць творы, вартыя ўвагі, якія маюць у сабе сапраўднае мастацтва, дык гэта хіба бясспрэчны факт, і калі б нават іх не было, дык усё ж такі гэта не даказала б, што іх не можа быць", бо "... калі нехта кажа, што беларуская мова не мае ніякіх даных для таго, каб быць шырока ўжываній у літаратуры, той павінен перш даказаць, што беларускае жыццё не мае права ці не мае даных для таго, каб захапіць увагу мастакоў-пісьменнікаў".

Талстовец-"непрацівленец" па натуры і апалітычны па вызначэнні пастаўленых перад сабой задач, П. Сяўрук дзесьці ў глыбіні душы разумее, што апынаецца ў безвыходным "вавёрчыным коле" спрадвечнага беларускага выраку. Таму нярэдка сам сабе пярэчыць ці наступае на адны і тыя ж граблі, і паўстае перад непамысным: "Вот вдруг опять какая-либо чепуха... репрессии... придут, обыщут, арестуют... и за что. За легальную белорусскую газету, которую я читаю почти что один... один читаю по своему пониманию, а в политику не касаюсь. Зачем политиковать? Уже сколько раз убеждался в бесполезности и зловредности политики". З-за сваёй скіраванай апалітычнасці П. Сеўруку не раз даводзілася пакутаваць і нават мець варожае стаўленне былых таварышаў і калегаў, асабліва пасля публікацыі ў паланафільскай газеце "Беларускі Дзень" артыкула "Аб беларускай прэсе". Рэч там ішла пра ігнараванне асветы і культуры на фоне вульгарнага палітыканства. Вось блізкі нашаму часу фрагмент з таго артыкула: "Палітычныя кіраўнікі маюць на мэце апраўдаць і замацаваць свае палітычныя лініі, дзеля чаго, не шкадуючы слоў, як мага імкнуцца збіць з цвёрдага пункту свайго праціўніка, ці канкурэнта. Кожны хоча быць правадыром народу, кожны хоча адзін прадстаўляць народную опію, а між тым больш або менш знаходзяцца прыхільнікі розных напрамкаў... (...) ...трэба аб'яднаць розныя кірункі, калі яны ёсць. А дзеля гэтага не трэба шукаць лаянкі на праціўніка, не трэба рабіць падкопаў і нападаў, але трэба шукаць паразумення і згоды, у кожным разе трэба мець прыстойнасць да праўдзівых перакананняў". Ваганні і сумненні не пакідалі П. Сеўрука. Ён памыляўся і вучыўся на сваіх і чужых памылках, думаў і разважаў над сутнасцю тых грамадскіх, палітычных і літаратурна-мастацкіх з'яў, што адбываліся ў беларускім грамадстве. Палітычная барацьба нашых цяперашніх эліт адзін да аднаго нагадвае тагачасную заходнебеларускую. Вось дзённікавы запіс за 13 снежня 1928 года: "Всё более и более удручает распространение в народе политического невежества и всё более понятными становятся мерзкие методы политических спекулянтов, пользующихся народной темнотою. Читаешь в газетах о том, как "сознательные народные массы" понимают, где их искренние покровители, а где "предатели"... (...) Где есть ложь, там не место быть правде; где насилие, там нет справедливости. О, бедный белорусский народ! Слепые вожди ведут тебя на борьбу за твои права таким образом, что ты теряешь всякое понятие о своих правах; и они говорят тебе, что ты знаешь своих покровителей!".

І ўсё ж, ухіляючыся палітычнай барацьбы, ён не мог даастатку пазбегнуць "крымінальнага" характару сваёй апалітычнасці, бо нават не змагаючыся за ўладу (ці супраць яе), а толькі за адраджэнне і развіццё беларускай мовы, асветы і культуры свайго народа, падпадаў да няўтодных і "неблагонадёжных", таму што замахваўся на ідэалагічны падрыў улады той дзяржавы (у дадзеным выпадку Польшчы), пад гнётам якой апынуўся яго духоўна паняволены народ.

Пакідаючы па-за крытычнай увагай вершы і прозу П. Сеўрука, я тым самым надаю неацэнную (і пакуль не дацэненую) значнасць яго адраджэнскай і асветніцкай дзейнасці. Памёр ён вельмі маладым, у 24 гады ад невылечных тады сухотаў. Не хапіла дыху, каб выказаць усяго сябе даастатку.

"Па ўспамінах нешматлікіх цяпер сведкаў, пахаванне П. Сеўрука вылілася ў самую шматлюдную за ўсю гісторыю Скідзеля дэманстрацыю. Мясцовы бацюшка, які ў свой час быў удзельнікам вайсковых фарміраванняў Станіслава Булак-Балаховіча і па-ранейшаму заставаўся прыхільнікам генерала (а апошні ніколі не хаваў свайго варожага стаўлення да камуністычнага руху), крычаў, каб паліцыя ахоўвала яго, бо на пахаванне ў Скідзелі сабралася агромністая колькасць «камуністаў»..."

Ускосна страх бацюшкі абгрунтоўваюць у сваіх каментарыях да спадчыны Пятра Сеўрука і ўкладальнікі кнігі А. Вашкевіч і С. Токць, зазначаючы, што "як паказала гісторыя, рамантык-талстовец са Скідзеля прадбачыў разгортванне падзей лепш, чым тыя людзі, якіх у канцы дваццатых з поўным правам можна было назваць правадырамі беларускага руху".

**ЛеГАЛ**

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

*Рэдакцыйная калегія:*
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

*Адрас рэдакцыі:*
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

*Тэлефоны:*
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

*Аддзелы:*
публіцыстыкі — 284-66-71
крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

*Выдавец:*
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова
"Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3117
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 12.08.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 7
Заказ — 4311

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686